ГРОДЗЕНСКАЕ АБЛАСНОЕ
ГРАМАДСКАЕ АБ'ЯДНАННЕ МАЛАДЫХ НАВУКОЎЦАЎ
"ВІТ"

# ПРАВА
# НА КОЖНЫ ДЗЕНЬ

# ПРАВА
# НА КОЖНЫ ДЗЕНЬ

## МЕТАДЫЧНЫ ДАПАМОЖНІК

## ЧАСТКА ПЕРШАЯ

**Мінск, 2005**


*©Грамадскае аб'яднанне «ВІТ»*

**УДК 341.9**
**ББК 67.620 (4Б)**
**П 90**

**П 90** "Права на кожны дзень": Метадычны дапаможнік/ Н. Клімчук, І. Кузьмініч, С. Салей і інш. - Мінск, 2005. - 102 с.

**УДК 341.9**
**ББК 67.620 (4Б)**

© Гродзенскае абласное грамадскае
аб'яднанне маладых навуокўцаў "ВІТ", 2002-2005

# ЗМЕСТ

**УВОДНЫ ЗАНЯТАК** ............ 5
**ПРАВІЛЫ** ............ 13
**САЦЫЯЛЬНЫЯ НОРМЫ** ............ 19
**ПРАВАВЫЯ І НЕПРАВАВЫЯ ЗАКОНЫ** ............ 30
**ЯК СТВАРАЮЦЦА ЗАКОНЫ** ............ 39
**ЯК ВЫКОНВАЕЦЦА ЗАКОН. АБСКАРДЖАННЕ ДЗЕЯННЯЎ СЛУЖБОВЫХ АСОБАЎ.** ............ 45
**ЯК МОЖНА ПАЎПЛЫВАЦЬ НА ЗМЕНУ ЗАКОНА** ............ 50
**ЗВАРОТ ДА ЮРЫСТА** ............ 56
**СУДОВАЯ АБАРОНА** ............ 64
**ВЫРАШЭННЕ КАНФЛІКТАЎ** ............ 69
**МЕТАДЫ АКТЫЎНАГА НАВУЧАННЯ** ............ 74
Шпацыр у думках ............ 75
Думаць, працаваць у парах, абменьвацца меркаваннямі. ............ 77
Кожны вучыць кожнага – толькі факты ............ 78
Займі пазіцыю ............ 79
ПРЭС (PRES) ............ 81
Мазгавы штурм ............ 83
Праца з невялікімі групамі ............ 85
Раунд Робін ............ 88
Аналіз казусаў ............ 89
Мазаіка (Ажурная піла) ............ 92
Разыгранне роляў і мадэляванне сітуацый ............ 94
Спрошчанае Судовае разбіральніцтва (Суд pro se) ............ 96


*©Грамадскае аб'яднанне «ВІТ»*

## УВОДНЫ ЗАНЯТАК

*Дадзены занятак складаецца з 2-х частак. Першая частка – уводзіны ў паняцце правілы, другая частка – даследванне правілаў.*

**Мэта занятка:** Вызначыць сутнасць і ролю правілаў у грамадстве. Вызначыць крытэрыі добрага правіла.

***У выніку занятка вучні:***

*Веды:*
- назавуць, што такое правілы, якія віды правілаў існуюць і для чаго існуюць сацыяльныя нормы-правілы, у якой форме існуюць правілы (пісьмовай і вуснай);
- азнаёмяцца і прааналізуюць правілы паводзінаў вучня;
- вызначаць, хто ўсталёўвае сацыяльныя нормы-правілы;
- пералічаць крытэрыі добрага правіла, прычыны існавання дасканалых і недасканалых правілаў.

*Навыкі:*
- азнаёмяцца з падручнікам для вучня;
- будуць працаваць ў групе;
- будуць дыскутаваць і адстойваць сваю пазіцыю;
- правядуць даследванні правілаў.

*Каштоўнасці:*
- усвядомяць, што асноўнай мэтай сацыяльных нормаў, як усталяваных чалавекам правілаў, з'яўляецца абарона яго інтарэсаў.

**Асноўныя азначэнні:**

**Сацыяльнае правіла** – гэта норма паводзінаў, усталяваная людзьмі для таго, каб стварыць умовы для жыцця разам у супольнасці.

**Крытэрыі добрага правіла** – мінімальныя патрабаванні да правіла з боку ўдзельнікаў гульні ці грамадства, без захавання кожнага з якіх немагчыма спадзявацца на дабраахвотнае падпарадкаванне яму актыўнай часткі грамадства.


©Грамадскае аб'яднанне «ВІТ»

**Інтэрактыўныя метады:** "гульня без правіл", абмеркаванне, праца ў групах, даследванне.

**Матэрыялы:**
1. Ватман/дошка з тэмай занятку, мэтай і чакаемымі вынікамі
2. 3-4 аркушы ватмана ці дошка
2. 3-4 маркеры рознага колеру ці крэйда
3. Правілы паводзінаў вучняў у школе (м.б. вытрамкі са Статута школы, ці з закона)

**Час правядзення:** 45':

**План занятка:**
1. Прадстаўленне тэмы і чакаемых вынікаў занятка – 1'
2. Гульня "Адлюстраванне" – 3'
3. Падсумаванне гульні "Адлюстраванне" – 5'
4. Правядзенне аналогіі паміж правіламі гульні і правіламі ў грамадстве – 3'
5. Падзел на групы – 3'
6. Знаёмства групаў з правіламі для вучняў – 5'
7. Выбар групамі аднаго, на іх погляд найбольш важнага правіла (для кожнай групы свайго) – 3'
8. Вытлумачэнне агульных падыходаў да паняцця навуковае даследванне, сацыялагічнае даследванне) – 7'
9. Праца групаў над планам даследванняў і размеркаваннем абавязкаў – 10'
10. Падсумаванне занятка – 4'
11. Хатняе заданне – 1'

**Методыка правядзення:**

1. На пачатку настаўнік знаёміць вучняў з тэмай і чакаемымі вынікамі занятка. Гэта дазволіць не толькі вучням скласці уяўленне аб тым, што будзе адбывацца на занятку і якіх вынікаў плануецца дасягнуць на ім, але таксама і настаўніку дасць магчымасць яшчэ раз прагаварыць для сябе, якія задачы ён збіраецца вырашыць гэтым заняткам. Акрамя гэтага мэты, вядомыя і зразумелыя для ўсіх дазволяць карэктаваць ход занятка і не адхіляцца ад тэмы. Калі на прыканцы занятка праводзіцца падсумаванне


©Грамадскае аб'яднанне «ВІТ»

таксама варта звярнуцца да аб'яўленых чакаемых вынікаў і праверыць ці ўсе мэты, якія ставіліся на пачатку занятка былі дасягнуты. Шлях прадстаўлення тэмы і мэтаў, залежыць ад настаўніка, але варта зрабіць гэта сцісла. Добра калі назва, мэта занятка, а таксама чакаемыя вынікі будуць запісаныя на ватмане, ці дошцы і будуць захаваны да канца занятка для правядзення падсумавання.

Азнаёміць вучняў з мэтамі і чакаемымі вынікамі гэтага занятку можна альбо перад гульнёй "Адлюстраванне", альбо пасля падсумавання вынікаў гульні. Гэта залежыць ад таго, якім чынам настаўнік хоча пабудаваць занятак.

2. Правядзенне гульні "Адлюстраванне". Дадзеная гульня праводзіцца для таго каб вучні атрымалі адмоўны досвед удзелу ў гульні з "дрэннымі" ("недасканалымі") правіламі і на падставе атрыманага адмоўнага досведу здолелі вывесці асноўныя крытэрыі "добрых" правілаў, адначасова яна можа разглядацца як факусіроўка на тэме занятка.

А) Настаўнік можа аб'явіць вучням, што занятак па курсу "Права на конжы дзень" пачнецца з гульні ў "Адлюстраванне". Запытайце, ці гралі вучні калі-небудзь у гэтую гульню. Паколькі такой гульні не існуе – то ніхто ніколі ў яе і не гуляў.

Б) Не трэба тлумачць правілаў гульні., што кожны шэраг вучняў (якія сядзяць адзін за адным ад першай да апошняй парты) складаюць асобную каманду.

В) Настаўнік аб'яўляе, што гульня пачалася. Натуральна, не атрымаўшы аніякіх інструкцыяў, збянтэжаныя ўдзельнікі будуць сядзець і глядзець на настаўніка. Пры гэтым раз-пораз могуць гучаць просьбы патлумачыць сэнс і правілы гульні. Настаўнік пакідае гэтыя просьбы без увагі. Можна з дэманстратыўным здзіўленнем спытаць: *"Няўжо вы не ведаеце, як гуляць у Адлюстраванне?! Не можа быць!"* Не трэба зважаць на пачатку і на магчымую незадаволеннасць удзельнікаў гульні. Пасля паўзы, якая не павінна зацягвацца настаўнік пачынае з кароткімі перапнкамі даваць безсістэмныя інструкцыі, якія ўдзельнікі павінны будуць дакладна выконваць. Напрыклад:

- папрасіце вучняў падняць руку;
- скажыце, што трэба было ўсім падняць левую руку;


©Грамадскае аб'яднанне «ВІТ»

- не апускаючы руку, папрасіце вучняў устаць;
- затым узяць у правую руку асадку,
- зрабіце выгляд, што вы перадумалі і папрасіце ўзяць асадку ў левую, паднятую руку;
- затым павярнуцца на права, зрабіце выгляд, што вы ізноў перадумалі і папрасіце павярнуцца налева;
- спыніце гульню і дыскваліфікуйце і адхіліце ад далейшага ўдзелу ў гульні адну з камандаў па нейкай адвольнай прыкмеце. Напрыклад: у адной з камандаў больш (альбо менш), чым у іншых, удзельнікаў, альбо больш ці меньш за астатнія каманды хлопчыкаў ці дзяўчынак;
- усіх астатніх папрасіце падняць левую нагу і нахіліцца;
- пасля гэтага падзякуйце ўсіх і адвольна назавіце каманду, якая перамагла. Не тлумачце прычынаў вызначэння пераможцы.

Гульню пажадана праводзіць у хуткім тэмпе, каб не даць зарыетавацца вучням і выклікаць як мага больш негатыўных эмоцыяў і незадаволеннасць вынікамі гульні.

Г) Вельмі верагодная незадаволенасць удзельнікаў гульні яе зместам і вынікам становіцца падставай для далейшага абмяркавання, якое пачынаецца адразу пасля таго, як скончыцца гульня.

3. А) Падчас падсумавання гульні варта задаць наступныя пытанні:

- Як вы сябе адчувалі? Што адбылося ці што здарылася?
- Што вам не спадабалася падчас гульні?
- Ці зразумелі вы сэнс гульні? Чаму?
- Ці была гэтая гульня справядлівай? Патлумачце свой адказ.
- Чаму дадзеная гульня здалася Вам несправядлівай?
- Што трэба змяніць для таго, каб гэтая гульня прайшла паспяхова?

Б) Сярод магчымых адказаў, якія настаўнік ці адзін з вучняў запісваюць за навучэнцамі на ватмане ці дошцы, варта засяродзіць ўвагу на наступных:
а) Для таго, каб адбылася гульня, павінны існаваць правілы;
б) Гэтыя правілы павінны быць вядомымі ўсім удзельнікам гульні;
в) Правілы павінны быць зразумелымі і дакладнымі;
г) Правілы не павінны змяняцца падчас гульні;
д) Для ўсіх удзельнікаў павінны існаваць аднолькавыя ўмовы;
е) Не павінна быць дыскрымінацыі ўдзельнікаў па нейкіх асобных прыкметах. Калі вучні не назвалі ўсе прызнакі добрага правіла, адной з


*©Грамадскае аб'яднанне «ВІТ»*

магчымасцяў з'яўляецца выйсці на гэтыя высновы праз наводзячыя пытанні, альбо папрасіць вучняў адкрыць падручнікі і прачытаць у Главе 1 "Крытэрыі добрага правіла". Важна, каб вучні да пачатку стварэння правілаў, добра засвоілі правілы ці прызнакі "добрага" правіла. Крытэрыі добрага правіла так ці іначай будуць разыходзіцца з вынікамі апытання – бо гульня выводзіць вучняў на вызначэнне не ўсіх прызнакаў добрага правіла, а толькі асноўных.

4. А) Правядзяцца аналогіі паміж правіламі гульні і правіламі-законамі грамадства. Настаўнік, можа звярнуць увагу ўдзельнікаў на тое, што з узнікненнем любога калектыву, яго члены вымушаны гуляць у нейкія "гульні". Тут варта прывесці прыклад з жыцця, блізкі для вучняў і дастатковы для таго, каб правесці аналогіі паміж гульнёй і прыведзенай вамі сітуацыяй, напрыклад: а)палітыкі "гуляюць" у палітыку, б) школьнікі і настаўнікі - у школу і г.д. Кожная з гэтых "гульняў" мае свае правілы. Дзеля прыкладу можна папрасіць вучняў назваць правілы "гульні" у краме. Удзельнікі могуць назваць наступныя варыянты адказаў: а) пакупнік павінен плаціць за пакупку; б) прадавец абавязаны вяртаць рэшту; в) у краме трэба станавіцца ў чаргу; г) пакупнік можа набываць любы тавар, які ёсць ў краме; д) пакупнік можа вярнуць назад няякасны тавар і г.д. Настаўнік можа падкрэсліць, што пералік гэтых правілаў можна працягваць і далей, але самае галоўнае - выразна ўсвядоміць, што правілы існуюць незалежна ад нашага жадання. Мы можам альбо прытрымлівацца іх, альбо парушаць іх і несці за гэта пэўную адказнасць, альбо спрабаваць змяніць існыя правілы да лепшага.

Б) Настаўнік можа задаць наступныя пытанні: 1) Які сэнс "гульні" паміж прадаўцом і пакупніком? 2) Хто выігрывае і пры якіх умовах? (Калі не парушаюцца правілы – выігрываюць абодва. Мэта гульні – прадаўцу прадаць як мага больш тавараў, а пакупніку купіць самы лепшы тавар, які яму неабходны). 3) Для чаго ў такім выпадку правілы? З аднаго боку, каб абараніць прадаўца ці даць яму гарантыі, што ніхто не забярэ яго тавар, не заплаціўшы вызначаную цэну (абрабуе), ці папсуе тавар, а з другога, пакупніку – гарантыі, што ніхто без яго жадання не прымусіць яго купіць нешта, што яму не падабаецца, а якасць тавара, які ён набудзе будзе высокай, а калі тавар раптам акажацца няякасным – мець гарантыі абмяняць яго, адрамантаваць ці вярнуць свае грошы.


©Грамадскае аб'яднанне «ВІТ»

5. Падзел на групы лепей зрабіць да занятку згодна са спісам класа. Гэта сэканоміць нам час на падзел і зробіць групы больш-меньш аднолькавыя ў інтэлектуальным плане. Колькасць групаў не мае значэння, галоўнае каб яны былі па-магчымасці роўныя ў інтэлектуальным плане і па колькасці ўдзельнікаў. Аптымальная колькасць удзельнікаў адной групы – пяць чалавек. Можна зачытаць спісы групаў адзначыўшы іх нумарамі, ці нейкімі назвамі і пакажыце, за якімі партамі ў класе ці ў якіх месцах класа павінны яны сабрацца для далейшай працы.

6. настаўнік тлумачыць, што зараз вучні атрымаюць правілы паводзінаў у школе. Узяць гэтыя правілы можна з унутраных дакумантаў школы (Статут, правілы ўнутранага распарадку, дамовы з бацькамі на навучання і інш.). За 8 хвілін. Вучні павінны будуць:
- прачытаць правілы;
- абмеркаваць і выбраць на думку групы адно найбольш важнае правіла.

7. Даецца час на абмеркаванне ў групах і вызначэнне правіла. Трэба праканраляваць, каб за апошнія 3 хвіліны групы выбралі па аднаму правілу. Пажадана, каб групы абралі розныя правілы.

8. Дадзеную частку занятка варта пачаць з аб'яўлення пра тое, што цяпер групы будуць "даследваць" абраныя імі правілы, ці іншымі словамі, займацца даследваннямі ў галіне грамадствазнаўства. Настаўнік можа задаць наступныя пытанні:
А) Ці займаўся хто-небудзь з вас даследваннямі? Што такое даследванне? (*Даследванне – гэта вывучэнне пэўнага пытання ці праблемы з загадзя вызначанай мэтай і згодна распрацаванага плана*). Прывядзіце прыклады тэмаў сваіх даследванняў.
Б) Адкуль вы бралі інфармацыю для даследванняў?
В) Што такое сацыялагічнае апытанне? (*Сацыялагічнае апытанне – гэта апытанне ясна акрэсленай мэтавай групы грамаждства для высвятлення пэўных грамадска значных пытанняў ці вывучэння працэсаў, якія адбываюцца ў грамадстве. Праводзіцца спецыяльнымі ўстановані на падставе дакладна распрацаваных методык апытання*) Як яно праводзіцца і для чаго?
Г) На падставе чаго абгрунтоўваюцца зробленыя вывады?
Мэта дадзенай часткі прывесці вучняў да разумення а) што такое даследванне; б) дзе яны могуць знайсці матэрыял для даследвання (падручнікі, газеты, звесткі сведкаў, сацыялагічныя апытанні і г.д.); в) ўсе


*©Грамадскае аб'яднанне «ВІТ»*

высновы павінны грунтавацца на фактах і падцвярджацца фактамі. Вынікі. як правіла могуць афармляцца ў выглядзе табліцаў, графікаў і інш.

Д) Даецца заданне вучням, што яны ў сваіх групах, на працягу 10 хвілінаў павінны будуць:

- прачытаць хатняе заданне. Групы павінны будуць правесці даследванне і зрабіць аналіз абраных правілаў згодна з хатнім заданнем;
- распрацаваць план даследвання;
- вызначыць заданне для кожнага ўдзельніка ў групе па даследванню правіла;
- пазней, на перапынку і ў хаце сярод вучняў, бацькоў, настаўнікаў, знаёмых з выкарыстаннем літаратуры, часопісаў і г.д. правесці даследванне;
- на наступным занятку вучні павінны будуць аформіць свае даследванні і прадставіць вынікі працы класу.

Першыя тры пункты – заданне, якое вучні павінны выканаць на гэтым занятку. Астатнія 2 – гэта хатняе заданне, падрыхтоўка да наступнага занятку. Настаўнік будзе з'яўляцца экспертам і групы могуць у любы момант звяртацца да Вас па пытаннях даследвання.
Трэба ўдакладніць, ці ўсё зразумела вучням і ці не маюць яны пытанняў.

9. Падчас працы групаў над планам даследванняў і размеркаваннем абавязкаў настаўнік пастаянна наведвае групы і кантралюе, на якой стадыі працы яны знаходзяцца і ці не патрабуюць дапамогі. Калі час на працу ў групах скончыцца, неабходна нагадайць вучням яшчэ раз заданне, якое яны павінны будуць выканаць да наступнага занятку. І толькі пасля гэтага пераходзіць да падсумавання занятку.

10. А) Настаўніку падчас падсумавання варта засяродзіцца на наступных пытаннях:
а) што новага даведаліся вучні за дадзены занятак?
б) што ці хто прымушае выконваць выбраныя правілы?
в) хто кантралюе выкананне гэтых правілаў?
г) што рабіць, калі гэтыя правілы парушаюцца? Ці прадугледжаны нейкія пакаранні і якія яны?
д) што трэба будзе зрабіць калі тое ці іншае правіла будзе незадавальняць каго-небудзь?


©Грамадскае аб'яднанне «ВІТ»

Б) Настаўнік дадткова можа задаць наступныя пытанні:
а) чаму, для чаго патрэбныя правілы?
б) ці дастаткова правілаў для таго каб жыць супольна ў міры і згодзе? Што для гэтага трэба? Як гэтаму дапамагаюць правілы? Прывядзіце прыклады. Дайце вучням магчымасць свабодна выказваць сваю думку. Не каментуйце іх словы.

11. Хатняе заданне: прачытаць главу падручніка **Правілы** і пісьмова выканаць заданні пасля главы.


*©Грамадскае аб'яднанне «ВІТ»*

## ПРАВІЛЫ

**Мэта занятка**: Разгледзець паняцце і сутнасць правілаў, прычыны іх існавання і значэнне, прычыны падпарадкавання правілам і механізм аналізу правіла.

***У выніку занятка вучні:***

*Веды:*

- назавуць, што такое правілы, якія віды правілаў існуюць і для чаго існуюць сацыяльныя нормы-правілы, у якой форме існуюць правілы (пісьмовай і вуснай);
- азнаёмяцца і прааналізуюць правілы паводзінаў вучня;
- вызначаць, хто ўсталёўвае сацыяльныя нормы-правілы;
- пералічаць крытэрыі добрага правіла, прычыны існавання дасканалых і недасканалых правілаў;
- выпрабуюць прыкладны механізм аналізу правіла, асноўныя прынцыпы навуковых даследванняў.

*Навыкі:*

- прааналізуюць і параўнаюць правілы з дапамогай механізму аналіза правіла;
- азнаёмяцца з падручнікам для вучня;
- будуць працаваць ў групе;
- будуць дыскутаваць і адстойваць сваю пазіцыю;
- правядуць даследванні правілаў.

*Каштоўнасці:*

- усвядомяць сацыяльныя нормы, як усталяваныя чалавекам правілы, асноўнай мэтай якіх з'яўляецца абарона яго інтарэсаў.

**Асноўныя азначэнні:**

| |
|---|
| **Механізм аналізу правіла** – алгарытм пытанняў і патрабаванняў, (вымаганняў) якія выстаўляюцца да правіла, нормы, закона і дазваляюць спрацаваць яго аналіз, чым ствараюцца ўмовы для прыняцця рашэння, як паступаць з дадзеным правілам. Пры дапамозе дадзенага механізма значна прасцей знайсці аргуманты за і супраць існавання таго ці іншага правіла. |


©Грамадскае аб'яднанне «ВІТ»

**Інтэрактыўныя метады:** даследванне, праца ў групах, абмеркаванне.

**Матэрыялы**:
1. Ватман/дошка з тэмай занятку, мэтай і чакаемымі вынікамі
2. 3-4 аркушы ватмана (па колькасці групаў) ці дошка
3. Маркеры па колькасці групаў (па 5 чалавек у кожнай)
4. Падручнікі для вучняў

**Час правядзення**: 45′:

**План занятка**:
1. Вытлумачэнне тэмы занятка і чакаемых вынікаў – 1′
2. Факусіроўка ці засяроджанне ўвагі вучняў на тэме праз вызначэнне асноўных паняццяў правіла – 2′
3. Размеркаванне па групах – 1′
4. Праца ў групах над афармленнем вынікаў навуковых даследванняў – 8′
5. Прэзентацыя працы групаў – 18′ (5 груп x 3′ на прэзент x 3′падрыхтоўка да выступу)
6. Агульная дыскусія па выніках прэзентацый і даследванняў – 12′
7. Падсумаванне занятка – 2′
8. Хатняе заданне – 1′

**Методыка правядзення**

1. На пачатку настаўнік знаёміць вучняў з тэмай і чакаемымі вынікамі занятка.

2. А)Падчас правядзення дадзенага занятка, настаўніку не варта засяроджваць сваю ўвагу на нейкіх "асаблівых" факусіроўках. Само апытанне вучняў пры дапамозе мазгавога штурма адначасова будзе з'яўляцца 1) факусіроўкай на тэме занятка; 2) праверкай выканання вучнямі хатняга задання (прачытання тэксту для вучняў па дадзенай тэме) і іх падрыхтаванасці да дадзенага знятку; 3) укладам настаўніка. Дадзеная частка неабходна не толькі для таго каб вызначыць ступень падрыхтаванасці вучняў, але і прывесці да аднастайнага разумення паняцця "правілы" і вызначэння асноўных прызнакаў правіла, што створыць неабходныя ўмовы для правядзення "навуковых даследванняў" і дыскусіі.


*©Грамадскае аб'яднанне «ВІТ»*

Б) Для правядзення дадзенай часткі настаўніку варта задаць наступныя пытанні:

- прывядзіце прыклад правіла якое вы ведаеце, выконвалі, ці ўсталёўвалі. Папрасіце вучняў быць сціслымі. Дастаткова будзе аднаго, максімум двух прыкладаў.
- што такое правіла? Якія асацыяцыі выклікае слова правіла? Адказы вучняў на гэтае пытанне (асацыяцыі ці прызнакі, якія вучні называюць) можна запісваць на ватмане ці дошцы адным- двумя словамі. Напрыклад: "*Правіла – гэта інструкцыі па паводзінах чалавека*". Запісваем – інструкцыі і г.д. Калі ў вучняў будуць цяжкасці з адказам на дадзенае пытанне (якое само па сабе з'яўляецца цяжкім, варта задаць дадатковыя пытанні якія павінны дапамагчы вучням: *а) Для чаго існуюць правілы? б) Якія віды правілаў існуюць і для чаго існуюць сацыяльныя нормы-правілы? в) Адкуль мы даведваемся пра правілы? г) Дзе правілы ўтрымліваюцца? (У якой форме правілы існуюць?) д) Якія прынцыпы дзеяння правілаў вы ведаеце?* Адказы на дадзеныя пытанні неабходны нам будуць для вывядзення паняцця правілаў.

Пасля апытання падсумоўваюцца тыя прызнакі і асацыяцыі, якія былі пералічаныя вучнямі. Варта звярнуць ўвагу вучняў, што мы будзем канцэнтраваць сваю ўвагу толькі на сацыяльных правілах ці правілах, якія ўсталяваныя грамадствам (людзьмі) для саміх людзей. (Глядзі главу падручніка "**Правілы**", а таксама высновы пасля яе). У якасці дапаможнага матэрыяла для настаўніка, які можа дапамагчы ў падсумаванні паняцця "правіла", прапануем наступны матэрыял:

*<u>Сацыяльныя нормы/правілы</u>*

*Адкуль мы даведваемся пра правілы: напрыклад, а) з дзяцінства ад бацькоў, ад блізкіх, са школы, ад сяброў і г.д. можам даведацца пра існаванне нейкіх правілаў; б) самі можам даведацца прачытаўшы пра іх, ці зразумець у выніку працы, базуючыся на асабістым досведзе; в) можам усталяваць самі для сябе і для іншых.*

*Ёсць правілы: а) якія мы ведаем; б) ведаем толькі ў агульных рысах; в) не ведаем увогуле (напрыклад, асобныя правілы-законы прынятыя Парламентам нядаўна, ці ў той сферы, якая нас не цікавіць, напрыклад – жывелагадоўля). Але нашае няведанне не азначае, што гэтыя правілы не дзейнічаюць, а мы можам іх не выконваць. У ідэале мы павінны ведаць правілы, па якіх жывем і па якіх дзейнічаем, для таго каб нармальна жыць,*


©Грамадскае аб'яднанне «ВІТ»

*мець магчымасць абараняць свае правы і ведаць, што мы можам рабіць у канфліктных сітуацыях.*
*Ёсць правілы якія: а) лёгка парушыць (напрыклад, у нядзелю ўстаць не ў 10.00, як мы сабе ўсталявалі, а ў 11.30). Ёсць такія, якія б) парушыць цяжка, альбо амаль нерэальна, напрыклад правілы-законы зямнога прыцяжэння.*
*Ёсць правілы, парушэнне якіх прыводзіць да цяжкіх наступстваў – за парушэнне правілаў дарожнага руху можна атрымаць штраф, альбо увогуле трапіць пад машыну.*
*Нарэшце, адныя правілы а) лёгка змяніць (напрыклад тыя, якія мы самі усталявалі для сябе), а іншыя – б) вельмі складана. Трэба толькі памятаць, што ўсе правілы ўсталяваныя людзьмі і для людзей, чалавек можа змяніць.*

В) Гэты матэрыял не абавязкова пераказваць вучням. Ён пададзены для таго, каб настаўнік акрамя тэкста пададзенага для вучня, меў дапаможны матэрыял для выбару шляху падсумавання вынікаў апытання вучняў аб сацыяльных правілах.

3. Для далейшай працы нам неабходна рассадзіць вучняў па групах, у якіх яны працавалі на мінулым занятку. Папрасіце іх перасесці па групах, у якіх вучні праводзілі навуковыя даследванні. Пакажыце месцы, дзе павінны сабрацца групы.

4. Праца ў групах над афармленнем вынікаў навуковых даследванняў. Неабходна даць заданне групам на працягу вызначанага часу канчаткова аформіць вынікі даследванняў правілаў, якія яны пачалі на прошлым занятку і павінны былі скончыць да пачатку гэтага. Таксама нагадайце, што яны павінны вызначыць аднаго ўдзельніка групы, які будзе прэзентаваць вынікі працы групы. Падчас працы групаў над афармленнем прэзентацый вынікаў іх даследванняў трэба пастаянна наведваць групы і кантралюйце, на якой стадыі працы яны знаходзяцца і ці не патрабуюць дапамогі. Варта разбіць час падрыхтоўкі прэзентацый наступным чынам: 4 хвіліны – на ўзгадненне вынікаў індывідуальных даследванняў і ўзгадненне плану прэзентацый і 4 хвіліны на афармленне вынікаў на дошцы ці ватманах. Апошнія 4 хвіліны групы павінны прысвяціць афармленню вынікаў на паперы.


©Грамадскае аб'яднанне «ВІТ»

5. А) Настаўнік аб'яўляе, што на прэзентацыю, кожная група (калі іх 5) будзе мець ТОЛЬКІ 3 хвіліны, пасля чаго іх выступ будзе перапыняцца (калі колькасць групаў меньшая – то варта даць больш часу на прэзентацыі, улічваючы, аднак, час на падрыхтоўку да выступу групаў, на што таксама трэба час). Падчас прэзентацыі група павінна:
Азнаёміць вучняў з тэмай свайго даследвання і абраным правілам;
Азнаёміць вучняў са спосабам ці спосабамі, якімі праводзілася даследванне;
Падаць вынікі даследвання і свае вывады.

Б) Прэзентацыі вынікаў даследванняў. Калі вучні падрыхтуюць табліцы, ці інфармацыю на ватманах –іх можна павесіць на сцену. Гэтая інфармацыя можа прыдасца падчас падсумавання. Строга сачыце за часам. На дадзеным этапе не павінны весціся доўгія дыскусіі наконт зробленага групамі. Парадак прэзентацыі працы групаў вызначаецца самім выкладчыкам, але варта да прэзентацыі аб'явіць якая група будзе выступаць пасля якой, каб не зацягваўся час на падрыхтоўку да выступу наступнай групы.

В) Адказы на пытанні групаў, якія займаліся даследваннямі іншых правілаў.

6. А) Дыскусія з'яўляецца цэнтральнай часткай занятка і патрабуе асаблівай увагі настаўніка.
Б) Увесь час падчас дыскусіі варта вяртацца да вынікаў даследванняў, якія былі прадстаўленыя вучнямі.
В) Дыскусія павінна весціся вакол наступных пытанняў:
- З якімі складанасцямі групы сустрэліся, праводзячы свае даследванні? Не надавайце шмат часу разгляду гэтаму пытанню. Варта выслухаць двух-трох удзельнікаў розных групаў.
- Чым адрозніваюцца правілы гульні ад правілаў, якія існуюць у нашых сем'ях ці ў краме, ці ад абранага вамі правіла? Абгрунтуйце свой адказ.

Гутарку па гэтаму пытанню варта грунтаваць на табліцы №1 і выніках даследванняў групаў. Для гэтага можна прапанаваць вучням адкрыць табліцу №1 і задаць наступныя пытанні:


©Грамадскае аб'яднанне «ВІТ»

- Ці падобныя правілы паводзінаў у краме з правіламі паводзінаў падчас гульні, у сям'і, абраным вамі правілам? Аргументуйце, чым гэтыя правілы падобны і чым яны адрозніваюцца?
- Хто ўсталёўвае гэтыя правілы і хто мае права змяняць іх?
- Хто можа ўплываць на змену гэтых правілаў і пры якіх умовах?
- На чым базуецца абранае групай правіла?
- Дзе абранае групай правіла ўтрымліваецца?
- Хто здзяйсняе кантроль за выкананнем абранага групай правіла?
- Што абранае групай правіла кантралюе?
- Якія пакаранні, санкцыі ўсталяваны за парушэнне абранага групай правіла?
- Чаму абраныя вамі правілы дзейнічаюць? Чаму мы падпарадкоўваемся гэтым правілам? Хто ці што прымушае нас выконваць правілы?
- Што можа паўплываць на тое, што правіла становіцца недасканалым? Ці вечныя крытэрыі добрага правіла і калі не, то што на іх можа ўплываць. Што станецца, калі зменяцца крытэрыі добрага правіла? Што нам трэба рабіць, калі мы лічым, што нейкае правіла з'яўляецца недасканалым?

7. У падсумаванні занятку, варта коратка падсумаваць вынікі дыскусіі, базуючыся на выніках даследванняў і адказах вучняў і задаць вучням наступныя пытанні:

- Што новага вучні даведаліся з дадзенага занятка?
- Што такое правілы? Якія віды правілаў існуюць і для чаго існуюць сацыяльныя нормы-правілы? У якой форме існуюць правілы і чаму?
- Хто ўсталёўвае сацыяльныя нормы-правілы?
- Назавіце асноўныя прынцыпы дзеяння правілаў.
- Назавіце прычыны існавання дасканалых і недасканалых правілаў.
- Што здарыцца калі ўсе правілы адмяніць? Чаму?

8. Хатняе заданне: прачытаць главу падручніка **Сацыяльныя нормы** і пісьмова выканаць заданні пасля главы.


*©Грамадскае аб'яднанне «ВІТ»*

# САЦЫЯЛЬНЫЯ НОРМЫ

**Мэта занятка**: Высветліць асаблівасці і ўзаемасувязі розных сацыяльных нормаў, а таксама месца права ў іерархічнай сістэме сацыяльных нормаў.

***У выніку занятка вучні:***

*Веды:*

- назавуць сацыяльныя нормы;
- растлумачаць, якія існуюць віды сацыяльных нормаў;
- растлумачаць, што такое маральныя, рэлігійныя і прававыя нормы;
- растлумачаць узаемасувязь маральных, рэлігійных і прававых нормаў;
- назавуць месца прававых нормаў сярод іншых сацыяльных рэгулятараў;
- пералічаць асобныя прынцыпы судовай працэдуры.

*Навыкі:*

- разглядзяць казус і ацэняць яго з пункту гледжання розных сацыяльных нормаў;
- будуць камунікаваць з іншымі, працаваць у групах, публічна выступаць і адстойваць сваю пазіцыю.

*Каштоўнасці:*

- ўсвядомяць каштоўнасць права, як аднаго з асноўных рэгулятараў;
- ўсвядомяць каштоўнасць сацыяльных нормаў-правілаў як нормаў, асноўнай мэтай якіх з'яўляецца стварэнне ўмоваў для нашага развіцця і гарантыя нашай бяспекі.

**Асноўныя азначэнні:**

**Прававыя нормы** – сістэма агульнаабавязковых правілаў паводзінаў, якія ўсталёўваюцца грамадзянамі, як правіла пры пасярэдніцтве вышэйшых органаў улады, і выкананне якіх забяспечваецца спецыяльнымі дзяржаўнымі органамі (міліцыяй, пракуратурай, войскамі, турмамі, судамі і г.д.)

**Маральныя нормы** – сістэма нормаў, заснаваных на пануючым у грамадстве разуменні дабра і зла, якая залежыць ад гістарычных, культурных і іншых асаблівасцей народа.



*©Грамадскае аб'яднанне «ВІТ»*

**Рэлігійныя нормы** – сістэма абавязковых для веруючага чалавека правілаў паводзінаў, выкананне якіх вядзе да выратавання душы ці самаўдасканалення чалавека.

**Інтэрактыўныя метады:** праца ў групах, аналіз выпадка (казуса) імітацыя судовага разбіральніцтва, абмеркаванне.

**Матэрыялы**:
1. Ватман/дошка з тэмай занятку, мэтай і чакаемымі вынікамі
2. Ватман з надпісам "НОРМЫ = ПРАВІЛЫ" ці адпаведны надпіс на дошцы
3. Адзін плакат з азначэннем тэрміна "незаконны захоп зямлі" ці напісаны на дошцы
4. Адзін плакат з вытрымкамі з заканадаўства аб адказансці за незаконны захоп зямлі(м.б. напісаныя на дошцы)
5. Шэсць-восем чыстых аркушаў ватману ці дошка
6. 6-8 маркераў, ці крэйда

**Час правядзення**: 45′

**План занятка**:
1. Знаёмства з мэтамі занятка і засяроджванне ўвагі навучэнцаў на тэме занятку – 1′;
2. Вызначэнне асобных сацыяльных нормаў – 3′;
3. Чытанне казуса – 5′;
4. Аднаўленне дэталяў справы – 3′;
5. Падзел на групы – 2′;
6. Прэзентацыя паняцця "незаконны захоп зямлі" і прэзентацыя плаката з выпіскамі з заканадаўства напісаных на ватмане ці дошцы – 2′;
7. Выкананне задання ў групах (падрыхтоўка аргументаў) – 5′;
8. Прадстаўленне вынікаў працы і правядзення суда – 12′ (4′х3);
9. Прыняцце рашэння судзямі – 2′;
10. Падсумаванне суда і дыскусія па яго выніках – 7′;
11. Падсумаванне вынікаў занятку – 2′;
12. Хатняе заданне – 1′

**Методыка правядзення:**


*©Грамадскае аб'яднанне «ВІТ»*

1. На пачатку настаўнік знаёміць вучняў з тэмай і чакаемымі вынікамі занятка.

Настаўнік можа пачаць занятак з узгадвання тэмаў прошлага занятку. Асаблівую ўвагу варта звярнуць на тое, што на папярэдніх занятках разглядаліся розныя віды правілаў і сярод іх выдзяляюцца розныя віды сацыяльных нормаў, якія існуюць у грамадстве.

2. А) Настаўнік праводзіць апытанне - "Якія вы ведаеце сацыяльныя нормы?"і фіксуе адказы на плакаце ці дошцы. Асноўная задача гэтай часткі занятка – засяроджванне ўвагі навучэнцаў на тэме занятка, аднаўленне інфармацыі, якую яны прачыталі аб сацыяльных нормах, усвядоміць чаму ў грамадстве існуюць розныя сацыяльныя нормы. (Настаўнік можа падказаць асобныя нормы, але звычайна навучэнцы называюць прававыя, маральныя, рэлігійныя і некаторыя іншыя нормы. Сярод іншых вучні могуць назваць карпаратыўныя нормы. Карпаратыўныя нормы – гэта нормы, прынятыя нейкай групай людзей, якія маюць абавязковую сілу толькі для гэтай групы людзей. Карпаратыўнымі нормамі могуць быць нормы, якія прымаюцца працоўным калектывам якой-небудзь арганізацыі (*напрыклад, так званая клятва Гіпакрата гэта карпарытыўны кодэкс медыкаў*). У нашым казусе Івана Бохана карпаратыўнымі нормамі можна назваць правілы, якія былі прынятыя абшчыннікамі на падставе рэлігійна-маральных нормаў. Для далейшай працы настаўніку неабходна вылучыць як мінімум рэлігіныя, маральныя і прававыя нормы, хаця ўдзельнікі могуць называць значна большую іх колькасць. Настаўнік праводзіць гутарку з вучнямі, асноўнымі пытаннямі якой могуць быць: 1) Ці аднолькавыя нормы запісаныя на ватмане падчас узгадвання нормаў? 2) Чаму ў грамадстве існуюць розныя сацыяльныя нормы? 3) Чым адрозніваюцца гэтыя нормы?

Б) Настаўнік павінен вярнуцца да спісу сацыяльных нормаў, прапанаваных вучнямі, і даць ім агульную характарыстыку, растлумачыць сутнасць і асаблівасці прававых, маральных і рэлігійных нормаў.

4. Настаўнік дае вучням час узгадаць справу (выпадак) з падручніка для вучняў "Літоўскія браты з Пастаўшчыны". Асноўная задача разгляду выпадка – даць удзельнікам разуменне таго, што такое сацыяльныя нормы; чаму існуюць розныя сацыяльныя нормы; растлумачыць сэнс і


*©Грамадскае аб'яднанне «ВІТ»*

асаблівасці прававых, маральных і рэлігійных нормаў. Вучні яшчэ раз павінны ўзгадаць выпадак, а хто не чытаў у хаце – прачытаць.

Пасля прачытання выпадку, настаўнік праз пытанні да вучняў: аднаўляе дэталі таго, што здарылася ў справе. Па меры таго, як навучэнцы называюць факты, сам, альбо з дапамогай іншага навучэнца, запісвае іх на ватмане ці дошцы. Гэтая частка неабходна для таго, каб усе навучэнцы аднолькава і аднастайна зразумелі ўсе дэталі справы, паколькі самыя дробныя дэталі з'яўляюцца вельмі важнымі. Настаўнік павінен сачыць за тым, каб вучні ўзгадалі ўсе факты паслядоўна адзін за адным. Найбольш важнымі фактамі з'яўляюцца наступныя:

- Адной з групаў хрысціян-пратэстантаў на Беларусі ў XVI ст. былі **Літоўскія браты**;
- Літоўскія браты лічылі, што хрысціяніне **не павінны падпарадкоўвацца дзяржаве і праву**, не могуць служыць у войску, мець залежных сялян і звяртацца ў суд таму, што дзяржава і права пабудаваны на прымусе, гвалце і падпарадкаванні аднаго чалавека другому, што пярэчыць асноўнаму хрысціянскаму прынцыпу – любові да бліжняга;
- Іван Бохан, яго жонка і іх сябры, якія таксама належалі да Літоўскіх братоў, усяго 12 чалавек, вырашылі, што **павінны жыць згодна з тымі прынцыпамі і правіламі, у якія яны вераць**;
- **Іван Бохан прапанаваў** даць вольную ўсім прыгонным сялянам, **прадаць свае гаспадаркі, раздаць грошы бедным, пасяліцца на яго землях** і жыць абшчынай, адасобіўшыся ад дзяржавы і астатняга грамадства;
- **Землі Івана Бохана, па яго словах, будуць цяпер агульнай уласнасцю абшчыны;**
- Усе дванаццаць чалавек **паверылі Івану Бохану, пагадзіліся з прапанаванымі правіламі**;
- Абшчыннікі зрабілі ўсё так, **як дамовіліся**: **пабудавалі на зямлі Івана Бохана сабе дамы**;
- **Зямлю, грошы, і прылады працы зрабілі агульнымі**, абшчыннікі былі роўныя адзін аднаму як браты і сёстры, усе спрэчныя пытанні яны вырашалі не звяртаючыся ў суд, на агульных сходах на падставе хрысціянскай маралі і тых правілаў, якія былі прынятыя ўсімі;
- Пасля двух гадоў сумеснага існавання паміж абшчыннікамі **пачаліся канфлікты;**
- За ўчынены крадзеж, **большасцю галасоў, на агульным сходзе было прынята рашэнне аб выгнанні жонкі Івана Бохана** з абшчыны;


*©Грамадскае аб'яднанне «ВІТ»*

- **Супраць выгнання** жонкі з абшчыны выступіў **толькі Іван Бохан, але за гэта абшчыннікі прынялі рашэнне і аб яго выгнанні**;
- Пасля прыняцця рашэння агульным сходам аб выгнанні яго і жонкі, **Іван Бохан запатрабаваў** ад астатніх абшчыннікаў **ад'ехаць з яго маёнтка, паколькі гэта яго ўласнасць і ён не жадае, каб чужыя людзі знаходзіліся на яго зямлі;**
- **Іван Бохан падае іск у дзяржаўны суд з тым, каб іх прымусова выселілі з яго земляў і пачалі справу аб незаконным захопе яго зямлі**;

5. А) Настаўнік пытаецца ва ўдзельнікаў, ці павінны абшчыннікі несці адказнасць за знаходжанне на зямлі Івана Бохана. Звычайна ўдзельнікі выказваюцца неадназначна, і тады настаўнік просіць падняць рукі тых, хто лічыць, што абшчыннікі павінны несці адказнасць, а потым тых, хто лічыць інакш. Частка ўдзельнікаў звычайна ўстрымліваецца. Наступны крок – падзел удзельнікаў на тры групы згодна з вынікамі галасавання: тыя вучні, што выказаліся за тое, што абшчыннікі павінны адказваць, а Іван Бохан мае права падаць на абшчыннікаў у суд будуць "прадстаўнікамі Івана Бохана", адпаведна, тыя людзі якія выказаліся у абарону абшчыннікаў і супраць Івана Бохана будуць «прадстаўнікамі абшчыннікаў», а тыя, што ўстрымаліся - «суддзямі».
Б) У выпадку, калі ўсе ці пераважная большасць вучняў схіліцца на карысць толькі Івана Бохана ці толькі абшчыннікаў, альбо будзе занадта малой група тых, хто не вызначыўся, настаўнік можа падзяліць вучняў на тры групы адвольна.

6. А) Настаўніку да занятка варта прыгатаваць два запіса: 1) з азначэннем тэрміну "Незаконны захоп зямлі" і 2) з выпіскамі з заканадаўства.
Б) Настаўнік прэзэнтуе запіс з прававым азначэннем тэрміну «незаконны захоп зямлі», агучвае і тлумачыць яго. Трэба памятаць, што ўсё заканадаўства на дадзеным занятку створана штучна, хаця аснову мае рэальна прававую. Асноўным, на што трэба звярнуць увагу ў дадзеным азначэнні гэта тры моманты пры наяўнасці якіх знаходжанне на нечыяй зямлі раўглядаецца як незаконны захоп зямлі: а) нехта знаходзіцца на зямлі <u>без згоды ўласніка</u>; б) <u>без пісьмова аформленага дазвола</u> на знаходжанне з боку ўласніка; в) знаходзяцца без згоды і пісьмовага дазвола <u>ў мэтах пражываць, весці гаспадарку ці інш</u>.
В) Настаўнік прэзэнтуе плакат з выпіскамі артыкулаў з заканадаўства і просіць вучняў патлумачыць, як яны разумеюць дадзеныя нормы, калі


©Грамадскае аб'яднанне «ВІТ»

вучні не справяцца, то настаўнік растлумачвае дадзеныя нормы. Настаўніку варта запытаць у вучняў, што з заканадаўства можа быць выкарыстана думку вучняў прадстаўнікамі Івана Бохана і што прадстаўнікамі абшчыннікаў. Найбольш важнае падчас вытлумачэнняў з'яўляецца абмеркаваць магчымасці і падставы спасылацца на заканадаўства і абараняць свае інтарэсы, як абшчыннікам, так і Івану Бохану. Іван Бохан, напрыклад, можа канцэнтраваць сваю ўвагу на тым, што: а) пражываюць па запрашэнню, але без афармлення дазвола ў пісьмовай форме і значыць – незаконна захапілі зямлю; б) у судовых кнігах вусная дамова не рэгістравалася – значыць іх нельга разглядаць як часовых карыстальнікаў зямлі. Абшчыннікі, напрыклад, могуць спасылацца на заканадаўства: а) яны госці, бо іх запрасілі; б) пражываюць больш за год – значыцца часовыя карыстальнікі. Другой магчымасцю, вакол якой могуць спрачацца бакі, гэта – ці з'яўляецца зямля ўласнасцю абшчыннікаў (бо Іван Бохан сам заявіў пра тое, што перадае зямлю абшчыне), разам з тым, гэтая дамова не была аформлена пісьмова, але ў той сітуацыі яе немагчыма было аформіць пісьмова, бо Літоўскія браты адмаўляюць усялякія кантакты з дзяржаўнымі органамі. У гэтай сітуацыі ці засталася зямля ва ўласнасці Івана Бохана (бо не была аформлена пісьмова)? Вучні павінны ўбачыць, што як адныя, так і другія ў роўнай ступені маюць магчымасць, спасылаючыся на заканадаўства, абараняць свае інтарэсы.

Г) Пазней, настаўнік вытлумачвае падставы судовага працэса. Першымі выступаюць прадстаўнікі Івана Бохана (менавіта яны ініцыявалі судовы працэс). Суддзі задаюць ім пытанні. Другімі выступаюць абшчыннікі, бо яны абараняюцца. Суддзі задаюць ім пытанні. Суддзі выдаляюцца для таго, каб ацаніць доказы аднаго і другога боку і на <u>падставе заканадаўства</u> прыняць рашэнне.

Д) Мэтай гэтай часткі з'яўляецца прэзентацыя новага для вучняў паняцця незаконны захоп зямлі, якое будзе выкарыстоўвацца на занятку і прававых нормаў, на падставе якіх дадзеная справа будзе разглядацца.

7. Групы ўдзельнікаў атрымліваюць заданні

А. «Прадстаўнікі Бохана» павінны напісаць на аркушы ватману:

- 4 асноўныя аргументы, якія б доказвалі, што абшчыннікі незаконна захапілі зямлю ці з'яўляюцца вінаватымі ў іншай шкодзе, якая была нанесена маёмасці Івана Бохана падчас пражывання на яго зямлі (напрыклад, знаходзяцца на яго зямлі незаконна і перашкаджаюць свабодна распараджацца, выкарыстоўваць і валодаць зямлёй; ці з-за


©Грамадскае аб'яднанне «ВІТ»

пабудаваных будынкаў Іван Бохан не можа пахаць гэтыя землі, а значыць страчвае грошы ад непрададзеных ураджаеў);
- вызначыць, чаго прадстаўнікі Бохана патрабуюць ад абшчыннікаў (яны могуць патрабаваць напрыклад: а) высяліць абшчыннікаў сілай з зямлі Івана Бохана, і за кошт абшчыннікаў разабраць пабудовы, у якіх жылі (незаконна знаходзяцца на гэтай зямлі); б) патрабаваць матэрыяльнай (грашовай) кампенсацыі за нанесеную абшчыннікамі за час пражывання шкоду, калі дакажуць што ў выніку іх пражывання нешта папсавалая ці стала працаваць кепска – напрыклад, засмеціўся калодзеж, якім карысталіся абшчыннікі; в) патрабаваць кампенсацыі неатрыманых даходаў, калі дакажуць, што ў выніку незаконнага захопу зямлі Іван Бохан не мог атрымліваць даходы з занятых земляў;
- вызначыць той артыкул ці артыкулы заканадаўства, на падставе якіх, з пункту гледжання прадстаўнікоў Івана Бохана, абшчыннікі павінны несці адказнасць.
Б. «Прадстаўнікі абшчыннікаў», калі яны лічаць, што абшчыннікі невінаватыя у незаконным захопе зямлі, павінны напісаць на аркушы ватману 4 асноўныя аргуманты, чаму іх не трэба прыцягваць да адказнасці за незаконны захоп зямлі; а калі адказчыкі лічаць, што абшчыннікі ўсё ж-такі вінаватыя, ва ўсім ці частцы абвінавачванняў, якія выстаўляюцца прадстаўнікамі Бохана, то яны павінны вызначыць 4 асноўныя змякчальныя абставіны і той артыкул ці артыкулы заканадаўства, па якіх яны павінны несці адказнасць і якія страты Івана Бохана гатовыя кампенсаваць. Асноўнай матывацыяй абшчыннікаў можа быць наступная: абшчыннікі адмовіліся з'язжаць з зямлі і заявілі, што ён не можа звярнуцца ў суд, паколькі гэта будзе выступам супраць усіх прынцыпаў у якія ўсе яны вераць. Таксама гэта будзе парушэннем правілаў, якія былі прынятыя ўсімі. На зямлю, дзе пражывае абшчына, усе пераехалі па запрашэнню Івана Бохана і згодна з яго рашэннем як былога ўласніка, зямля з'яўляецца агульнай уласнасцю абшчыны. Больш за тое, абшчыннікам няма куды ісці і няма чым плаціць, таму што яны прадалі ўсю сваю маёмасць і раздалі яе бедным. Ім не будзе дзе і за што жыць.
В. «Суддзі» павінны падрыхтывавць па 4 пытання да «прадстаўнікоў Бохана» і да «прадстаўнікоў абшчыннікаў» на удакладненне іх пазіцый.

8. Групы «прадстаўнікоў Бохана» і «прадстаўнікоў абшчыннікаў» па чарзе прэзэнтуюць вынікі сваёй працы, а суддзі задаюць па 4 пытанні кожнай


©Грамадскае аб'яднанне «ВІТ»

групе па заканчэнні іх выступаў (правам задаваць пытанні да выступоўцаў валодаюць толькі «суддзі»).

9. А) «Суддзі» выдаляюцца з залы на 2 хвіліны для прыняцця рашэння па справе Івана Бохана і абшчыннікаў.
Б) Суддзі павінны:
Вызначыць вінаватыя ці невінаватыя абшчыннікі ў тым, у чым іх абвінавачваюць прадстаўнікі Бохана – у незаконным захопе зямлі і:
- калі вінаватыя, то абгрунтаваць сваё рашэнне на падставе заканадаўства і вызначыць, якія патрабаванні прадстаўнікоў Бохана неабходна задаволіць (у выпадку, калі суд прызнае абшчыннікаў вінаватымі, ён можа: задаволіць усе патрабаванні прадстаўнікоў Івана Бохана, абгрунтаваўшы іх; ці толькі іх частку – напрыклад, выселіць з земляў, але не плаціць кампенсацыю ці інш.)
- калі невінаватыя, то вызваліць прадстаўнікоў абшчыннікаў ад абавязку выконваць патрабаванні прадстаўнікоў Бохана і абгрунтаваць сваё рашэнне на падставе заканадаўства.
В) Суддзі вяртаюцца ў залу і агучваюць свой прысуд.

10. А) Пасля абвяшчэння прысуду настаўнік абвяшчае пра заканчэнне афіцыйнай часткі разгляду справы, паведамляе ўдзельнікам, што рашэнне суддзяў канчатковае і не падлягае абмеркаванню. Дзякуе вучням за працу (гэта можа быць адным з варыянтаў вываду з роляў, але настаўнік можа выкарыстаць і іншыя спосабы) і пачынае падсумаванне.
Б) Першае пытанне настаўніка падчас падсумавання – «Якая, на ваш погляд, павінна быць мэта задавальнення патрабаванняў Івана Бохана?» Адной з асноўных мэтаў з'яўляецца аднаўленне парушаных ці страчаных правоў. Напрыклад, у нашым выпадку, такімі парушанымі правамі могуць быць права на выкарыстанне і распараджэнне сваёй зямлёй. Іван Бохан запрасіў пажыць сваіх знаёмых на яго зямлі, але ён больш не хоча, каб яны жылі ў яго на зямлі, яны па нейкіх прычынах пачалі перашкаджаць яму. Паколькі ніякіх афіцыйных дакументаў – дамоваў не было заключана, у Івана Бохана няма прававых перашкодаў для таго, каб выгнаць абшчыннікаў, хоць гэта будзе і вельмі непрыгожа з пункту гледжання маралі. Прычым, кампенсацыі ў грамадзянскім (у дадзеным выпадку) працэсе не разглядаюцца як кара за тое што абшчыннікі зрабілі, а як КАМПЕНСАЦЫЯ ЗА СТРАТЫ, ЯКІЯ панёс Іван Бохан у выніку захопа зямлі абшчыннікамі. Зусім іншая сітуацыя была б, калі абшчыннікі захапілі дзяржаўную зямлю – у гэтым выпадку дзяржава, як уласнік зямлі,


©Грамадскае аб'яднанне «ВІТ»

згодна заканадаўства магла б патрабаваць не толькі кампенсацыі стратаў, але і больш суровых пакаранняў, напрыклад, грашовага штрафа ці нават турэмнага зняволення (усё залежыць, якія пакаранні за незаконны захоп зямлі быў бы прадугледжаны ў заканадаўстве), і ў гэтым выпадку мэтай пакарання абшчыннікаў павінна было б быць папярэджанне падобных дзеянняў у будучым.

В) Пасля гэтага настаўнік кажа, што падобныя выпадкі сапраўды адбываліся ў XVI ст. на Беларусі і маглі разглядацца ў судах Вялікага княства Літоўскага. Сапраўды, шмат Літоўскіх братоў, сярод якіх былі і вельмі заможныя і вядомыя людзі, згодна са сваімі рэлігійнымі перакананнямі прадавалі свае маёнткі, вызвалялі сялян, а грошы раздавалі бедным і жылі пазней абшчынамі, не звяртаючыся па дапамогу да дзяржавы.

Г) Пасля гэтага настаўнік пераходзіць да разгляду дадзенага выпадку з пункту гледжання маральных нормаў і ставіць наступныя пытанні: «Якая сувязь паміж законам і мараллю ў гэтым выпадку? Якімі былі паводзіны Івана Бохана, з пункту гледжання маральных нормаў?» Удзельнікі звычайна выказваюцца неадназначна, і настаўнік просіць іх растлумачыць сваю пазіцыю.

Д) Пазней настаўнік паглыбляецца ў разгляд магчымых супярэчнасцяў паміж прававымі і маральнымі нормамі. Ён пытаецца ва ўдзельнікаў: «Ці можа быць дзеянне законным, але не маральным?» (*магчымы прыклад – смяротнае пакаранне, якое законна, але, як і ўсялякае забойства, немаральна*) і «Ці можа быць дзеянне маральным, але незаконным?» (*да сёняшняга дня помста (не абавязкова кроўная) не асуджаецца мараллю ў нашым грамадстве, але заканадаўства дакладна вызначае, што забойства з помсты з'яўляецца звычайным забойствам*). Гэтыя прыклады паказваюць, што маральныя і прававыя нормы могуць супярэчыць адна адной.

Е) Затым настаўнік просіць даць ацэнку выпадку «Літоўскіх братоў з Пастаўшчыны» з пункту гледжання рэлігійных нормаў. (*Прыклад супярэчнасці прававых і рэлігійных нормаў тут – у супярэчнасці паміж тым ва што Іван Бохан верыў, і як ён у канцы паступіў са сваімі сябрамі. На падставе рэлігійных нормаў, якія забаранялі яму звяртацца ў суд, ён жыў, але пазней парушыў іх і звярнуўся за дапамогай да дзяржавы*). Настаўнік таксама можа задаць пытанне: З пункту гледжання рэлігійных нормаў праваслаўнай ці каталіцкай царквы ці былі дзеянні (падача іску ў суд) Івана Бохана грахом? Абгрунтуйце свой адказ.


*©Грамадскае аб'яднанне «ВІТ»*

Ж) Настаўнік можа скончыць падсумаванне наступным: «Грамадскія адносіны вельмі разнастайныя і таму яны рэгулююцца вялікай колькасцю розных сацыяльных нормаў, якія часам уступаюць у канфлікт паміж сабою. Прававыя нормы, механізм, які забяспечваецца дзяржаваю, уладкоўваюць супярэчнасці паміж рознымі сацыяльнымі нормамі і заўсёды стаяць вышэй іншых нормаў (як мы памятаем, пасппяховая гульня не можа весціся адначасова па некалькіх правілах, правілы павінны быць адзінымі і агульнаабавязковымі). Аднак гэта не значыць, што прававыя нормы заўсёды статычныя – яны могуць мяняцца, калі грамадства лічыць неабходным іх змяніць («Закон застаецца законам да таго часу, пакуль ён выконваецца большасцю грамадзян», прыклад – закон пра манаполію англічан на здабычу солі ў каланіяльнай Індыі і яго адмена пасля ўсеагульнага ігнаравання гэтага закона індусамі)».

11. На падсумаванне занятка настаўніку варта задаць наступныя пытанні:
- Што новае вучні даведаліся на дадзеным занятку?
- Ці падобныя маральныя, хрысціянскія і прававыя нормы? Вызначце, чым гэтыя нормы падобны і чым яны адрозніваюцца?
- Прывядзіце прыклад дзеяння, якое можа быць урэгуляваны адразу ўсімі гэтымі нормамі.
- Чаму адныя і тыя ж дзеянні ўрэгулёўваюцца усімі гэтымі нормамі?

12. Хатняе заданне: прачытаць главу падручніка **Прававыя і неправавыя законы** і пісьмова выканаць заданні пасля главы.


*©Грамадскае аб'яднанне «ВІТ»*

## Дадаткі да занятка

**Плакат з азначэннем незаконны захоп зямлі (ці напісаць на дошцы):**

"Незаконны захоп зямлі – гэта заняцце зямельнага надзела ў мэтах будаўніцтва будынкаў, гаспадарчых збудаванняў, вядзення гаспадарчай дзейнасці, пражывання без згоды ўласніка і без законна афармленага ў пісьмовай форме дазвола з боку уласніка дадзенага надзела."

**Вытрымкі з заканадаўства:**

| | |
|---|---|
| **Арт. 25** | Вяртанне незаконна занятага надзела ўласніку, прывядзенне самавольна захопленых зямельных надзелаў у прыдатны для выкарыстання стан, уключаючы знос пабудоваў, вызначэнне кампенсацый за нанесеныя страты і выгнанне асоб незаконна захапіўшых зямельны надзел адбываецца па рашэнню суда. |
| **Арт.42** | Усе здзелкі з зямлёй могуць адбывацца толькі са згоды ўласніка. Уласнік самастойны ад каго б там ні было падчас прыняцця рашэння аб сваёй зямлі. |
| **Арт. 45** | Пераход права ўласнасці на зямлю можа адбывацца толькі пасля пісьмовага афармлення дагавора куплі-продажу ці дарэння і яго рэгістрацыі ў судовых кнігах. |
| **Арт. 69** | Часовае карыстанне зямлёй афармляецца вуснай дамовай з уласнікам зямельнага надзела, заключанай пры двух сведках, як мінімум адзін з якіх павінен быць прадстаўнік мясцовай адміністрацыі. Часовыя карыстальнікі не могуць быць выгнаныя з зямлі да сканчэння тэрміну дамовы. |


©Грамадскае аб'яднанне «ВІТ»

# ПРАВАВЫЯ І НЕПРАВАВЫЯ ЗАКОНЫ

**Мэта занятка**: Атрымаць агульнае ўяўленне пра прававыя і неправавыя законы і іх адрозненні, а таксама пра шляхі ўплыву на сітуацыю ў краіне з неправавымі законамі.

***У выніку занятка вучні:***

*Веды:*

- дадуць паняцце прававых і неправавых законаў;
- назавуць адрозненні законных і незаконных дзеянняў;
- вызначаць механізм фарміравання прававой думкі;
- пералічаць формы ўплыву на працэс фармавання прававой думкі;
- змогуць назваць правілы дэбатаў.

*Навыкі:*

- выпрацуюць і змогуць адстойваць аргументы на карысць свайго пункту гледжання;
- разгледзяць аргументы па актуальных праблемах сучаснасці;
- правядуць публічныя дэбаты.

*Каштоўнасці:*

- ушануюць каштоўнасць прававых законаў і законных дзеянняў;
- ацэняць значэнне граматнага ўплыву на фарміраванне прававой думкі;
- зразумеюць неабходнасць валодання правіламі эфектыўнай камунікацыі ў грамадскім жыцці;
- ацэняць публічныя дэбаты, як сродак уплыву на працэс фарміравання грамадскай думкі.

**Асноўныя азначэнні:**

**Закон** – дакумент, які прымаецца ў асаблівым парадку заканадаўчым органам краіны і рэгулюе найбольш важныя пытанні дзяржаўнага і грамадскага жыцця.

**Прававы закон** – закон, які прыняты згодна з фармальнымі патрабаваннямі да прававога закона і адпавядае рысам добрага правіла.


©Грамадскае аб'яднанне «ВІТ»

**Законныя дзеянні** – комплекс дзеянняў, якія прадугледжаны і дазволены законамі краіны.

**Інтэрактыўныя метады:** праца ў групах, Дэбаты, абмеркаванне.

**Матэрыялы**:

1. Ватман/дошка з тэмай занятку, мэтай і чакаемымі вынікамі
2. Аркуш ватману (дошка) з напісанай тэзай дэбатаў
3. Карткі для рэгулявання часу, адведзенага на выступ

**Час правядзення**:
варыянт 1 – 45',
варыянт 2 – 45'+45'
***Увага!*** *Пры магчамасці, для больш эфектыўнага дасягнення мэтаў, рэкамендуецца выкарыстаць для правядзення занятка варыянт 2.*

**План занятка:**

1. Прадстаўленне тэмы і чакаемых вынікаў занятка. (1 хв./1 хв.)
2. Факусіроўка і паўтор матэрыяла з падручніка. (2 хв./5 хв.)
3. Вызначэнне пазіцый па тэзе, падзел на групы і тлумачэнне парадку далейшай працы (3 хв./4 хв.)
4. Падрыхтоўка да Дэбатаў. Праца ў групах. (12 хв./35 хв.)
5. Правядзенне Дэбатаў. (20 хв./30 хв.)
6. Падсумаванне Дэбатаў (4 хв./9 хв.)
7. Падсумаванне занятка. (2 хв./5 хв.)
8. Хатняе заданне. (1 хв./1 хв.)

**Методыка правядзення:**

*Заўвага: На папярэднім занятку папрасіце вучняў апрануцца больш афіцыйна, чым яны звычайна апранаюцца. Адным з правілаў Дэбатаў з'яўляецца патрабаванне афіцыйнага выгляду ўдзельнікаў. Настаўнік перад заняткам павінен дакладна вывучыць правілы Дэбатаў, для таго каб пазбегнуць замінак з падзеламі на групы і вызначэннем прамоўцаў на занятку.*


*©Грамадскае аб'яднанне «ВІТ»*

1. На пачатку настаўнік знаёміць вучняў з тэмай і чакаемымі вынікамі занятка.

2. Для факусіроўкі ўвагі на тэме занятка і аднаўлення матэрыяла, змешчанага па гэтай тэме ў падручніку, настаўнік можа задаць пытанне:
- "Што такое закон?" *(гл. Асноўныя азначэнні)*
Варта вельмі коратка паслухаць меркаванні вучняў і пераходзіць да наступнай часткі.

3. Пасля гэтага настаўнік вывешвае (адкрывае) тэзу ***"Неправавыя законы можна змяняць незаконным шляхам"***. Для выпрацоўкі ў вучняў адзінага разумення тэмы і тэрмінаў, якія будуць далей ужывацца, настаўнік задае наступныя пытанні:
- Які закон на вашу думку лічыцца прававым? *(гл. Асноўныя азначэнні)*
- Якія рысы ён мае? *(Падручнік для вучня "Фармальныя рысы прававога закона")*
- Які закон мы можам лічыць неправавым? *(Той, які не адпавядае хаця б адной рысе прававога закона і парушае прынцыпы добрага правіла)*
- Што такое законнае і незаконнае дзеянне? *(гл. Асноўныя азначэнні)*
*Адказы на гэтыя пытанні не павінны быць вельмі падрабязнымі і разгорнутымі, таму не павінны заняць шмат часу.*

Далей настаўнік просіць вучняў на працягу адной хвіліны вызначыцца ў сваім стаўленні да прапанаванай тэзы. Пасля гэтага настаўнік прапануе заняць правы шэраг парт тых вучняў, што падтрымліваюць тэзу, а левы – тых, хто выступае супраць яе. Тых, у каго засталіся сумненні, настаўнік просіць сесці за сярэдні шэраг парт. Такім чынам атрымаецца 2 каманды: каманда "Тэзы" і каманда "Антытэзы", невызначыўшыеся вучні складуць "грамадскасць", якая будзе назіраць за ходам Дэбатаў.

*Можа здарыцца такая сітуацыя, калі бок тэзы альбо антытэзы падтрымліваюць усяго 1-2 асобы. Калі такое здарылася, самі прызначце вучняў у тую каманду, дзе не хапае людзей. Як правіла, сярод вучняў знаходзяцца людзі, якія з аднолькавым поспехам могуць адстойваць пазіцыю як аднаго, так і другога бока. Няма нічога страшнага і ў тым, што ўсе вучні падзеляцца на 2 часткі - займуць пазцыю альбо тэзы, альбо антытэзы – пакіньце пакуль месца "невызначыўшыхся" вакантным. Калі будзе ісці непасрэдная падрыхтоўка да Дэбатаў і вызначацца прамоўцы ад камандаў, усе астатнія вучні складуць "грамадскасць".*


*©Грамадскае аб'яднанне «ВІТ»*

Пасля гэтага настаўнік задае пытанне:

- Якія могуць выкарыстоўвацца спосабы абмеркавання сітуацыі ў краіне і ўплыву на грамадскую думку? (*звароты ў СМІ, грамадскія слуханні, дэбаты* і г.д.)
Пасля таго, як вучні выкажуцца, настаўнік прапануе паспрабаваць паўдзельнічаць у абмеркаванні тэзы менавіта ў выглядзе Дэбатаў, якія з'яўляюцца адной з формаў уплыву на працэс фармавання думкі. Настаўнік знаёміць вучняў з правіламі Дэбатаў (гл. Дадатак № 2).

4. На этапе падрыхтоўкі да Дэбатаў настаўнік дае заданне вучням на працягу адведзенага часу:

А. Групы, якія выказаліся ў падтрымку ці супраць тэзы, павінны на працягу 7 хвілін прааналізаваць і выбраць пяць найлепшых, на іх думку, аргументаў на карысць сваёй пазіцыі (іх можна выбраць з тых ідэй, якія вучні павінны былі запісаць у сшытак падчас падрыхтоўкі хатняга задання) і падмацаваць іх прыкладамі. *Падчас працы ў групах настаўніку неабходна сачыць за ходам абмеркавання ў групах і, пры неабходнасці, дапамагаць ім.* Пасля гэтага кожная група павінна на працягу 1-2 хвілін выбраць трох галоўных прамоўцаў, якія будуць бараніць і, адпаведна, абвяргаць тэзу. *Галоўных прамоўцаў можа прызначыць сам настаўнік. Пры гэтым трэба спыніць свой выбар на самых актыўных прыхільніках і ворагах тэзы, якія маюць здольнасці да публічнага выступу.* Вучні, якія трапілі ў лік галоўных прамоўцаў з абодвух бакоў, павінны размяркоўваць паміж сабой ролі і на працягу застаўшыхся 5 хвілін падрыхтаваць і ўзгадніць свае прамовы. Вучні, якія не ўвайшлі ў лік галоўных прамоўцаў, на гэтым этапе далучаюцца да трэцяй групы "невызначыўшыхся" (ці, пры яе адсутнасці, фармуюць яе).
*Калі вы плануеце занятак па 2 варыянту (45'+45'), вы дзеліце час наступным чынам:*
*20' – падрыхтоўка аргументаў*
*2-3' – вызначэнне прамоўцаў*
*12-13' – узгадненне прамоваў дакладчыкаў*

Б. Асобы, якія не вызначыліся ў стаўленні да тэзы, і тыя вучні, якія не ўвайшлі ў лік галоўных прамоўцаў, становяцца "грамадскасцю". Для іх падрыхтоўка да Дэбатаў на гэтым сканчаецца і яны могуць дапамагчы


©Грамадскае аб'яднанне «ВІТ»

настаўніку ў падрыхтоўцы залы да правядзення Дэбатаў (гл. схему 1 у Дадатку 1).

В. Настаўнік таксама выбірае аднаго вучня з ліку "грамадскасці" на ролю Сакратара і тлумачыць яму абавязкі Сакратара падчас правядзення Дэбатаў (гл. Дадатак 2 п. 2, 10). Сакратар павінен дапамагаць Маршалку, ролю якога лепш выконваць самаму настаўніку, падтрымліваць парадак у зале і сачыць за рэгламентам.

Г. Пакуль удзельнікі дэбатаў рыхтуюць свае прамовы, настаўнік з дапамогай вучняў з "грамадскасці" адпаведным чынам рыхтуе залу.(гл. Схему ў Дадатку 1).

5. Правядзенне Дэбатаў.

За 1 хвіліну да пачатку Дэбатаў настаўнік просіць усіх вучняў заняць месцы ў зале згодна Схеме 1. Пасля таго, як усе расселіся, настаўнік яшчэ раз нагадвае ўсім вучням правілы Дэбатаў. Настаўнік звяртае ўвагу прамоўцаў на абавязковасць ужывання акрэсленых у правілах формаў звароту, на пажаданасць (але неабавязковасць!) прадстаўлення слова прадстаўнікам з "грамадскасці", патлумачыўшы, што гэта будзе дадатковым плюсам камандзе, але адбярэ час у асноўнага прамоўцы. Яшчэ раз настаўнік нагадвае рэгламет Дэбатаў, ролі ўдзельнікаў, адказвае на пытанні. Абавязкова настаўнік павінен нагадаць вучням, што пасля Дэбатаў адбудзецца галасаванне, падчас якога ўсе прадстаўнікі "грамадскасці" будуць мець магчымасць вызначыць пераможцу Дэбатаў і павінны будуць аддаваць свае галасы не на карысць тэзы альбо антытэзы, а на карысць каманды, якая паказала сябе на Дэбатах з лепшага боку: прыводзіла лепшыя аргументы, прыклады і г.д. Настаўнік павінен заахвоціць "грамадскасць" да актыўнага ўдзелу ў Дэбатах, падкрэсліваючы, што ад гэтага ў многім будзе залежыць вынік Дэбатаў. Гэта дасць магчымасць вызначыць наколькі добра падрыхтаваліся да абароны сваёй пазіцыі каманды прамоўцаў.
Пасля гэтага настаўнік у якасці Маршалка займае сваё месца і распачынае Дэбаты аб'яўленнем даты і месца правядзення дэбатаў, тэзы Дэбатаў. Ён таксама прадстаўляе Сакратара і Каманды, прапануе прывітаць іх апладысментамі.
Падчас Дэбатаў Маршалак і Сакратар сочаць за парадкам у зале і за рэгламантам. Для таго, каб Сакратар сачыў за часам, для яго рыхтуюцца


©Грамадскае аб'яднанне «ВІТ»

карткі з лічбамі "0", "1", "2", "3". Калі прамоўца пачынае выступ, Сакратар паказвае яму і прысутным у зале картку з лічбай, якая вызначае колькі, часу яму адведзена. І потым, па меры сканчэння часу, паказвае карткі, якія паказваюць, колькі яшчэ засталося хвілін. Напрыклад, на выступ адводзіцца 3 хвіліны. Значыць першую картку Сакратар паказвае з лічбай "3". Калі праходзіць хвіліна, сакратар паказвае наступную картку - "2". І так далей, пакуль час не скончыцца. Апошняя картка, якая сігналізуе сканчэнне часу - "0". Пасля гэтага прамоўца перапыняецца, нават, калі ён яшчэ не скончыў выступ.

Калі "грамадскасць" паводзіць сябе пасіўна, Маршалак павінен заахвоціць яе да актыўнай працы. Калі галоўныя прамоўцы не даюць слова людзям з "грамадскасці", варта нагадаць ім, што павага да думкі аўдыторыі ёсць дадатковы плюс для камандаў.

Пасля сканчэння Дэбатаў Маршалак яшчэ раз нагадвае, што падчас галасавання трэба аддаць свой голас не за тэзу альбо антытэзу, а за тую з камандаў, якая лепш адстойвала сваю пазіцыю.

Галасаванне можа адбывацца некалькімі спосабамі: можна папрасіць "грамадскасць" выйсці з залы, а затым зайсці зноў і сесці на той бок класа, у якім сядзіць каманда, якая, на іх думку, была лепшай падчас Дэбатаў. У якасці варыянта падліку галасоў дапушчальна таксама тайнае галасаванне, падчас якога вучні з "грамадскасці" на атрыманых ад Сакратара картках ставяць (Т), калі лічаць, што перамагла каманда тэзы і (А), калі перамагла каманда антытэзы.

Пасля падліку галасоў Маршалак абвяшчае вынікі дэбатаў і прапануе вучням падзякаваць абедзьвюм камандам за працу, а каманды – аўдыторыі - апладысментамі. Калі ёсць час, то можна абвясціць невялікі перапынак і паставіць на месца мэблю.

6. Пасля перапынку пачынаецца абмеркаванне вынікаў дэбатаў. Можна задаць наступныя пытанні:

- як адчувалі сябе выступоўцы ад каманд падчас правядзення Дэбатаў, ці задаволеныя яны сваімі выступамі?
- як адчувалі сябе ўдзельнікі "грамадскасці"?
- як каманды і іх выступоўцы выбіралі стратэгію паводзінаў і прадстаўлення аргументаў?
- як каманды ацэньваюць прадстаўленыя аргументы і прыведзеныя прыклады супрацьлеглага боку?
- які самы моцны аргумент быў прадстаўлены камандамі?


*©Грамадскае аб'яднанне «ВІТ»*

Падчас абмеркавання варта звярнуць увагу на тое, што публічныя Дэбаты з'яўляюцца адным са сродкаў уплыву на грамадскую думку, і што далёка не заўсёды людзі аддаюць свае галасы за ідэю - часам перавага аддаецца не тым, хто мае лепшую ідэю, а тым, хто свае ідэі здолеў лепш падаць. Калі застаецца час, можна абмеркаваць паводзіны галоўных прамоўцаў у дачыненні да "грамадскасці". Настаўнік можа закцэнтаваць увагу на тым: Як часта і ў якой форме прамоўцы дазвалялі альбо не дазвалялі выказвацца людзям з залы? Можна папрасіць галоўных прамоўцаў пракаментаваць свае паводзіны. Настаўнік можа звярнуць увагу на тое, што ад стаўлення да аўдыторыі, сярод якой неабходна знайсці прыхільнікаў, залежыць у многім тое, на чый бок яна стане.

Напрыканцы настаўнік можа падкрэсліць, што падзеі падобныя на тыя, сведкамі якіх былі вучні падчас Дэбатаў, маюць месца ў працэсе фарміравання грамадскай, у тым ліку і прававой, думкі. Наша справа вырашыць, альбо мы з'яўляемся пасіўнымі назіральнікамі, альбо бярэм актыўны ўдзел у фармаванні грамадскай думкі.

7. Далей настаўнік пераходзіць да падсумавання занятку. На падсумаванне варта задаць наступныя пытанні:

- што новага даведаліся вучні на занятку?
- ці існуе на самой справе падзел на прававыя і неправавыя законы. У чым іх розніца?
- якія існуюць шляхі ўплыву на сітуацыю ў краіне?
- наколькі эфектыўнымі з'яўляюцца Дэбаты і ў якіх выпадках могуць быць ужыты пры вырашэнні значных пытанняў у грамадстве?

8. Хатняе заданне: прачытаць главу падручніка "**Як ствараюцца законы**" і пісьмова выканаць заданні пасля главы.


*©Грамадскае аб'яднанне «ВІТ»*

Дататак 1

*Схема. **Зала для правядзення дэбатаў.***




***Заўвага:*** *стрэлачкі ўказваюць, якім чынам павінны быць размешчаны адзін адносна аднаго ўдзельнікі Дэбатаў. Кожны ў зале абавязкова павінен бачыць Сакратара і карткі з часам, якія ён паказвае.*


©Грамадскае аб'яднанне «ВІТ»

Дататак 2

## Правілы Дэбатаў

*(варта напісаць правілы на дошцы ці ватмане, каб яны былі ўвесь час перад вачыма)*

1. Дэбаты арганізуе і праводзіць Маршалак. Ён не мае права ўдзельнічаць у дыскусіі, бо з'яўляецца незацікаўленай асобай.
2. Маршалку дапамагае Сакратар, які паведамляе прамоўцам, колькі ў іх засталося часу на выступ, а таксама вядзе дакументацыю дэбатаў.
3. Перад дэбатамі ўдзельнікі займаюць месцы наступным чынам:
   - Праваруч Маршалка - абаронцы тэзы (3 чалавекі).
   - Леваруч Маршалка - праціўнікі тэзы (3 чалавекі).

     Першы рад прадстаўлены галоўнымі прамоўцамі.
   - У канцы залы пасярэдзіне-асобы, якія не маюць акрэсленай думкі (г. зв. "грамадскасць").
4. Кожны прамоўца павінен пачынаць свой выступ зваротам да вядучага дыскусію "Спадар Маршалак…".
5. Удзельнікі дэбатаў звяртаюцца адзін да аднаго, ужываючы форму "Спадар (Спадарыня)".
6. У дэбатах выступаюць папераменна абаронцы і праціўнікі тэзы. Першым выступае прамоўца, які акрэслівае тэзу і прыводзіць аргументы і прыклады на яе карысць. Пасля яго выступае галоўны прамоўца з боку апазіцыі, які акрэслівае і абараняе антытэзу. Далей ролі размяркоўваюцца наступным чынам:
   - Другія нумары абодвух бакоў па чарзе абвяргаюць аргументы супернікаў.
   - Трэція нумары падсумоўваюць тое, што было сказана абодвума бакамі падчас дэбатаў. Апошнім трымае слова трэці нумар каманды, якая абараняе антытэзу.
7. Удзельнікі дэбатаў (у т.л. і з "грамадскасці") на працягу ўсяго часу маюць права задаваць пытанні і даваць інфармацыю. Для гэтага неабходна ўстаць з месца, падняць уверх руку і сказаць: "Пытанне", альбо "Інфармацыя". Прамоўца мае права задаволіць альбо адхіліць жаданне ўдзельніка словамі "Калі ласка" альбо "Не, дзякуй". У выпадку згоды прамоўцы, час пытання альбо падання інфармацыі з боку ўдзельніка дадаецца да часу, адведзенага на выступ прамоўцы. У сувязі з гэтым пажадана, каб пытанні і інфармацыя з боку ўдзельнікаў не перавышалі б 2-3 сказы.
8. Калі прамоўца не даў згоды на пытанне альбо інфармацыю з месца, жадаючы павінен моўчкі заняць сваё месца.
9. Прамоўца і Маршалак могуць у любы момант перапыніць чалавека, які задае пытанне альбо паведамляе інфармацыю.
10. Прамоўца павінен прытрымлівацца часу, вызначанага на выступ. Першыя нумары абедзьвух каманд маюць на свае прамовы па 3 хвіліны. Другія і трэція нумары - па 2 хвіліны. Час, які застаецца да канца выступу, паказвае Сакратар. Пасля сканчэння адведзенага часу Маршалак мае права перапыніць выступ.
11. Удзельнікі дэбатаў маюць права змяняць месцы і пакідаць залу толькі ў перапынках паміж выступамі.
12. Прамоўцы падчас дэбатаў павінны быць афіцыйна апрануты.
13. Маршалак, супакойваючы залу, кажа "Цішыня". У выключных выпадках Маршалак мае права выставіць за дзверы ўдзельнікаў, якія не прытрымліваюцца правілаў дэбатаў.
14. Пасля дэбатаў наступае галасаванне, у якім усе прысутныя маюць права выказацца за абраную пазіцыю. Пры галасаванні павінны ацэньвацца не тэза, але аргументы, прадстаўленыя бакамі.


*©Грамадскае аб'яднанне «ВІТ»*

# ЯК СТВАРАЮЦЦА ЗАКОНЫ

**Мэта занятка**: Атрымаць базавыя веды аб парламенце і заканадаўчым працэсе.

***У выніку занятка вучні:***

Веды:
- змогуць даць азначэнне парламента;
- змогуць даць азначэнне і назваць асноўныя прынцыпы дзейнасці фракцый;
- змогуць пералічыць крокі заканадаўчага працэсу;
- змогуць вызначыць, на якіх стадыях заканадаўчага працэсу грамадзяне могуць уплываць на прымаемыя законы.

Навыкі:
- выпрацуюць уменне вызначаць сваю пазіцыю і адстойваць яе;
- набудуць здольнасці выслухоўваць аргументы апанентаў.

Каштоўнасці:
- ацэняць плюсы і мінусы парламентскага спосаба прыняцця рашэнняў у дзяржаве;
- усвядомяць неабходнасць уліку розных пунктаў гледжання пры прыняцці рашэнняў, якія тычацца важных праблемаў грамадства і дзяржавы.

**Асноўныя азначэнні:**

**Парламент** – вышэйшы прадстаўнічы, заканадаўчы орган, пабудаваны часткова ці цалкам на выбарчых пачатках.

**Фракцыя** - арганізаваная група сяброў палітычнай партыі, саюза, арганізацыі, якая праводзіць яе палітыку ў парламенце, органах мясцовага самакіравання.

**Заканадаўчы працэс** - парадак дзейнасці заканадаўчага органа па стварэнню законаў

**Інтэрактыўныя метады:** Мазаіка (Ажурная піла), абмеркаванне.


©Грамадскае аб'яднанне «ВІТ»

**Матэрыялы:**
1. Ватман/дошка з тэмай занятку, мэтай і чакаемымі вынікамі
2. Ватман з законапраектам, які выносіцца на абмеркаванне груп
3. Налепкі з малюнкамі рознага колеру для падзела на групы (па колькасці вучняў у класе)
4. Маркеры розных колераў
5. Ватманы для працы ў групах (па колькасці групаў)

**Час правядзення**: 45′

**План занятка:**

1. Азнаямленне з мэтамі і задачамі ўрока (1′)
2. Апытанне: Што такое парламент (3′)
3. Апытанне: Што такое фракцыя, нашто яны ствараюцца ў парламенце, асноўныя прынцыпы іх дзейнасці (3′)
4. Імітацыя заканадаўчага працэсу. Праца ў малых групах па метаду Ажурнай пілы (28′)

   А) падзел на групы і праца ў першасных групах па выпрацоўцы аргумантаў за і супраць прапанаванага законапраекта (10′)

   Б) падзел на новыя групы і праца ў другасных групах па дасягненні кансэнсуса па законапраекце (8′)

   В) вяртанне ў першасныя групы, абмеркаванне вынікаў перамоваў, унясенне зменаў у законапрект і галасаванне па законапректу (10′)
5. Абмеркаванне, накіраванае на высвятленне, на якім з этапаў прыняцця закону існуе найбольшая магчымасць уплыву грамадзян на прыняцце законаў і якімі спосабамі яна мажа быць рэалізавана (6′)
6. Падсумаванне занятка (3′)
7. Хатняе заданне (1′)

**Методыка правядзення:**

1. На пачатку настаўнік знаёміць вучняў з тэмай і чакаемымі вынікамі занятка.

2. Настаўнік можа пачаць зместавую частку занятка наступнымі словамі: "На папярэдніх занятках мы размаўлялі пра тое, што такое права і закон. Сення мы звернемся да таго, які́м чынам нараджаюцца законы, і як мы


*©Грамадскае аб'яднанне «ВІТ»*

можам паўплываць на прыняцце законаў у нашай краіне. Для гэтага давайце звернемся да главы падручніка, прысвечанай стварэнню законаў." Для праверкі прачытанага ў хаце матэрыяла і для падрыхтоўкі да далейшай працы на занятку настаўніку прапануецца задаць наступныя пытанні (*пад час апытання настаўнік стараецца стварыць атмасферу для вольнага выказвання вучняў, але сочыць за тым, каб усе жадаючыя мелі магчымасць выказацца і не дапускае спрэчак*):

- хто ў нашай краіне займаецца прыняццем законаў? (*вучні павінны адказаць, што гэтым займаюцца дэпутаты ў Парламенце*)
- што такое Парламент? (*гл. Асноўныя азначэнні*)
- як называеца беларускі Парламент? (*Нацыянальны Сход, складаецца з двух палат - Палаты прадстаўнікоў і Савета Рэспублікі*)
- якія асноўныя функцыі выконвае Парламент? (*прадстаўніцтва інтарэсаў грамадства праз дэпутатаў, разгляд праектаў законаў і прыняцце законаў у тым ліку і Канстытуцыі, прызначэнне выбараў Прзідэнта, разглядае пытанні аб увядзенні надзвычайнага становішча, выбірае шэсць судзяў Канстытуцыйнага Суда і г.д. гл. Арт. 97, 98 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь*)

3. Наступны блок пытанняў павінен быць накіраваны на высвятленне адзначэння парламентскай фракцыі і яе ролі ў прыняцці законаў:
- што такое фракцыя? (*гл. Асноўныя адзначэнні.*)
- па якому прынцыпу дэпутаты ў Парламенце аб'ядноўваюцца ў фракцыі? (*па партыйнай прыкмеце, агульнасці палітычных і грамадскіх інтарэсаў, якія той ці іншы дэпутат прадстаўляе ў парламенце*)
- з якой мэтай ствараюцца фракцыі ў Парламенце (*для абароны інтарэсаў таго слою насельніцтва, які іх абраў, ці інтарэсы якога адстойвае палітычная партыя, да якой яны належаць*)

4. Наступны этап занятка настаўнік можа пачаць са словаў "Мы высветлілі, хто прымае законы, што такое Парламент і фракцыі, і па якіх правілах яны дзейнічаюць. А зараз мы самі паспрабуем пабываць у ролі парламентарыяў - сябраў розных фракцый, якія будуць разглядаць закон аб тым што "НЕПАЎНАЛЕТНІЯ АСОБЫ НЕ МАЮЦЬ ПРАВА ЗНАХОДЗІЦЦА НА ВУЛІЦЫ ПАСЛЯ **21.30**. ЗА ПАРУШЭННЕ З БАЦЬКОЎ БЯРЭЦЦА ШТРАФ У ПАМЕРЫ 5 МІНІМАЛЬНЫХ ЗАРОБКАЎ" (*настаўнік ад імя ініцыятара законапраекта, Савета Міністаў, Прэзідэнта ці інш., вывешвае ватман з загадзя напісаным законапраектам, ці піша яго на дошцы. Гэты законапраект з'яўляецца выдуманным, з мэтай узбудзіць*


*©Грамадскае аб'яднанне «ВІТ»*

*больш ажыўленую дыскусію. Настаўнік можа прапанаваць законапраект на іншую тэму ў залежнасці ад актуальнасці, ці, калі гэта будзе цікава вучням, узяць за аснову пэўны ўжо існуючы закон*).

*На гэтым занятку асноўная праца арганізуецца па метаду Ажурнай пілы (Мазаікі), з правіламі ўжывання якога настаўнік можа азнаеміцца ў раздзеле* ***Метады актыўнага навучання****.*

Для далейшай працы настаўнік падзяляе вучняў на 3 групы наступным чынам: кожны вучань атрымлівае па адной налепцы, на якіх намалявана адна з выяў трох розных "рожыцаў": адна, на якой намаляваны ўсміхаючыся чалавек (1), другая - чалавека ў гальштуке з сур'ёзным тварам (2) і трэцяя - чалавека ў акулярах (3). Пры гэтым кожная група (1, 2, 3) заранёў падзелена на тры падгрупы па колеру выяваў на налепцы (напрыклад, у кожнай групе ёсць роўная колькасць налепак з "рожыцамі" сіняга, зялёнага і чырвонага колеру). У залежнасці ад тыпу налепкі, якую атрымаў кожны з вучняў, ўтвараюцца тры групы:

(1) вучні

(2) бацькі

(3) настаўнікі і школьная адміністрацыя

А. Настаўнік тлумачыць вучням, што цяпер кожная група прадстаўляе сабою дэпутатаў, аб'яднаных у розныя фракцыі (фракцыі "Вучні", "Бацькі", "Настаўнікі"). На працягу адведзенага часу кожная "фракцыя" павінна вызначыцца, якую пазіцыю яна займае па дадзенаму законапраекту, і выпрацаваць па 5 аргумантаў "за" ці "супраць" прыняцця законапраекта аб забароне знаходжання непаўналетніх на вуліцы ў вызначаны час у залежнасці ад таго, якого пункту гледжання прытрымліваецца тая фракцыя, у якую ўваходзяць вучні.

Б. Пасля сканчэння часу на абмеркаванне і вызначэнне аргументаў настаўнік разбівае "фракцыі" на тры новыя групы ў адпаведнасці з колерам "рожыцаў" (*звярніце ўвагу на тое, каб у кожнай "новай" групе апынуліся хаця б адзін з прадстаўнікоў "старых" групаў*). Настаўнік прапануе новым групам абмяняцца паміж сабою аргумантамі "за" новы закон ці "супраць" яго, і ў выніку абмеркавання прыйсці да кансенсуса (згоды), які б улічваў пазіцыі кожнага з прадстаўнікоў розных фракцый.


*©Грамадскае аб'яднанне «ВІТ»*

В. Пасля сканчэння гэтага практыкавання настаўнік прапануе вучням вярнуцца ў свае "родныя" фракцыі і дае магчымасць абменяцца інфармацыяй, атрыманай у ходзе перамоваў з прадстаўнікамі іншых фракцый. Пасля гэтага настаўнік прапануе вучням унутры фракцыі дакладна вызначыць пазіцыю фракцыі па законапраекту. Настаўнік можа прапанаваць групам-фракцыям выдвінуць прапановы (па 1 ад кожнай групы) па змене законапраекта, калі ў груп з'явілася такое жаданне. Гэтыя прапановы (законапрект ў новай фармудёўцы) запісваюцца пад першапачатковым варыянтам. Пасля гэтага настаўнік праводзіць агульнае галасаванне дэпутатаў (**як сябраў фракцый**) па прапанаваных папраўках да законапраекту. Прымаецца той варыянт, за які прагаласуе найбольшая колькасць "дэпутатаў". *Абавязкова нагадайце вучням, што падчас галасавання яны дэманструюць не сваё ўласнае стаўленне да гэтага законапраекта, а сваю пазіцію як сябра той ці іншай фракцыі.*

*Пасля галасавання і падліку галасоў, падзякуйце вучням за выкананыя ролі, прапануйце ім зняць налепкі і папрасіце іх забыць аб тых ролях, якія яны толькі што адыгрывалі. Можна памяняць вучняў месцамі правесці паўторнае галасаванне па гэтаму законапраекту, але каб на гэты раз вучні выказалі сваю ўласную пазіцыю па прапанаваныму законапраекту.*

5. Абмеркаванне практыкавання настаўнік можа пачаць так: "Зараз мы паспрабавалі паўдзельнічаць у прыняцці закона, як гэта робіцца ў парламенце краіны. Узгадайце, як гэта адбывалася?"

Для накіравання дыскусіі, можна задаць наступныя пытанні:

- як вы сябе адчувалі ў ролі сябраў фракцый?
- як сябе паводзілі сябры фракцый у змяшаных групах (*яны высоўвалі аргументы на карысць законапраекта\ супраць яго, падтрымлівалі пазіцыю сваёй ці іншай фракцыі і чаму*)?
- як паўздзейнічалі аргументы сябраў фракцый падчас апошняга абмеркавання на першапачатковую пазіцыю фракцый?
- якія стадыі прыняцця закона мы прайшлі падчас выканання практыкавання? (*1. унясенне законапраекта на разгляд ў законадаўчы орган; 2. абмеркаванне законапраекта; 2а. унясенне паправак у законапраект; 3. прыняцце закона*)
- якія стадыі прыняцця закона не былі ахоплены на занятку? (*апублікаванне закона*). (*Можна зафіксаваць адказы на дошцы).*


*©Грамадскае аб'яднанне «ВІТ»*

- на якіх з гэтых стадыяў грамадзяне маглі б паўплываць на прымаемае рашэнне? (*для адказу на гэтае пытанне настаўнік просіць вучняў звярнуцца да выкананага хатняга задання па схеме прыняцця закона*)

6. На падсумаванне занятка настаўнік прапануе вучням выказацца па пытаннях:
- што новага вы даведаліся з гэтага занятка?
- ці павінны грамадзяне ўдзельнічаць у прыняцці законаў у дзяржаве?
- на якой са стадыяў заканадаўчага працэсу існуе найбольшая магчымасць уплыву на прыняцце закона з боку грамадзян? (*падчас абмеркавання апошняга пытання добра было б падвесці вучняў да таго, што на самой справе ад актыўнасці грамадзян дзяржавы пад час прыняцця важных рашэнняў залежыць тое, наколькі будуць у гэтых рашэннях улічаныя іх інтарэсы. Канстыуцыя і законы даюць такое права грамадзянам на стадыі заканадаўчай ініцыятывы і абмеркавання законапраекта і праз выбары.*

*Таксама можна ўзгадаць пра спосаб непасрэднага ўдзелу грамадзян у прыняцці законаў - рэферэндум. Спытаць у вучняў  пра апошнія рэферэндумы, якія праводзіліся на Беларусі, якія пытанні на іх выносіліся. Ці лічаць яны рэферэндум эфектыўным спосабам удзелу грамадзян у прыняцці рашэнняў у краіне і чаму?)*

На заканчэнне занятку настаўнік можа яшчэ раз нагадаць вучням, што адносіны ў дзяржаве рэгулююцца законамі, якія прымае спецыяльны орган - Парламент, але грамадзяне ў сваю чаргу могуць мець рэальны ўплыў на прыняцце патрэбных законаў і павінны актыўна выкарыстоўваць гэтае сваё права.

7. Хатняе заданне: прачытаць главу падручніка "**Як выконваецца закон. Абскарджанне дзеянняў службовых асобаў**" і пісьмова выканаць заданні пасля главы.



*©Грамадскае аб'яднанне «ВІТ»*

# ЯК ВЫКОНВАЕЦЦА ЗАКОН. АБСКАРДЖАННЕ ДЗЕЯННЯЎ СЛУЖБОВЫХ АСОБАЎ.

**Мэта занятка**: Навучыцца рэагаваць і абскаржваць неправавыя дзеянні службовых асобаў (чыноўнікаў).

***У выніку занятка вучні:***

*Веды:*
- вызначаць органы і службовых асобаў, да якіх можна звяртацца ў выпадках невыканання закону;
- дадуць вызначэнне заявы і скаргі, а так сама змогуць іх адрозніць.

*Навыкі:*
- змогуць напісаць заяву ці скаргу.

*Каштоўнасці:*
- асэнсуюць вяршэнства закона;
- усвядомяць неабходнасць адстойвання сваіх правоў і інтарэсаў;
- упэўняцца ў неабходнасці выканання закона службовымі асобамі.

**Асноўныя азначэнні:**

**Службовыя асобы**– гэта асобы, якія ва ўстановах, арганізацыях ці на прадпрыемствах займаюць пэўныя пасады і ў абавязкі якіх уваходзіць здзяйсненне дзеянняў, якія маюць юрыдычную сілу, ці па іншаму накіраваных на ўзнікненне, змяненне ці спыненне правоў і абавязкаў грамадзян.

**Заявы** - звароты грамадзян, у якіх утрымліваюцца патрабаванні аб рэалізацыі правоў і законных інтарэсаў.

**Скаргі** - звароты грамадзян, якія ўтрымліваюць патрабаванне аднаўлення іх правоў і законных інтарэсаў, якія былі парушаныя дзеяннем або бяздзеяннем службовых асобаў адпаведных органаў, установаў, арганізацый і прадпрыемстваў.

**Інтэрактыўныя метады:** праца ў групах, аналіз сітуацыі, абмеркаванне.


*©Грамадскае аб'яднанне «ВІТ»*

**Матэрыялы:**

1. Ватман/дошка з тэмай занятку, мэтай і чакаемымі вынікамі
2. Ватман/дошка для напісання асаблівасцяў напісання зваротаў
3. Маркеры

**Час правядзення**: 45′

**План занятка:**

1. Азнаямленне з тэмай і мэтамі занаятка (1′)
2. Чытанне выпадка, прапанаванага у тэксце для вучня (3′)
3. Размова-абмеркаванне (9′)
4. Апытанне па асаблівасцях напісання зваротаў у афіцыйныя ўстановы. (3′)
5. Напісанне заяваў і скаргаў па прапанаванаму выпадку. Абмен сшыткамі з суседам па парце, самаправерка. (15′)
6. Прэзентацыя найбольш спадабаўшыхся (самых цікавых на погляд вучняў) прыкладаў напісаных зваротаў (5′)
7. Падсумаванне (8′)
8. Хатняе заданне (1′)

**Методыка правядзення:**

1. На пачатку настаўнік знаёміць вучняў з тэмай і чакаемымі вынікамі занятка.

2. Пазней для таго, каб сфарміраваць падству для далейшага абмеракавання прачытанага ў хаце матэрыяла па тэме, настаўнік прапануе вучням звярнуцца да змешчанага ў главе выпадка пра экалагічную арганізацыю. Вучням прапануецца яшчэ раз уважліва прачытаць выпадак і ўзгадаць пытанні, на якія яны павінны былі адказаць у хаце.

3. Настаўнік пачынае абмеркаванне прачытаннага з мэтай праверкі хатняга задання і высвятлення ступені разумення тэмы занятка. На абмеркаванне можна задаць наступныя пытанні:
- што адбылося ў прапанаваным для чытання выпадку?
*Тут вучні павінны па кроках растлумачыць хто з'яўляецца дзеючымі асобамі сітуацыі, што адбылося з імі.*


©Грамадскае аб'яднанне «ВІТ»

- якія захады параілі б яны зрабіць арганізатарам дабрачыннага канцэрта у склаўшайся сітуацыі?

*(Вучні могуць прапанаваць наступныя шляхі: праводзіць мерапрыемства без дазволу; зноў звяртацца за дазволам у той жа гарвыканкам; звяртацца са скаргай на дзеянні чыноўніка ў пракуратуру, абскарзіць адмову у выдачы дазвола на правядзенне канцэрта ў суд; звярнуцца за дазволам на правядзенне канцэрта ў аблвыканкам з тлумачэннем прычыны папярэдняй адмовы і інш. Калі вучні не назавуць гэтых варыянтаў, настаўнік можа падказаць ім, накіраваць пытаннямі, а калі ўзнікнуць цяжкасці, проста назваць неназваныя варыянты.)*

- куды можна звяртацца ў выпадках парушэння закону чыноўнікамі і куды трэба звярнуцца ў дадзеным выпадку.

*Вучні павінны паказаць веданне інстанцый, у каторыя можна звяртацца з разнастайным зваротамі. Гэта пракуратура, суд, вышэйпастаўленая інстанцыя ў адносінах да той, у каторую звярталіся папярэдне, міліцыя (залежыць ад сутнасці звароту)*

- якія звароты (заявы ці скаргі) у дадзеным выпадку можна напісаць у розныя інстанцыі? Ад чаго будзе залежыць, што трэба напісаць?

*(Усе звароты, якія ўтрымліваюць паведамленні пра нейкія парушенні з боку службовых асобаў і патрабаванні аб прыняцці адпаведных мер па іх устраненню з'уляюцца па сутнасці скаргамі, нават, калі называюцца заявамі. Заява ў чыстым выглядзе ўтрымлівае толькі патрабавнне аб рэалізацыі правоў (прыняцце на працу, дазвол на ажыццяўленне мерапрыемства).*

*Вучні павінны ўсвядоміць і адказаць, што - заява ці скарга - будзе напісана залежыць ад сутнасці звароту і інстанцыі, ў якую ён накіроўваецца. У прыведзеным казусе, які даецца на разгляд на занятку скарга можа быць напісана ў пракуратуру, вышэйпастаўленаму кіраўніцтву з указаннем на парушэнні, здзейсненыя чыноўнікам. А заява можа быць напісана з мэтай атрымання дазволу на правядзенне недазволенага мерапрыемства ў вышэйшую інстанцыю, ці вышэйпастаўленаму чыноўніку, які мае права вырашэння падобных пытанняў, з указаннем матываў звароту і папярэдняй безпадстаўнай адмовы.*

4. Пасля высвятлення пытанняў па казусу і сутнасці праблемы, неабходна больш падрабязна затрымацца на асаблівасцях пісьмовых зваротаў у афіцыйныя інстанцыі. А менавіта папрасіць вучняў назваць крокі, якія трэба прайсці пры накіраванні пісьмовага звароту: вызначэнне органа, у


©Грамадскае аб'яднанне «ВІТ»

які звяртаемся, напісанне зварота ў адпаведнай форме і згодна з правіламі яго афармлення, рэгістрацыя зварота, тэрмін разгляду (вучні павінны назваць 15 дзён, як агульны тэрмін, і 30 - як спецыяльны), абавязак афіцыйнай установы пры любым зыходзе справы пісьмова паведаміць аб выніках разгляду зварота (для таго, каб мы пазней мелі магчымасць спасылацца на яго).

5. На наступным этапе настаўнік прапануе вучням самастойна напісаць у сшытках зварот у той форме і ў той орган, які, як яны лічаць, зможа дапамагчы ў вырашэнні прапанаванай сітуацыі. Пасля самастойнага выканання задання вучні павінны абмяняцца сшыткамі з суседам па парце для праверкі выкананай працы.

6. Пасля выканання задання настаўнік можа прапанаваць жадаючым вучням зачытаць некалькі прыкладаў найбольш спадабаўшыхся ім зваротаў (не сваіх уласных, а тых якія яны прачыталі). Калі вучні не выкажуць жадання выступіць, можна выклікаць для адказу некалькі чалавек на свой выбар.

*Прыклады заявы і скаргі:*

Адміністрацыя
Кастрычніцкага раёна
г. Гродна

Бохана Івана Рыгоравіча
Праж. Гродна, в. Саленая, 12
Тэл. 1-87-98

заява.

Прашу дазволіць правядзенне 27.06.2001г. дабрачыннага бардаўскага канцэрта з мэтай прыцягнення ўвагі жыхароў горада да праблемы павелічэння колькасці пластыкавага смецця і сбору сродкаў на ўстаноўку спецыяльных сметніц для сартыроўкі смецця.
Арганізатарам з'ўляецца грамадскае аб'яднанне "Экасвет", зарэгістраванае 12.05.1999 Упраўленнем юстыцыі.

12.06.2001
Страшыня праўлення І.Р. Бохан

Пракурору
Кастрычніцкага раёна
г. Гродна

Бохана Івана Рыгоравіча
праж. Гродна, в. Саленая, 12
тэл. 1-87-98

скарга.

12.06.2001 я, як Старшыня праўлення ГА "Экасвет" падаў заяву ў Аддзел культуры Адміністрацыі Кастрычніцкага раёна г. Гродна з просьбай дазволіць правядзенне 27.06.2001г дабрачыннага бардаўскага канцэрту з мэтай прыцягнення ўвагі жыхароў горада да праблемы павелічэння колькасці пластыкавага смецця. 22.06.2001 мы атрымалі адказ: правядзенне канцэрту забаранілі, матывуючы адмову тым, што па заканадаўству патрабуецца ліцэнзія на дабрачынную дзейнасць. Як высветлілася на прыёме ў юрыста ліцэнзія на самой справе ў дадзеным выпадку непатрэбна. Мы як арганізатары дадзенага мерапрыемства панеслі страты, таму, што за пяць дзён да канцэрта было амаль усё падрыхтавана і запрошаны ўдзельнікі.
Прашу прыняць меры, для высвятлення склаўшайся сітуацыі і прыцягнення вінаватых да адказнасці.
28.06.2001
Страшыня праўлення І.Р. Бохан
Дадатак:
1. Адмова


©Грамадскае аб'яднанне «ВІТ»

7. Падсумаванне занятка настаўнік можа правесці ў выглядзе дыскусіі па наступных пытаннях:
- Ці варта і чаму рэагаваць на парушэнні з боку чыноўнікаў?
- Якія могуць быць вынікі, калі грамадзяне не будуць рэагаваць на бяздзеянне чыноўнікаў ці іх незаконныя дзеянні?
*(настаўнік павінен падвесці вучняў да таго, што рэакцыя грамадзян на незаконныя дзеянні службовых асобаў - гэта гарантыя большай празрыстасці працы дзяржаўных органаў, а значыць і лепшай, больш якаснай працы чыноўнікаў і, як вынік, - дасягненне большай дэмакратызацыі і законапаслухмянасці грамадства)*
- Якія складанасці могуць узнікнуць падчас напісання зваротаў (якія складанасці ўзніклі ў вучняў падчас напісання заяваў і скаргаў, і як яны іх вырашалі)?
- Наколькі дзейсным можа быць такі спосаб, як напісанне зваротаў пры парушэннях з боку чыноўнікаў? Як зрабіць яго як мага больш эфектыўным?
*(тут трэба узгадаць усе правілы зваротаў у дзяржаўныя органы і падвесці вучняў да таго, што правільна напісаны і дасланы зварот, а таксама выкананне ўсіх дзеянняў, патрэбных для таго, каб ён не застаўся без увагі, - гэта падстава для дасягнення посьпеху ў гэтай справе. Магчыма таксама нагадаць вучням аб тым, што дзейнічаць лепш за ўсе не па аднаму, а разам з аднадумцамі ці сябрамі.)*
- Якія яшчэ спосабы рэагавання на парушэнні з боку чыноўнікаў можна выкарыстоўваць?
*(вучні могуць назваць разнастайныя грамадскія акцыі - пікеты, мітынгі, страйкі, а таксама ўздеянне на чыноўнікаў праз СМІ. Калі вучні нешта не назавуць настаўнік можа дадаць. Трэба зрабіць акцэнт на тым, што галоўнае - не пакідаць без увагі парушэнні і актыўна ім праціўдзейнічаць і дапамагаць іншым)*

8. Хатняе заданне: прачытаць главу падручніка "**Як можна паўплываць на змену закона**" і пісьмова выканаць заданні пасля главы.


*©Грамадскае аб'яднанне «ВІТ»*

## ЯК МОЖНА ПАЎПЛЫВАЦЬ НА ЗМЕНУ ЗАКОНА

**Мэта занятка:** Вызначыць эфектыўную стратэгію ўплыву на змену ці прыняццё закону, прааналізаваўшы мажлівыя для гэтага шляхі.

***У выніку занятка вучні:***

*Веды:*
- назавуць аргументы "за"і "супраць" адпаведнага закона;
- параўнаюць шляхі ўплыву на змену законаў;
- вызначаць асобаў, праз якіх можна паўплываць па змену і прыняццё законаў;
- ацэняць вынікі розных шляхоў уплыву на змену і прыняццё законаў, а таксама мажлівыя наступствы гэтых крокаў;
- запішуць стратэгіі ўплыву на змену закону і ацэняць іх эфектыўнасць;

*Навыкі:*
- напішуць петыцыю аб змене закону;
- выпрацуюць стратэгію ўплыву на змену законаў;
- выбяруць лепшыя стратэгіі ўплыву на змену законаў;

*Каштоўнасці:*
- зразумеюць важнасць і неабходнасць змены недасканалых законаў і ўдзелу ў гэтым працэсе грамадзян;
- зразумеюць, што можна ўплываць на змену і прыняццё законаў, але для гэтага неабходна быць грамадска актыўным чалавекам.
- адчуюць, што ад кожнага грамадзяніна залежыць будучыня краіны, але гэта дасягаецца актыўнай грамадзянскай пазіцыяй і працай;

**Асноўныя азначэнні:**

**Альтэрнатыўная служба** – магчымасць праходжання вайсковай службы ў выглядзе выканання сацыяльна важнай працы, без зброі ў руках.

**Петыцыя** – форма зварота ў выглядзе ліста з подпісамі ў падтрымку пэўнай прапановы, які дасылаецца ва ўсе ўстановы, што маюць магчымасць паўплываць на вырашэнне той ці іншай праблемы.


*©Грамадскае аб'яднанне «ВІТ»*

**Інтэрактыўныя метады:** праца ў групах, прэс-канферэнцыя, абмеркаванне.

**Матэрыялы:**
1. Ватман/дошка з тэмай занятку, мэтай і чакаемымі вынікамі
2. Дошка/Ватман для напісання стратэгій
3. Крэйда/Маркеры

**Час правядзення**: 45′

**План занятка:**

1. Знаёмства з тэмай, мэтай і чакаемымі вынікамі, уводная дыскусія (3′)
2. Праца над аргументамі па пытанню альтэрнатыўнай службы (5′)
3. Падзел на групы і выпрацоўка стратэгіяў уплыву (12′)
4. Прэс-канферэнцыя (20′)
5. Падсумаванне занятку (4′)
6. Хатняе заданне (1′)

**Методыка правядзення:**

1. На пачатку настаўнік знаёміць вучняў з тэмай і чакаемымі вынікамі занятка.
Затым варта правесці кароткае апытанне. Асноўнай мэтай гэтых пытанняў павінна быць узнаўленне шляхоў уплыву на змену закону; важна, каб вучні ўсведамлялі, 1) што ад кожнага грамадзяніна залежыць, якія будуць у нас законы і якія рашэнні прымаюцца службовымі асобамі, 2) што можна зрабіць у сітуацыях, калі неабходна змяніць закон, 3) набор шляхоў уплыву на змену закону, якія адзначаліся ў падручніку. Можна задаць такія пытанні:
- Ад каго залежыць змена закону? (*ад тых, хто непасрэдна іх прымае, ад чыноўнікаў, ад грамадзян і грамадства*);
- Якім чынам на Беларусі грамадзяне могуць паўплываць на змену закону? (*праз свайго дэпутата, праз уплыў на рашэнні афіцыйных асобаў ці праз правядзенне грамадзянскіх акцыяў, праз сяброўства ў грамадскіх аб'яднаннях ці палітычных партыях*). Можна задаць пытанне, як вучні разумеюць кожны з гэтых шляхоў уплыву.


*©Грамадскае аб'яднанне «ВІТ»*

2. Затым настаўнік нагадвае, што ў хаце вучні мелі заданне папрацаваць над магчымасцю ўплыву на змену закона на прыкладзе зменаў у закон "Аб вайсковай службе" ад 5.11.1992, у частцы ўвядзення альтэрнатыўнай службы на Беларусі. Вучні павінны былі вызначыць аргументы "за" і "супраць" увядзення альтэрнатыўнай службы. Дошка дзеліцца на дзве часткі "за" і "супраць". Праводзіцца апытанне вучняў метадам Раунд Робін (апісанне ў раздзеле **Метады актыўнага навучання**) і адказы запісваюцца на адпаведнай частцы дошкі іх аргументы, скарачаючы сэнс, каб было хутчэй. Аднак не трэба запісваць адказы ўсіх вучняў, бо на гэта не хопіць часу, запішыце па 4-5 адказаў. Аргументаў "за" можа быць болей. Можа быць наадварот. Гэта не павінна быць праблемай для занятку. У дадзенай сітуацыі настаўнік не павінен пераконваць вучняў у тым, што альтэрнатыўная служба – гэта добра ці дрэнна, бо вучні павінны мець свой пункт гледжання. Калі будуць праблемы з аргументамі, дайце свае вырыянты: "за" – *свобода выбару ў дэмакратычнай краіне (запісана ў Канстытуцыі!); вялікае войска нам зацяжка ўтрымліваць; войска павінна быць прафесійнае; падчас альтэрнатыўнай службы маладыя людзі вучацца быць проста добрымі людзьмі, дапамагаючы іншым;*

"супраць" – *прафесійнае войска ўводзіць на Беларусі рана, таму што да гэтага не падрыхтавана заканадаўчая і вайсковая сістэмы; утрыманне прафесійнай арміі дорага абыходзіцца; усе захочуць стаць "альтэрнатыўшчыкамі", а хто будзе служыць?, і г.д.*

3. Праца ў групах. Спачатку даецца заданне (апісанае ніжэй) і затым адбываецца падзел (можна простым пералічэннем да чатырох ці пяці) вучняў на столькі груп, каб у кожнай было па чатыры - пяць чалавек і кожнай групе раздаюцца заданні.

Заданне для груп: Ужываючы аргументы "за" ці "супраць" ўвядзення альтэрнатыўнай службы на Беларусі, якія вучні павінны былі выпрацаваць у хаце, 2 групы (калі настаўнік падзеліць усіх на 4 групы) павінны (кожная – сама па сабе) выпрацаваць стратэгію (паслядоўнасць крокаў) ўплыву на прыняццё зменаў у закон "Аб вайсковай службе" і ўвядзенне альтэрнатыўнай службы, а 2 іншыя групы - "супраць" прыняцця такіх зменаў.

*Павінна атрымацца, што палова вучняў працуе па выпрацоўцы стратэгіі "за" ўвядзенне альтэрнатыўнай службы, а палова - "супраць". Не страшна, калі ў групу, якая выступае "за" патрапяць вучні, якія асабіста - "супраць". Калі з боку гэтых вучняў настаўнік пачуе неахвоту працаваць над такім заданнем, скажыце, што яны павінны вучыцца выпрацоўваць аргументы*


©Грамадскае аб'яднанне «ВІТ»

*як на карысць так і "супраць" нейкіх фактаў і ўмець абараняць сваю пазіцыю ў любых выпадках. Больш таго, у хаце ўсе павінны былі напісаць аргументы і "за" і "супраць", а таксама напісаць прыклад петыцыі. Скажыце вучням адразу, што ў іх вельмі мала часу, але паколькі большасць з неабходных заданняў павінны былі быць выкананыя ў хаце, яны хутка справяцца з заданнем на занятку.*

Кожная група праз 12 хвілін павінна абавязкова мець наступныя вынікі:

а) выбраць найбольш моцныя аргументы ў падтрымку сваёй пазіцыі аб уплыве на змену закону "Аб вайсковай службе" у частцы ўвядзення ці неўвядзення альтэрнатыўнай службы, вызначыўшы, да каго (на якім узроўні) яны будуць звяртацца і што пісаць;

б) выбраць адну найлепшую петыцыю з ліку напісаных у хаце ўдзельнікамі групы (да адпаведнай службовай асобы і тых установаў, якія група палічыць важнай) і падрыхтаваць яе да прэзентацыі (можа, ізноў запісаць, напрыклад, нешта змяніўшы);

в) прадумаць і **запісаць** на паперы (дошцы, асобным ватмане) паслядоўнасць усіх крокаў, скіраваных на аказанне найбольшага ўплыву на ўвядзенне (ці неўвядзення) альтэрнатыўнай службы, пралічыўшы, што ў дадзеных абставінах будзе найбольш эфектыўным;

Такім чынам, у кожнай групы атрымаецца свая пакрокавая стратэгія "за" ці "супраць" змены закону. Абавязкова адзначце, што кожная група павінна выбраць аднаго чалавека, які пазней будзе прэзентаваць стратэгію сваёй групы.

4. Прэс-канферэнцыя. Бліжэй да дошкі пастаўце два сталы і тварам да залы пасадзіце за іх чатырох выступоўцаў (мы зыходзім з таго, што ў сярэднім груп будзе 4, і па аднаму выступоўцу ад кожнай). На прэзентацыю кожнаму выступоўцу адводзіцца не больш за 3 хвіліны. Гэта мала, але яны павінны імкнуцца ўкласціся. Скажыце, што ўсе іншыя вучні больш не прадстаўляюць свае групы (акрамя чатырох, што сядзяць наперадзе за сталамі), а прысутнічаюць на прэс-канферэнцыі, дзе будуць заслуханыя чатыры прапановы – пакрокавыя стратэгіі (2 – "за" і 2 – "супраць" увядзення альтэрнатыўнай службы на Беларусі). Задача выступоўцаў – на працягу 3 хвілін прадставіць **стратэгію** сваёй групы, і –


*©Грамадскае аб'яднанне «ВІТ»*

найважнейшае! – адзначыць, у чым жыццяздольнасць/эфектыўнасць гэтай стратэгіі і якіх канкрэтных вынікаў яна можа дасягнуць. Такім чынам, кожны з чацвёркі павінен прадставіць **план** сваіх дзеянняў, каротка абгрунтаваўшы яго (а таксама зачытаць петыцыю ці іншы зварот).
Задача ўсіх прысутных – слухаць уважліва і адзначаць, якая стратэгія – найлепшая і самая выніковая (перспектыўная), і чаму. Пасля кожнага выступа вучні, якія знаходзяцца ў зале, змогуць задаць па 2-3 пытанні на ўдакладненне пазіцыі кожнага выступоўцы

**Увага!** Нагадайце яшчэ раз удзельнікам прэс-канферэнцыі, што на абмеркаванне выносіцца менавіта **стратэгія** па змене закона, а не плюсы і мінусы альтэрнатыўнай службы. Гэтая пытанне можна было б абмеркаваць на іншым занятку з іншымі мэтамі. Мэта ж гэтага занятку - абмеркаванне эфектыўных шляхоў уплыва на змену закона.

*Пасля сканчэння прэс-канферэнцыі трэба падзякаваць удзельнікам прэс-канферэнцыі і вывесці іх з роляў (напрыклад апладысментамі).*

5. У падсумаванне можна задаць наступныя пытанні:
- Што новага вы даведаліся з сёняшняга занятка?
- Чаму неабходна змяняць закон? (*яны часта бываюць састарэлымі ці неправавымі*);
- Якія з крокаў уплыву (альбо якія прапанаваныя стратэгіі) здаліся вам найбольш эфектыўнымі і чаму/якія ёсць плюсы і мінусы…? (*трэба ўплываць на змену закона, стасуючы ўсе метады адразу, бо вынік нашай працы па змене закона (ці любога іншага важнага для нас рашэння) залежыць толькі ад канкрэтнага выпадка, ўзроўня прыняцця рашэння і нашай актыўнай грамадзянскай пазіцыі*);
- Які найбольш верагодны вынік ўжывання вышэйпрадстаўленых стратэгіяў? Што рабіць, калі стратэгія ўплыву не спрацавала? (*не пакладаць рукі, выпрацоўваць іншую стратэгію*);
- Ці выкарыстоўваюць беларускія грамадзяне сваё канстытуцыйнае права ўплыву на змену альбо прыняццё закону? Чаму? (*вельмі рэдка, нажаль, таму, што яны не ведаюць, як і што можна для гэтага рабіць*);
- Ці ведаюць вучні прыклады, калі простыя грамадзяне, як мы з вамі, паўплывалі ці спрабавалі паўплываць (паспяхова ці не) на змену закону?" (*так, папрасіце прывесці прыклад/ы або прывядзіце іх самі – у 2001 г. маладзёжнымі арганізацыямі былі праведзены слуханні па*


©Грамадскае аб'яднанне «ВІТ»

*праекту "Закона аб адукацыі" і шэраг прапанаваных зменаў быў унесены ў закон*).

Часу можа не хапіць на ўсе пытанні падсумавання, таму настаўнік павінен выбраць найбольш важныя з іх, якія паспрыяюць падвышэнню грамадскай актыўнасці вучняў.

Напрыканцы можна зрабіць агульны вынік пра тое, што каб нешта змяніць ці на нешта паўплываць, трэба быць актыўным грамадзянінам сваёй дзяржавы і шмат працаваць на карысць зменаў, бо "пад ляжачы камень вада не цячэ".

6. Хатняе заданне: прачытаць главу падручніка "**Зварот да юрыста**" і пісьмова выканаць заданні пасля главы.



*©Грамадскае аб'яднанне «ВІТ»*

# ЗВАРОТ ДА ЮРЫСТА

**Мэта занятка:** Вызначыцца, як і дзе знайсці кваліфікаваную прававую дапамогу і як сябе паводзіць на прыёме ў юрыста.

***У выніку занятка вучні:***

*Веды:*
- дадуць азначэнне юрыдычнай дапамогі;
- назавуць арганізацыі якія займаюцца прававой дапамогай насельніцтву;
- вызначаць, у якіх выпадках можна звяртацца да юрыста;
- пералічаць правілы прыёма і паводзінаў на прыёме ў юрыста.

*Навыкі:*
- вылучаць прызнакі кваліфікаванай кансультацыі;
- навучацца паводзіць сябе на прыёме ў юрыста.

*Каштоўнасці:*
- усвядомяць вартасць кваліфікаванай прававай дапамогі для абароны сваіх правоў і інтарэсаў.

**Асноўныя азначэнні:**

**Юрыдычная дапамога -** кваліфікаваная дапамога ў складаных прававых сітуацыях, якую аказываюць грамадзянам і арганізацыям на падставе іх зварота спецыялісты, якія маюць юрыдычную адукацыю і працуюць па спецыяльнасці, ці па-іншаму - юрысты.

**Інтэрактыўныя метады:** праца ў групах, абмеркаванне, ролевая гульня з назіральнікамі, дыскусія "вольны стул", удзел рэсурснай асобы.

**Матэрыялы**:
1. Ватман/дошка з тэмай занятку, мэтай і чакаемымі вынікамі
2. Падручнік для вучня
3. Чысты ватман ці дошка
4. Два маркеры рознага колеру ці крэйда

**Час правядзення**: 45':


©Грамадскае аб'яднанне «ВІТ»

**План занятка**:
1. Факусіроўка, прадстаўленне рэсурснай асобы, тлумачэнне тэмы занятка і чакаемых вынікаў – 2′
2. Знаёмства з выпадкам і яго абмеркаванне – 4′
3. Кіруемая дыскусія "вольны стул" з удзелам рэсурснай асобы – 12′
4. Падрыхтоўка да ролевай гульні і раздача заданняў назіральнікам – 2′
5. Правядзенне ролевай гульні з удзелам рэсурснай асобы – 8′
6. Агульнае падсумаванне ролевай гульні і яе абмеркаванне – 12′
7. Пытанні да рэсурснай асобы, яго/яе каментар ролевай гульні – 3′
8. Падсумаванне занятка – 1′
9. Хатняе заданне – 1′

***Увага!*** *На дадзены занятак варта запрасіць так званую рэсурсную асобу, якая дапаможа правесці занятак, выступаючы ў ролі эксперта па тэме занятка. Задача рэсурснай асобы: даць кваліфікаваную прававую інфармацыю вучням па тэме дадзенага занятка. Рэсурснай асобай на дадзеным занятку могуць быць адвакаты, якія працуюць у калегіі адвакатаў, юрысты, якія займаюцца прыёмам грамадзян ці прадстаўнікі грамадскіх аб'яднанняў, якія займаюцца прававой дапамогай насельніцтву. Перад заняткам неабходна сустрэцца з рэсурснай асобай для таго, каб патлумачыць, што канкрэтна Вы чакаеце ад яго/яе, патлумачыць ход занятку і ролю рэсурснай асобы на ім.*

*На дадзеным занятку рэсурсная асоба будзе выконваць наступныя ролі:*

*А) <u>Удзельніка дыскусіі "вольны стул"</u> (п. 3 Плана занятка), дзе будзе абмеркоўвацца працэс падрыхтоўкі Пятра і Аляксея да кансультацыі і выбара месца, дзе можна атрымаць кансультацыю. Патлумачце рэсурснай асобе, што падчас дыскусіі не варта "забіваць эфір" і адказваць на ўсе пытанні, якія будуць ставіцца настаўнікам. Рэсурснай асобе варта выступаць па тых пытаннях, якія не закраналіся вучнямі, асвятляліся няпоўна, альбо няправільна, а таксама з нейкімі практычнымі парадамі для вучняў па працэсу падрыхтоўкі да прыёма ў юрыста.*

*Б) <u>Юрыста, які праводзіць прыём</u> Пятра і Аляксея па іх праблеме падчас ролевай гульні (п. 5 Плана). Рэсурснай асобе варта правесці стандартную кансультацыю кліентаў, якая праводзіцца адвакатамі на прыёмах. Варта задаваць стандартныя пытанні, якія звычайна задаюцца падчас*


©Грамадскае аб'яднанне «ВІТ»

*кансультацый, разам з выкананнем усіх фармальнасцей, запаўненнем папераў і г.д., паводзіць сябе натуральна і як мага больш набліжана да жыцця. Важна каб вучні адчулі і зразумелі, што такое кансультацыя, што і як там адбываецца.*

*В) Эксперта па пытаннях падрыхтоўкі да прыёма і па пытаннях прыёма ў юрыста (п.п. 6,7 Плана). Выконваючы дадзеную ролю, рэсурснай асобе варта адказваць на пастаўленыя настаўнікам і вучнямі пытанні праўдзіва і як мага больш набліжана да практыкі.*
*Не варта зацягваць час, ці даваць вельмі разгорнутыя тлумачэнні. Варта даваць кароткія, лаканічныя, практычныя, а не тэарэтычныя адказы.*
*Перад заняткам варта было б азнаёміць рэсурсную асобу з матэрыяламі вучняў для чытання па дадзенаму занятку (гл. Падручнік для вучня "Зварот да юрыста").*
*Знайсці рэсурсную асобу можна патэлефанаваўшы ў даведку і атрымаўшы тэлефоны калегіі адвакатаў у вашым населенным пункце і дамовіўшыся са старшынёй калегіі адвакатаў, які можа прапанаваць адваката на Ваш занятак. Другім шляхам можа быць пошук юрыста праз бацькоў вучняў ці Вашых знаёмых. У выпадку, калі рэсурсную асобу на дадзены занятак знайсці не атрымаецца, ролю рэсурснай асобы павінен будзе выконваць сам настаўнік.*

**Методыка правядзення:**

1. На пачатку настаўнік знаёміць вучняў з тэмай і чакаемымі вынікамі занятка.

Для засяроджвання ўвагі вучняў на тэме занятка (факусіроўкі) настаўнік можа задаць наступныя пытанні:
- Што такое юрыдычная дапамога? (*гл. Асноўныя азначэнні*)
- Хто і ў якіх выпадках можа аказваць юрыдычную дапамогу? (*гл. п. Б главы падручніка "Зварот да юрыста" Табліца 1*)
- Ці звяртаўся нехта з вучняў да юрыста і па якой прычыне? (*тут вучні самі назваць жыццёвыя сітуацыі, з якімі яны самі сутыкаліся ці ім, проста што-небудзь вядома. Калі ў вучняў узнікнуць цяжкасці, настаўнік сам можа прывесці нейкі прыклад*).

Пасля адказаў на пытанні настаўніку лёгка будзе перайсці да кароткага прадстаўлення госця (рэсурснай асобы) і вытлумачэння яго ролі на


©Грамадскае аб'яднанне «ВІТ»

дадзеным занятку. Не варта зацягваць знаёмства з рэсурснай асобай, бліжэй можна будзе пазнаёміцца ў працэсе самога занятка.

2. А) Настаўнік прапануе, каб вучні звярнуліся да выпадка з Пятром і Аляксеем, які ўтрымліваецца ў падручніку для вучняў і праглядзелі яго яшчэраз.

- Б) Пасля гэтага варта ўдакладніць у вучняў сутнасць канфлікта, бакі канфлікта, што дапаможа вучням зарыентавацца ў сутнасці выпадку і дакладна акрэсліць для сябе, з-за чаго ўзнік канфлікт. (*Сутнасць канфлікта – у тым, што брыгадзір абяцаў хлопцам за працу пэўную сумму грошай, а заплаціў у два разы менш, чым і выклікаў незадаволенасць маладзёнаў. Асноўнымі бакамі канфлікта з'яўляюцца з аднаго боку Пётар і Аляксей, а з другога – брыгадзір).* Пасля аднаўлення падрабязнасцей здарэння, папрасіце вучняў адказаць на пытанне:
- Што вы б параілі Пятру і Аляксею зрабіць у гэтай сітуацыі? *(дайце вучням свабодна выказацца, не фіксуйце адказы)*

4. А) Варыянты вырашэння прадстаўленай праблемнай сітуацыі настаўнік прапануе абмеркаваць на наступным этапе занятку. Настаўнік тлумачыць, што кожны з вучняў павінен самастойна падумаць, куды павінны звярнуцца хлопцы па дапамогу і якім чынам яны павінны падрыхтавацца да прыёма ў юрыста (неважна якой установы). Абмеркаванне дадзеных пытанняў будзе адбывацца ў выглядзе дыскусіі, у якой рэсурсная асоба грае ролю <u>ўдзельніка дыскусіі</u>, і на яго/яе распаўсюджваюцца ўсе правілы метада, які ужываецца для правядзення абмеркавання.

Б) Для правядзення практыкавання настаўнік павінен дакладна растлумачыць прынцыпы працы дыскусіі "вольны стул". Асноўнае адрозненне дадзенага тыпу дыскусіі ад іншых заключаецца ў тым, што адначасова ўдзел у дыскусіі могуць браць толькі некалькі ўдзельнікаў, якія сядзяць на спецыяльна выстаўленых у кола, напрыклад, 5 стуллях, прычым ніхто з удзельнікаў не можа займаць месца ва ўнутраным коле напрацягу ўсёй дыскусіі, у тым ліку гэта тычыцца рэсурснай асобы. Пасля таго, як удзельнік выказаўся па нейкай праблеме, ён вызваляе месца для іншых. Для правядзення дыскусіі "вольны стул" могуць быць розныя варыянты арганізацыі працоўнай прасторы:


©Грамадскае аб'яднанне «ВІТ»

1. Калі дазваляюць умовы класа, крэслы ставяцца ў два кола - ўнутранае і знешняе (*у абодвух колах крэслы павінны быць павёрнуты ў цэнтр, так што знешняе кола будзе "глядзець" унутранаму "у спіну"*). Для гэтага трэба падрыхтаваць клас да занятка (перасунуць парты, расставіць стулля і г.д.).
2. Можна паставіць некалькі стулляў перад класам на свабодным месцы (напрыклад перад дошкай такім чынам, каб удзельнікам зручна было дыскутаваць паміж сабой), тады ролю знешняга кола будуць выконваць месцы за партамі.

Толькі ўдзельнікі, якія сядзяць на стуллях унутранага кола (ці не за партамі, як у другім варыянце) маюць права весці дыскусію, ці адказваць на пытанні, усе астатнія з'яўляюцца назіральнікамі. Калі некаму з назіральнікаў захочацца выказацца, то ён зможа гэта зрабіць, толькі заняўшы свабоднае месца на стуле ўнутранага кола. Калі ўсе стулля занятыя, то вучань павінен пачакаць, пакуль адзін ці некалькі ўдзельнікаў выйдуць з унутранага кола і займуць свае месцы ў знешнім. Калі па нейкіх прычынах дадзены метад немагчыма ўжыць, гэтую частку занятка можна правесці пры дапамозе любога іншага тыпу дыскусіі найбольш прыдатнага у вашых умовах. Асноўная задача дадзенай часткі занятка – навучыцца знаходзіць месцы, куды можна было б звярнуцца ў падобнай ці іншай сітуацыі з прававой праблемай і навучыцца рыхтавацца да сустрэчы з юрыстам.

Абмеркаванне варта пабудаваць вакол наступных пытанняў, якія задаюцца па чарзе з прадастаўленнем часу на абмеркаванне кожнага:

- Куды Пятру і Аляксею можна звярнуцца за дапамогай ў дадзенай сітуацыі?
- Дзе Пятру і Аляксею можна знайсці адрас і тэлефон установы, органа ці арганізацыі, дзе можна знайсці прававую дапамогу?
- Што трэба зрабіць, каб падрыхтавацца да кансультацыі? Ці варта гэта рабіць і нашто?
- Як даведацца, што гэта кансультацыя з'яўляецца кваліфікаванай і вартай даверу?
- Што трэба рабіць і як сябе паводзіць на сустрэчы з юрыстам?

Адказы на дадзеныя пытанні можна знайсці ў падручніку для вучня глава "Зварот да юрыста".


©Грамадскае аб'яднанне «ВІТ»

**Варыянт**. *Можна замест вышэй акрэсленых пытанняў для дыскусіі вучням даваць асобныя тэзісы (па кожнаму з пытанняў), вакол якіх будаваць дыскусію, карэктуючы яе ход пытаннямі. Напрыклад:*
*Тэзіс: "Найлепшым у дадзеных умовах для Пятра і Аляксея будзе звярнуцца са скаргай да пракурора".*
*Пытанні: Ці лічыце вы што гэты спосаб будзе найлепшым? Чаму вы так лічыце? Якіх наступстваў могуць чакаць Пётр і Аляксей, звярнуўшыся ў пракуратуру? Куды яшчэ можна параіць ім звярнуцца? Чаму? Якія наступствы будуць ад таго, што яны туды звернуцца? Дзе Пятру і Аляксею можна знайсці адрас і тэлефон установы, органа ці арганізацыі дзе можна знайсці прававую дапамогу?*

4. Наступны этап занятку пабудваны ў выглядзе ролевай гульні, для атго, каб вучні змаглі адчуць на ўласным досведзе і пабачыць, якім чынам праходзяць юрыдычныя кансультацы, і як працу юрыст. Для правядзення ролевай гульні настаўнік павінен вызначыць двух ці трох (у залежнасці ад таго, ці ўдзельнічае ў занятку рэсурсная асоба) дзеючых асобаў. Можна прапанаваць вучням вызначыцца самастойна, хто хоча паўдзельнічаць у ролевай гульне. Калі не знойдзецца жадаючых, тады прызначыць па свайму меркаванню. Трэба дакладна патлумачыць абавязкі і заданні рэсурснай асобе і двум дабраахвотнікам. Таксама неабходна патлумачць іх ролю астатнім вучням класа, якія будуць назіраць за гульнёй.

<u>Заданне для рэсурснай асобы:</u> "Вы юрыст калегіі адвакатаў і да Вас на прыём з'явіліся Пётр і Аляксей. Правядзіце кансультацыю з імі".

<u>Заданні для Пятра і Аляксея:</u> "Вы прыйшлі ў калегію адвакатаў для атрымання кваліфікаванай кансультацыі па Вашай праблеме. Паўдзельнічайце ў кансультацыі."

<u>Заданне для назіральнікаў:</u>
Уважліва назірайце за ўдзельнікамі сцэнкі і зафіксуйце адказы на наступныя пытанні на картцы (у сшытку):
1) Вызначце як сябе паводзілі Пётр і Аляксей?
2) Як сябе паводзіў юрыст?
3) Якія пытанні задаваў юрыст?
4) Ці была гэтая кансультацыя кваліфікаванай, па якіх прыкметах вы гэта вызначылі?


*©Грамадскае аб'яднанне «ВІТ»*

Пытанні для назіральнікаў настаўніку варта запісаць на ватмане ці дошцы. *Калі ёсць тэхнічная магчымасць, можна зрабіць карткі назіральнікаў з пытаннямі, каб вучні адразу ўпісывалі свае адказы на іх.*

5. Правядзіце ролевую гульню. *З правіламі правядзення і мадэлявання ролевай гульні можна пазнаёміцца ў раздзеле **Метады актыўнага навучання.** Для гэтага занятка абярыце самы просты варыянт правядзення гульні, калі частка вучняў разыгрывае сцэнку, а астатнія з'яўляюцца гледачамі* . Рэсурсная асоба будзе выступаць на гэтым этапе занятка ў ролі юрыста, які вядзе прыём грамадзян.

6. Перад падсумаваннем гульні падзякуйце вучням, якія гралі ролю хлопцаў, і рэсурснай асобе за ўдзел у практыкаванні і выведзіце ўдзельнікаў практыкавання з роляў апладысментамі, ці іншым чынам адзначыўшы, што яны больш не Пётр і не Аляксей.

На падсумаванне практыкавання варта задаць наступныя пытанні:
- Як сябе адчувалі падчас кансультацыі юрыст, вучні ў ролі кліентаў, назіральнікі?
- Ці была гэтая сітуацыя блізкая да рэальнай? Калі так, то што паказвала на рэальнасць? Калі не, то што варта было б змяніць, каб гэтая сітуацыя стала падобнай на рэальную?
- Якія пытанні задаваў юрыст?
- Для чаго юрыст задаваў гэтыя пытанні?
- Як сябе паводзілі "кліенты"? Што можна было б змяніць у іх паводзінах?

Пасля таго, як усе жадаючыя ўдзельнікі выкажуцца па асобнаму пытанню, варта яго задаць і рэсурснай асобе, дзе яна будзе выступаць у якасці эксперта. Добра, калі рэсурсная асоба адзначыць тое, што вучні рабілі добра падчас правядзення ролевай гульні.

7. Пытанні вучняў і настаўніка да рэсурснай асобы. Тут рэсурсная асоба таксама будзе выступаць у ролі эксперта. Спачатку рэсурснай асобе варта зрабіць каментар таго, што адбылося на дадзеным занятку па пытаннях:
- Месцы, куды можна звяртацца па прававую дапамогу;
- якія вынікі можна атрымаць ад звароту ў гэтыя ўстановы;
- як рыхтавацца да кансультацыі;
- як паводзіць сябе на кансультацыі;
- як вызначыць, што вы атрымалі кваліфікаваную дапамогу;


©Грамадскае аб'яднанне «ВІТ»

Сярод іншых рэсурснай асобе можна задаць практычныя пытанні:
- Як дамовіцца пра сустрэчу на кансультацыю?
- Што трэба рабіць Пятру і Аляксею пасля гэтай кансультацыі?
- Якія паперы трэба прынесці на кансультацыю? і г.д.

Пры задаванні пытанняў рэсурсная асобе не варта паўтарацца, калі гэтыя пытанні ўжо асвятляліся на працягу занятка. Калі застаецца час, лепш даць магчымасць вучням самім задаваць пытанні рэсурснай асобе.

8. На падсумаванне варта задаць пытанні па асноўных аспектах занятка:
- Што новае вы даведаліся з дадзенага занятка?
- Што такое юрыдычная дапамога?
- Якія арганізацыі аказваюць прававую дапамогу насельніцтву і як іх знайсці?
- У якіх выпадках трэба звяртацца да юрыста?
- Якія правілы прыёма і паводзінаў на прыёме ў юрыста вы ведаеце?

9. Хатняе заданне: прачытаць главу падручніка "**Судовая абарона**" і пісьмова выканаць заданні пасля главы.


*©Грамадскае аб'яднанне «ВІТ»*

## СУДОВАЯ АБАРОНА

**Мэта занятка:** Пазнаёміцца з асноўнымі правіламі судовага спосаба вырашэння канфліктаў.

***У выніку занятка вучні:***

*Веды:*
- дадуць азначэнне судовага працэса;
- назавуць прынцыпы судовага разбіральніцтва;
- назавуць бакі ў грамадзянскім працэсе.

*Навыкі:*
- вызначаць узровень і спецыялізацыю суда, у які трэба пры неабходнасці звяртацца;
- вызначаць парушэнні асноўных прынцыпаў судовага разбіральніцтва;
- складуць і прадстваць аргументы;
- выступяць публічна.

*Каштоўнасці:*
- зразумеюць неабходнасць вяршэнства закона;
- ушануюць каштоўнасць справядлівага працэса.

**Асноўныя азначэнні:**

**Правасуддзе** – гэта від дзяржаўнай дзейнасці, накіраванай на разгляд і вырашэнне грамадскіх канфліктаў, звязаных з парушэннем прававых норм, якое ажыццяўляецца падчас судовага разбіральніцтва.

**Іск** – заява зацікаўленай асобы, якая ўтрымлівае патрабаванне абароны парушаных правоў у судовым парадку. З'яўляецца падставай для прынацця да разгляду справы аб абароне парушаных правоў у судзе.

**Ісцец** – зацікаўаленная асоба, правы якой парушаныя і якая звяртаецца за іх абаронай у суд.

**Адказчык** – асоба, якая ўказваецца ісцом у іскавой заяве як парушальнік яго правоў.


*©Грамадскае аб'яднанне «ВІТ»*

**Касацыйная скарга** – іскавая заява, якая падаецца ва ўсталяваным парадку у суд другой інстанцыі (гл. іерархію судоў у адпаведнасці з адміністратыўна-тэрытарыяльным падзелам краіны у падручніку для вучняў) пры нязгодзе аднаго з бакоў судовага разбіральніцтва з рашэннем суда першай інстанцыі.

**Інтэрактыўныя метады:** праца ў групах, аналіз сітуацыі, абмеркаванне.

**Матэрыялы**:
1. Ватман/дошка з тэмай занятку, мэтай і чакаемымі вынікамі
2. Падручнік для вучня
3. Чыстыя аркушы ватмана (па колькасці груп) ці дошка
4. Маркеры рознага колеру ці крэйда

**Час правядзення**: 45′:

**План занятка:**

1. Знаёмства з тэмай і чакаемымі вынікамі занятка (1′)
2. Паўтор казуса (першая частка), аднаўленне фактаў. Пытанні: (10′)
3. Абмеркаванне прынцыпаў судовага разбіральніцтва.(5′)
4. Другая частка казуса. Пытанні.(3′)
5. Праца ў групах па вызначэнню аргументаў для касацыйнай скаргі (12+5′)
6. Прэзентацыя вынікаў працы ў групах (10′)
7. Падсумаванне занятку: (4′)
8. Хатняе заданне (1′)

**Методыка правядзення:**

1. На пачатку настаўнік знаёміць вучняў з тэмай і чакаемымі вынікамі занятка.

2. Далей настаўнік прапануе вучням узгадаць праблемную сітуацыю сп. Кашука, з якой яны азнаёміліся ў хаце і вызначыць факты справы. Вучні павінны аднавіць першую частку казуса, у якой ідзе апісанне толькі самага канфлікта да зварота ў суд. Пытанні, якія можна задаць на аднаўленне фактаў справы:
- Што адбылося?


©Грамадскае аб'яднанне «ВІТ»

- Хто задзейнічаны ў справе?
- У які суд павінен звярнуцца сп. Кашук (тып справы, узровень)? (пачынаючы з гэтага пытання адказы лепш запісваць на ватмане ці дошцы) (*гэта грамадзянская справа, сп. Кашук павінен звярнуцца у суд па грамадзянскім справам раёна, у якім пражывае сп. Пецук*);
- Што павінна было адбыцца для таго, каб гэтая справа стала крымінальнай? (*Васіль павінен быў, напрыклад, нешта скрасці ў суседскім двары, ці пакалечыць каго-небудзь паваліўшымся плотам*);
- Што павінна было б адбыцца, каб гэтая справа стала адміністрацыйнай? (*Васіль мог аблаяць сп. Кашука, а гэта будзе адміністратыўным парушэннем - Абраза*)
- У якіх судах тады б разглядалася гэтая справа? (*у крымінальным судзе і адміністрацыйным суддзей адпаведна*)

3. Далей настаўнік звяртаецца да прынцыпаў судовага працэса. Абмеркаваць іх можна з дапамогай наступных пытанняў да вучняў:
- Што такое судовы працэс? (*гл. Асноўныя азначэнні*)
- Якія прынцыпы судовага праэцеса вы ведаеце? (*Здзяйсненне правасуддзя толькі судом і на падставе спаборнасці і роўнасці бакоў у працэсе, незалежнасць суддзяў і падпарадкаванне іх толькі закону, галоснасць судовага разбіральніцтва. Іншыя можна паглядзець у Громадзянска-працэсуальным і Крымінальна-працэсуальным кодэксах*)
- У чым сутнасць кожнага з прынцыпаў? (*настаўнік можа прапаноўваць прынцыпы па чарзе для таго, каб вучні змаглі назваць прыкметы кожнага з прынцыпаў па-асобку. Можна папрасіць вучняў таксама прывесці прыклады таго, як яны разумеюць сутнасць прынцыпаў. Апісанне прынцыпаў гл. Падручнік глава "Судовая абарона"*)

4. Наступны этап занятка пачынаецца з аднаўлення другой часткі казуса. Вучні павінны ўзгадаць, што адбылося з героямі гісторыі пасля звароту ў суд. Настаўніку прапануецца задаць такія пытанні:
- Ці былі здзейснены парушэнні і якія? *Якія прынцыпы былі парушаныя? (Незалежнасць суддзяў (сябар папрасіў вырашыць справу на карысць адказчыка); прынцып спаборнасці і роўнасці бакоў працэса (суддзя пагражаў Васілю, не даў выступіць у судзе бацке Васіля); прынцып галоснасці (суддзя безпадстаўна абвясціў працэс зачыненым)*)


©Грамадскае аб'яднанне «ВІТ»

- Што можа зрабіць у такім выпадку пацярпелы бок – сп. Пецук (*зварнуцца у вышэйшую інстанцыю з патрабаваннем перагляду справы на падставе таго, што рашэнне было вынесена з парушэннем закона*).

5. Пасля высвятлення магчымасці зварота ў вышэйшую інстанцыю для абскарджання неправамернага прысуду настаўнік прапануе вучням у групах папрацаваць над выпрацоўкай аргументаў для напісання **касацыйнай скаргі**. Настаўнік павінен звярнуць увагу вучняў, што касацыйная скарга пішацца звычайна юрыстам, па форме падобная на звычайную скаргу і павінна адпавядаць усім патрабаванням, якія прад'яўляюцца да заваротаў, якія былі разгледжаны на папярэдніх занятках. Далей адбываецца падзел на групы па 4-5 чалавек. Пасля таго, як групы рассядуцца на свае месцы настаўнік дае заданне: на працягу адведзенага часу групы павінны будуць вызначыць аргументы, якія можна выкарыстаць пры напісанні касацыйнай скаргі *(гэта павінны быць спасылкі на парушэнні прынцыпаў судовага разбіральніцтва і іншых парушэнняў, здзейсненых суддзёй Ярашуком падчас вырашэння справы Васіля)*, а таксама групы павінны адзначыць, якія дакументы павінны быць дададзены да скаргі (*рашэнне суда першай інстанцыі*). Вынікі сваёй працы групы павіны зафіксаваць на дошцы, ватмане ці ў сшытках.

6. Пасля сканчэння часу на працу ў групах адбываецца прэзентацыя яе вынікаў. Настаўнік можа прапанаваць групам выступаць у адвольным парадку, можа прызначыць, хто за кім выступае, можа прапанаваць цягнуць лёсы. Для таго, каб скараціць час празентацыі, настаўнік можа прапанаваць цалкам прадэманстраваць вынікі сваёй працы толькі адной групе (па жаданню), а астатнім - толькі дапоўніць тое, што ў іх працах адрозніваецца. Пасля сканчэння прэзенатцый, настаўнік дзякуе групам за працу і прапануе ім вярнуцца на свае месцы для падвядзення вынікаў занятка. Калі вучні пісалі адказы ў сшытках, можна сабраць іх і праверыць напрацоўкі групаў.

7. На падсумаванне занятка варта задаць наступныя пытанні:
- Што новага вы даведаліся з гэтага занятку?
- Што такое судовая працэдура?
- Якія прынцыпы судовага працэса існуюць?
- Што можна рабіць у выпадку парушэнняў закона падчас судовых разбіральніцтваў?


*©Грамадскае аб'яднанне «ВІТ»*

- Якія плюсы і мінусы вы можаце назваць судовага шляху вырашэння канфліктаў? *(Можна гэта пытанне пакінуць на дом для дамашняй працы вучняў у выглядзе невялікага эсэ).*

8. Хатняе заданне: прачытаць главу падручніка "**Вырашэнне канфліктаў**" і пісьмова выканаць заданні пасля главы.


*©Грамадскае аб'яднанне «ВІТ»*

## ВЫРАШЭННЕ КАНФЛІКТАЎ

**Мэта занятка:** Пазнаёміцца з несудовымі спосабамі вырашэння канфліктаў.

***У выніку занятка вучні:***

*Веды:*
- вызначаць сутнасць канфлікта;
- назавуць крокі ўрэгулявання канфлікта;
- пералічаць розныя спосабы вырашэння канфліктаў.

*Навыкі:*
- вызначаць крокі вырашэння канфлікта;
- выбяруць найлепшы спосаб вырашэння канфлікта ў залежнасці ад сітуацыі.

*Каштоўнасці:*
- адчуюць важнасць імкнення да мірнага ўрэгулявання спрэчак.

**Асноўныя азначэнні:**

**Канфлікт** – сутыкненне супрацьлеглых інтарэсаў, поглядаў; сур'ёзнае рознагалоссе, вострая спрэчка.

**Прававы канфлікт** – сутыкненне супрацьлеглых інтарэсаў, заснаваных на парушэнні нормаў права і правоў асоб, якія ўдзельнічаюць у канфлікце.

**Інтэрактыўныя метады:** праца ў групах, абмеркаванне, дыскусія, аналіз сітуацыі

**Матэрыялы:**
1. Ватман/дошка з тэмай занятку, мэтай і чакаемымі вынікамі
2. Ватманы па колькасці груп для падрыхтоўкі і прэзентацыі ці дошка і крэйда
3. Маркеры розных колераў для працы ў групах
4. Падручнік


*©Грамадскае аб'яднанне «ВІТ»*

**Час правядзення**: 45':

**План занятка:**
1. Знаёмства з тэмай (1')
2. Аднаўленне казуса (5')
3. Вызначэнне пазіцый бакоў (5')
4. Узгадванне спосабаў вырашэння канфліктаў (4')
5. Праца ў групах па вызначэнню спосабаў вырашэння канфлікта Кашука і Пецука (15')
6. Прэзентацыя вынікаў працы ў групах (10')
7. Падсумаванне занятка (5')

**Методыка правядзення:**

1. На пачатку настаўнік знаёміць вучняў з тэмай і чакаемымі вынікамі занятка.

2. Далей настаўнік прапануе вучням аднавіць выпадак, які адбыўся са сп. Кашуком і Пецуком і вызначыць прычыны і наступствы іх канфлікта. Для гэтага можна задаць наступныя пытанні:
- Якія бакі былі ўцягнуты ў канфлікт? (*сп. Пецук з сынам Васілём, сп. Кашук, м.б. іх сем'і)*
- З чаго пачаўся канфлікт? (*з таго, што васіль зламаў новы плот сп. Кашука*)
- Чым канфлікт скончыўся? (*а) судом і садовым рашэннем па справе, б) нічым, бо канфлікт не быў вырашаны*)
- Што кожны з бакоў атрымаў у выніку канфлікта? (*сп. Кашук – рашэнне суда*)
- Якія страты панеслі кожны з бакоў канфлікта? *(абодва бакі страчаныя нервы, грошы, добрыя стасункі і г.д.)*
- Ці быў канфлікт вырашаны?

*Адказы можна не фіксаваць на дошцы ці ватмане, яны служаць толькі аднаўленню і паўтору матэрыяла, прачытанага ў хаце.*

3. На наступным этапе занятка настаўнік прапануе вучням запоўніць заранёў падрыхтаваную табліцу (на плакаце ці дошцы), у якой ім трэба вызначыць яўныя пазіцыі і патаемныя (сапраўдныя) інтарэсы бакоў у канфлікце Кашука і Пецукоў – (вучні могуць дадаць свае варыянты пазіцый і інтарэсаў бакоў да тых, што пададзены ў табліцы ў падручніку


*©Грамадскае аб'яднанне «ВІТ»*

для вучня). Пры гэтым варта адзначыць, што адной пазіцыі можа адпавядаць некалькі інтарэсаў.

Прыклад:

| | **Васіль** | **Сп. Пецук** | **Сп. Кашук** |
|---|---|---|---|
| **Пазіцыі** (тое, што выказваеца бакамі) | - Ён баіцца пакарання.<br>- Ён не лічыць сябе вінаватым.<br>- Ён проста гуляўся і не хацеў ламаць плот. | - Ён хоча, каб да Васіля паставіліся справедліва.<br>- Ён не хоча, каб Васіля паставілі на ўлік у міліцыю.<br>- Ён не хоча аплочваць армонт плота, які Васіль не ламаў. | - Ён хоча, каб Васіля і яго бацьку пакаралі за тое, што зрабіў Васіль.<br>- Ён хоча, абараніць сваю маёмасць.<br>- Ён хоча атрымаць кампенсацыю стратаў на рамонт плота |
| **Інтарэсы** (унутраныя матывы займання пэўнай пазіцыі ў канфлікце) | - Ён не хоча мець праблем з судом.<br>- Ён не хоча сварыцца з суседзямі.<br>- Ён хоча спакойна жыць у сваім раёне. | - Ён перажывае за сына.<br>- Ён баіцца, што яму прыдзецца аплочваць вялікія судовыя выдаткі.<br>- Ён адчувае сабе часткова адказным за тое, што здарылася.<br>- Ён не думаў, што справа дойдзе да суда.<br>- Ён не хоча сварыцца з суседам.<br>- Ён хоча спакойна жыць у сваім раёне. | - Ён быў пакрыўджаны тым, што сп. Пецук адразу не кампенсаваў яму страты, а Васіль не папрасіў прабачэння.<br>- Ён лічыць, што падлеткі павінны ведаць, што ім прыдзецца адказваць за свае дзеянні.<br>- Ён хоча спакойна жыць у сваім раёне.<br>- Ён не хоча сварыцца з суседзямі. |

4. Пасля таго, як вучні выканаюць гэта заданне, настаўнік праводзіць апытанне па спосабах вырашэння канфліктаў. Прапануе вучням назваць вядомыя ім спосабы вырашэння канфліктных сітуацый (*нефармальная дыскусія, перамовы, медыяцыя, судовае разбіральніцтва*) і іх асаблівасці (*гл. Падручнік для вучня глава "Вырашэнне канфліктаў").* Вучні павінны пералічыць пададзеныя ў падручніку спосабы і назваць, чым яны адрозніваюцца адзін ад другога і у якіх сітуацыях іх варта ўжываць.

5. На наступным этапе занятку настаўнік прапануе вучням падзяліцца на групы і вырашыць, які са спосабаў вырашэння канфлікта найбольш падыходзіць для вырашэння спрэчкі паміж сп. Кашуком і Пецуком. Настаўнік падзяляе вучняў на групы "сп. Пецука", "Васіля", "сп. Кашука". Пасля таго, як вучні разыйдуцца па групах, настаўнік просіць кожную


*©Грамадскае аб'яднанне «ВІТ»*

групу на працягу 15 хвілін вызначыць найлепшы спосаб урэгулявання канфлікта, зыходзячы з інтарэсаў той асобы, якую яны прадстаўляюць. Пры гэтым вучні павінны звярнуцца да крокаў вырашэння канфлікта, апісаных у падручніку (*вызначэнне сутнасці канфлікта, аналіз пазіцый і інтарэсаў бакоў і знаходжанне найлепшага спосаба яго вырашэння*) і вызначаных раней яўных пазіцый і сапраўдных інтарэсаў бакоў (Табліца 1 Падручніка). Астатнія спосабы група павінна *ранжыраваць* ад самага лепшага да самага непадыходзячага. Трэба таксама нагадаць групам, што іх адказы павінны быць абгрунтаванымі. Вынікі сваёй працы групы павінны зафіксаваць пісьмова (на ватманах, дошцы ці ў сшытках)

6. Пасля сканчэння часу на працу ў групах вучні прэзентуюць яе вынікі. Прадстаўнікі груп па чарзе павінны назваць: 1)інтарэсы якой асобы яны прадстаўляюць, 2)які спосаб вырашэння ўзнікшага канфлікта на іх думку найлепшы, які найгоршы і чаму. Пасля выступу кожнай з груп, калі дазваляе час, настаўнік можа прапанаваць іншым групам задаць пытанні выступаўшаму прадстаўніку групы. Пасля сканчэння прэзентацыі можна падзякаваць групам за працу і прапанаваць вярнуцца на свае месцы для абмеркавання і падсумавання занятка.

7. Падсумаванне адбываецца шляхам абмеркавання станоўчых і адмоўных бакоў розных спосабаў вырашэння канфлікта, з якім вучні працавалі на занятку. На абмеркаванне варта задаць наступныя пытанні:

- Ці можам мы сказаць, што адзін з гэтых варыянтаў лепшы? Які? Чаму? Каб мы размаўлялі пра іншы канфлікт, ці быў бы адказ такім самым?
- Ці можам мы сказаць, што адзін з гэтых варыянтаў больш справядлівы за іншыя? Які? Чаму? Каб мы размаўлялі пра іншы канфлікт, ці быў бы адказ такім самым?
- Ад чаго залежыць выбар варыянта вырашэння канфлікта?
- Справа патрапіла ў суд. Ці быў гэта найлепшы варыянт для Пецукоў? Ці можна было вырашыць гэты канфлікт іншым спосабам? Як? Чаму гэта было б прасцей?
- Ці лічыце Вы, што сп. Кашук задаволены вынікам судовага разгляду? Калі так, то чым канкрэтна? Калі не, то чым? Ці мог быць сп. Кашук задаволены іншым спосабам вырашэння канфлікта? Якім? Больш ці менш, чым у судзе?
- У якіх выпадках пазасудовыя метады вырашэння канфліктаў лепшыя?
- Ці плануеце вы ўжываць якія-небудзь з гэтых метадаў для ўрэгулявання канфліктаў у вашым штодзённым жыцці? Якія? Чаму?


*©Грамадскае аб'яднанне «ВІТ»*

*Настаўнік можа абраць толькі частку з гэтых пытанняў, калі не хапае часу.*

Калі застаецца час, магчыма аднавіць крокі вырашэння канфлікта, праз якія вучні прайшлі на занятку (*вызначэнне сутнасці канфлікта, аналіз пазіцый і інтарэсаў бакоў і знаходжанне найлепшага спосаба яго вырашэння*). Таксама можна ўзгадаць пра варыянты паводзінаў у канфлікце і спытаць у вучняў, які з іх яны звычайна абіраюць пры канфліктных сітуацыях, якія з імі здараюцца.

На заканчэнне настаўнік можа патлумачыць вучням, што яны і далей будуць спрабаваць ужываць усе акрэсленыя метады урэгулявання канфліктных сітуацый, з якімі яны будуць сустракацца на працягу вывучэння курса “Права на кожны дзень”.



*©Грамадскае аб'яднанне «ВІТ»*

# Метады актыўнага навучання


Шпацыр у думках ........................................ 75
Думаць, працаваць у парах, абменьвацца меркаваннямі..... 77
Кожны вучыць кожнага – толькі факты .................... 78
Займі пазіцыю .......................................... 79
ПРЭС (PRES) ............................................ 81
Мазгавы штурм .......................................... 83
Праца з невялікімі групамі ............................. 85
Раунд Робін ............................................ 88
Аналіз казусаў ......................................... 89
Мазаіка (Ажурная піла) ................................. 92
Разыгранне роляў і мадэляванне сітуацый ................ 94
Спрошчанае Судовае разбіральніцтва (Суд pro se) ........ 96




*©Грамадскае аб'яднанне «ВІТ»*

**Шпацыр у думках**

**Мэта:**

Метад дапамагае прадэманстраваць мноства спосабаў, якім чынам закон закранае наша жыццё і зразумець уплыў законаў на штодзённае жыццё.

**Методыка правядзення:**

1. Скажыце ўдзельнікам, што Вы збіраецеся распавесці ім «гісторыю», і што яны павінны будуць спыніць апавяданне, калі пачуюць у расказе нешта, што на іх думку рэгулюецца законам.
2. Пачніце апавяданне аб Вашай штодзённай дзейнасці. Напрыклад: «Мяне завуць Ўладзімір. Я працую настаўнікам у школе. Сёння я прачнуўся ў 6 гадзін раніцы. Я прыняў душ, апрануўся, паснедаў аўсянкай і кубкам кавы, пасля гэтага сеў у аўтобус і паехаў у школу. Пасля першага занятка мне ў касе школы выплацілі заробак за месяц... і гэтак далей».
3. Удзельнікі павінны былі б спыніць Вас у вялікай колькасці месцаў, каб пазначыць такія моманты ў апавяданні як:

А. *Вашае імя - гэта юрыдычны тэрмін, які не можа быць зменены без згоды суда.*

Б. *Час рэгулюецца законам. Існуюць асобныя законы аб пераводзе гадзіннікаў на летні і зімні час, а таксама аб тым, якім чынам рэгулюецца дакладны час у краіне.*

В. *Вода, якая падаецца ў нашы дамы, інспектуецца гарадскімі службамі і павінна адпавядаць стандартам, пазначаным у законе.*

Г. *Вопратка і мэбля павінны адпавядаць патрабаванням, якія усталяваны Дзяржаўнымі стандартамі, яны таксама павінны быць якаснымі.*

Д. *Каробкі з-пад аўсянкі па закону павінны ўтрымліваць надпісы пра склад. Малако павінна быць пастэрызавана і адпавядаць стандартам, рэгулюемым законам.*

Е. *Аўтобусы павінны хадзіць згодна з раскладам, мець прыборы бяспечнасці і кантроля забруджвання, наяўнасць якіх патрабуецца законам.*

Ж. *Кіроўцы павінны мець пасведчанне і выконваць правілы дарожнага руху.*

З. *Вуліцы будуюцца і ўтрымліваюцца адпаведна стандартам, рэгулюемым законам.*

І.*Уладкаванне на працу, звальненне з яе і атрыманне заробка адбываецца згодна з працоўным заканадаўствам.*

4. Як пашырэнне гэтага практыкавання, вы можаце папрасіць вучняў сабраць (ці назваць) спіс усіх юрыдычных дакументаў, якія ім


*©Грамадскае аб'яднанне «ВІТ»*

спатрэбяцца напрацягу іх жыцця. Сярод іх могуць быць наступныя:

А. *Пасведчанне аб нараджэнні*

Б. *Пасведчанне кіроўцы*

В. *Атэстат аб сярэдняй адукацыі*

Г. *Пасведчанне аб шлюбе*

Д. *Працоўны дагавор*

Е. *Працоўная кніжка*

Ж *Пашпарт*

З. *Дыплом аб вышэйшай адукацыі*

І. *Пенсійнае пасведчанне*

Можна таксама прапанаваць вучням размясціць гэтыя дакументы на "лініі жыцця", дзе "0"- гэта мемент нараджэння. Кожны дакумент мы можам атрымаць толькі дасягнуўшы пэўнага ўзросту.




**Варыянт:**

Вы можаце таксама правесці практыкаванне па гэтай методыцы наступным чынам: падзяліце вучняў на 2 (4) групы. Дайце заданне групам на працягу пэўнага часу:

1 – напісаць усе дзеянні, якія яны рабілі зранку і якія, на іх погляд, не урэгуляваны правам,

2 – напісаць усе дзеянні, якія яны рабілі зранку, і якія ўрэгуляваны правам.

Пасля выканання гэтага практыкавання, прапануйце вучням параўнаць спісы, якія ў іх атрымаліся.


©Грамадскае аб'яднанне «ВІТ»

**Думаць, працаваць у парах, абменьвацца меркаваннямі.**

**Мэта:**

Гэты метад мае каштоўнасць для пачатковай фазы, каб навучыць навучэнцаў, як працаваць разам у малых групах. Ён таксама дазваляе вучню «спачатку падумаць».

**Методыка правядзення:**

1. Задайце вучням пытанне для дыскусіі ці гіпатэтычную сітуацыю. Пасля тлумачэння пытання ці фактаў сітуацыі навучэнцам даецца кароткі прамежак часу для таго, каб падумаць над магчымымі адказамі ці рашэннямі самастойна.
2. Далей, разбейце вучняў па парах і папрасіце іх абмеркаваць свае ідэі з другімі навучэнцамі. Яны павінны дасягнуць згоды ці кансэнсуса адносна адказа ці рашэння.
3. Пасля выканання практыкавання ў парах, прапануйце, каб кожная з пар абменялася сваім адказам і аргументацыяй з усім класам, каб на базе атрыманых адказаў правесці дыскусію ў агульнай групе.



*©Грамадскае аб'яднанне «ВІТ»*

## Кожны вучыць кожнага – толькі факты

**Мэта:**

Гэты метад дазваляе вучням стаць часткаю актыўнага абмеркавання і падзяліцца сваімі ведамі з сябрамі. Абавязкова дайце ім некаторы час для таго, каб яны змаглі прачытаць свае факты і разглядзець найлепшы шлях для навучання ім.

**Методыка правядзення:**

1. Падрыхтуйце «карткі фактаў», на якіх павінна быць у яснай і досыць сціслай форме (1-3 сказы) пададзена пэўная інафармацыя па тэме занятка. Дастаткова адной карткі на вучня. Можна таксама дадаць дадатковую інфармацыю. Кожная картка павінна ўтрымліваць кавалак інфармацыі ці факт, якім вучань павінен падзяліцца з іншымі ўдзельнікамі практыкавання. (калі вучняў шмат сфарміруйце карткі так, каб 2 ці 3 вучня атрымалі адну і тую ж інфармацыю для навучання).
2. Раздайце вучням па адной картцы на аснове выпадковага выбару (можна папрасіць іх проста выцягнуць картку з нейкай скрынкі).
3. Скажыце вучням, што ім будзе прапанаванны незвычайны тэст і яны не павінны да пачатку практыкавання дзяліцца з суседзямі інфармацыяй на картцы.
4. Дайце некоры час для таго, каб вучні маглі прачытаць інфармацыю на картцы.
5. Пасля гэтага давайце старт практыкаванню. Патлумачце вучням, што кожны мае 10 хвілінаў, каб «навучыць» ці перадаць свае веды <u>на словах і індывідуальна</u> па магчымасці большай колькасці ўдзельнікаў, а таксама выслухаць, у парадку саманавучання, факты ад іншых удзельнікаў. Гэта рухлівае практыкванне, падчас якога вучні павінны перамяшчацца па класу, сустракацца адзін з адным, разыходзіцца і зноў сустракацца. Настаўнік таксама можа хадзіць па класу і аказваць дапамогу ў падтрымцы актыўнасці.
6. Па сканчэнні часу на выкананнне практыкавання рассадзіце вучняў на месцы і прапануйце ім падзяліцца з калегамі, што новага і ад каго яны даведаліся за гэты час.

p.s. Калі Вы хочаце з дапамогай гэтага метада пракантраляваць веды вучняў, можаце перад пачаткам актыўнай часткі практыкавання сабраць карткі з інфармацыяй.


*©Грамадскае аб'яднанне «ВІТ»*

## Займі пазіцыю

**Мэта:**

Гэты метад выкарыстоўваецца для правядзення ў класе абмеркавання спрэчных пытанняў. Яе можна выкарыстоўваць як уводзіны, каб прадэманстраваць разнастайнасць магчымых падыходаў да вывучаемай тэмы і даць магчымасць вучням папрактыкавацца ў навыках размовы і аргументавання. Таксама яна можа выкарыстоўвацца для падвядзення вынікаў праведзенага занятку для таго, каб ацаніць наколькі добра засвоена тэма.

**Методыка правядзення:**

1. Сфармулюйце і напішыце на плакаце (ці дошцы) пытанне, па якому вы плануеце правесці практыкаванне. Пытанне павінна быць кантраверсійным, гэта значыць, не мець адзінага правільнага адказу і даваць магчымасць вучням вызначыць асабістае стаўленне да прапануемай для абмеркавання праблемы. Лепш, калі тэзіс будзе сфармуляваны як кароткае яснае выказванне, па якому можна выказаць згоду ці нязгоду. Напрыклад: "Смяротнае пакаранне павінна быць адмененае".
2. Павесце па розных кутах класа две карткі. На адной з іх павінна быць напісана "ТАК" , на другой - "НЕ". Карткі таксама могуць адлюстроўваць палярныя пункты гледжання па якому-небудзь пытанню. Напрыклад: "Вайсковая служба павінна быць абавязкам кожнага" і "Армія павінна быць прафесійнай".
3. Растлумачце вучням правілы правядзення практыкавання.

- Пасля агалошання праблемы вучні павінны самастойна падумаць хвіліну над сваім стаўленнем да яе.
- Калі вучні вызначацца, яны павінны разыйсціся і стаць каля той карткі, якая супадае з іх пунктам гледжання на дадзеную праблему. Калі ёсць нявызначыўшыеся, пакінце ім магчымасць выказацца асобна.
- Далей кожнаму жадаючаму прапануецца абгрунтаваць сваю пазіцыю. Лепш, калі вучні будуць выказвацца па чарзе ад кожнай групы.
- Вучні павінны выказвацца ясна і абгрунтавана, не перашкаджаючы адзін аднаму і не ўступаючы ў спрэчкі. **Няма няправільных адказаў - ёсць розныя пункты гледжання!**

4. Правядзіце практыкаванне. Паспрабуйце ахапіць усіх жадаючых выказацца. Не крытыкуйце і не давайце ацэнак выказванням вучняў. Вы можыце выказаць сваё стаўленне да праблемы ці калі вас вучні аб


©Грамадскае аб'яднанне «ВІТ»

гэтым папросяць, ці на прыканцы практыкавання. Калі лічыце, што гэта неабходна.

5. Пасля таго, як довады выказаныя, спытайце ці няма сярод удзельнікаў такіх, хто за час абмеркавання змяніў свой пункт гледжання і хоча перайсці з адной групы ў другую. Прапануйце жадаючым абгрунтаваць змену пазіцыі.
6. Папрасіце ўдзельнікаў назваць найбольш пераконваючы довад, які быў прыведзены супрацьлеглым бокам.


*©Грамадскае аб'яднанне «ВІТ»*

## ПРЭС (PRES)

**Мэта:**

Метад ПРЭС найлепш ужываецца ў сітуацыях, калі неабходна за досыць кароткі час пачуць абгрунтаваны пункт гледжання па абмяркоўваемай праблеме як мага большай колькасці вучняў. Метад ПРЭС прапануе сціслую і вельмі эфектыўную схему прэзентацыі сваёй пазіцыі і вучыць коратка, дакладна і аргументвана выказваць свае погляды і ідэі. ПРЭС можна ўжываць падчас правядзення іншых методык, напрыклад "Займі пазіцыю" для эканоміі часу і прызвычаення вучняў да культуры выказванняў і дыскутавання.

*Назва ПРЭС – гэта транслітэрацыя ангельскага тэрміну PRES, дзе кожнай загалоўнай літары адпавядае назва кроку ў практыкаванні, пры паслядоўным праходжанні якіх атрымоўваецца закончаная схема пабудовы аргументацыі.*

| | *Steps* | *Крокі* |
|---|---|---|
| *P* | ***point of view*** | ***(пункт гледжання)*** |
| *R* | ***reason*** | ***(прычына)*** |
| *E* | ***example*** | ***(прыклад)*** |
| *S* | ***summary*** | ***(падсумаванне)*** |

**Методыка правядзення:**

1. Для правядзення практыкавання сфармулюйце пытанне. Пытанне павінна быць кантраверсійным і даваць магчымасць вызначыць пэўнае стаўленне да праблемы. Напрыклад вы хацелі б абмеркаваць з вучнямі магчымасць прыняцца закону, які б забараняў аборты. Тэза: "Закон аб забароне абортаў павінен быць прыняты".
2. Патлумачце вучням, што сваё стаўленне да выказвання яны павінны рабіць па схеме ПРЭС. Для гэтага напішыце крокі, па якіх павінна будавацца аргументацыя на дошцы ці плакаце, каб яны ўвесь час знаходзіліся ў вучняў перад вачыма.
3. Прадэманструйце, як павінен выглядаць іх выступ згодна схемы. Напрыклад:

| | |
|---|---|
| -"Я лічу, што аборты павінны быць забароненыя па закону (**пункт гледжання**).<br>-Таму што аборты- гэта узаконенае забойства (**прычына**).<br>-Напрыклад, калі б мая мама *** | -"Я лічу, што аборты павінны быць афіцыйна дазволеныя (**пункт гледжання**).<br>-Таму, што кожны мае права адмовіцца нараджаць непажаданых дзяцей(**прычына**). |


*©Грамадскае аб'яднанне «ВІТ»*

| | |
|---|---|
| гадоў таму зрабіла аборт, мяне папросту не было б на свеце (**прыклад**).<br>-Вось чаму я лічу, што аборты павінны быць афіцыйна забароненыя (**падсумаванне**) | -Напрыклад, калі жанчына зацяжарыць у выніку згвалтавання, гэтае дзіця будзе ўсё жыццё нагадваць ёй аб гэтым страшным выпадку (**прыклад**).<br>-Вось чаму я ўпэўнены/на, што аборты павінны быць дазволеныя законам (**падсумаванне**)" |

4. Патлумачце вучням, што яны не могуць перабіваць адзін аднаго і неабгрунтавана крытыкаваць пункт гледжання іншага. Калі ў некага ўзнікае жаданне выказацца, ён павінен гэта зрабіць па схеме.
5. Пад час правядзення практыкавання ствараецца база для правядзення ажыўленай дыскусіі, паколькі па ходу выказваюцца ярка акрэсленыя пункты гледжання на праблему.


©Грамадскае аб'яднанне «ВІТ»

**Мазгавы штурм**

**Мэта:**

Метад "Мазгавы штурм" - гэта эфектыўны спосаб калектыўнага абмеркавання, пошука рашэнняў, якое адбываецца шляхам вольнага выказвання меркаванняў усіх удзельнікаў. Асноўная мэта Мазгавога штурму – гэта прапанаваць як мага большую колькасць варыянтаў рашэння пастаўленай задачы. Як паказвае практыка, шляхам Мазгавога штурму літаральна за некалькі хвілінаў можна атрымаць некалькі дзесяткаў ідэяў. Колькасць ідэяў не з'яўляецца самамэтай, а толькі служыць асновай для выпрацоўкі найбольш прымальнага рашэння. У Мазгавым штурме без усялякага ціску павінны прыняць удзел усе прысутныя. На думку спецыялістаў, Мазгавы штурм можна лічыць удалым, калі выказаныя падчас першага этапу пяць ці шэсць ідэяў у будучыні стануць базай для патэнцыйных рашэнняў праблемы.

*Гэты метад быў упершыню выкарыстаны каля пятнаццаці гадоў таму супрацоўнікам рэкламнага агенцтва Batter, Barton, Durstine and Osborn Company Алексам Ф. Осбарнам. Ён вызначыў Мазгавы штурм як метад, які дазваляе групе людзей выкарыстоўваць свае інтэлектуальныя здольнасці для хуткага і эфектыўнага рашэння пастаўленай задачы на манер войска хуткага рэагавання (камандас). За апошнія гады гэты метад стаў настолькі папулярным, што яго пачалі рэгулярна выкарыстоўваць нават такія буйныя кампаніі, як Джэнерал Электрык, Дзюпон, Ю Эс Сціл, Ай-Бі-Эм. Яго таксама прынялі на ўзбраенне дзяржаўныя структуры і грамадскія арганізацыі, установы вышэйшай адукацыі.*

**Методыка правядзення:**

1. Выбярыце тэму для абмеркавання. Сфармулюйце пытанне ці праблему, якую неабходна вырашыць. Напрыклад, "Што трэба зрабіць для таго, каб пазбегнуць цяплічнага эфекту на Зямлі?"
2. Прапануйце вучням выказваць свае думкі наконт варыянтаў рашэння гэтай праблемы. Патлумачце ім асноўнае правіла першага этапу Мазгавога штурму – прымаюцца і фіксуюцца ўсе ідэі, якімі б абсурднымі ці смешнымі яны не здаваліся, ніхто не мае права выказваць на гэтым этапе сваё меркаванне пра ідэі іншых удзельнікаў «штурму» ці даваць ім адзнаку.

3. Прызначце «сакратара», які будзе запісваць усе прапанаваныя ідэі на дошцы ці плакаце. Вы можаце гэта рабіць самі, але лепш, калі вы не


©Грамадскае аб'яднанне «ВІТ»

будзеце адцягваць сваю ўвагу на пісанне, а будзеце трымаць пастаянны кантакт з аўдыторыяй. Падчас "накідвання" ідэяў сачыце за парадкам выступаў, спрабуйце далучыць да ўдзелу ўсіх прысутных, сачыце за тым, каб усе ўдзельнікі мелі роўныя магчымасці выказаць сваю думку. Пры парушэнні кімсці з удзельнікаў правілаў правядзення Мазгавога штурму адразу ж умешвайцеся ў абмеркаванне. Першы этап працягваецца пакуль з'яўляюцца новыя ідэі.

4. Аб'явіце кароткі перапынак, каб вучні настроіліся на крытычны лад мыслення. Пасля перапынку пачынаецца другі этап. Зараз удзельнікі Мазгавога штурму павінны згрупіраваць і развіць ідэі, выказаныя падчас першага этапу (спіс ідэяў можна раздрукаваць і раздаць удзельнікам). Вы можаце з дапамогай вучняў рассартыраваць ідэі па групам. Пасля гэтага вучні павінны прааналізаваць гэтыя ідэі, выбіраючы з большасці толькі тыя, якія, на іх думку, могуць дапамагчы знайсці адказы на пастаўленыя пытанні, і абгрунтаваць свой выбар.

5. Пасля сканчэння гэтай працы вы можаце падвесці вынікі абмеркавання. Запытайцеся ва ўдзельнікаў, ці імкнуліся яны дзейнічаць, як каманда падчас пошукаў рашэння, ці задаволеныя яны вынікамі сваёй працы. Калі Мазгавы штурм не прынёс жадаемага выніку, варта абмеркаваць прычыны няўдачы.


*©Грамадскае аб'яднанне «ВІТ»*

## Праца з невялікімі групамі

**Мэта:**

Заняткі ў невялікіх групах дазваляюць вучням выпрацаваць навыкі супрацоўніціва і камунікацыі, працы ў камандзе і іншыя важныя навыкі ў адносінах паміж людзьмі. Акрамя таго, гэтыя заняткі дапамагаюць вучням навучыцца вырашаць паміж сабой узнікшыя непаразуменні.

**Методыка правядзення:**

1. Вызначыце і сфармулюйце заданне, над якім будуць працаваць групы. Падрыхтуйце матэрыялы, якія будуць неабходныя вучням падчас групавой працы. Заданне, над якім будуць працаваць вучні, лепш даваць да падзелу на групы. Магчыма, варта прагаварыць яшчэ раз і пасля падзелу.
2. Падзяліце вучняў на групы. Падзел на групы можа адбывацца рознымі спосабамі ў залежнасці ад мэтаў, якія пастаўленыя перад заняткам: а) па пунктах гледжання, якіх прытрымліваюцца вучні па абмяркоўваемай праблеме, б) адвольна, выпадковым падзелам, в) па алфавіту, г) па палавой прыкмеце (досыць небяспечны спосаб, але можа выкарыстоўвацца, калі гэта неабходна для дасягнення мэтаў занятка) д) па варыянтах, па знаках задыяка, па датах нараджэння і г.д. Асноўнае правіла пры падзеле на групы – створаныя групы павінны быць прыблізна роўныя ў інтэлектуальным плане і не ствараць няроўных умоваў для працы. Сачыце за прагрэсам групы. Час ад часу падыходзце і цікаўціся, як ідзе праца.

Навучэнцы ў складзе невялікай групы могуць выконваць, сярод іншага, наступныя ролі:

** пасрэдніка*

** рэгістратара*

** дакладчыка*

** чалавека, які задае дыскусійныя пытанні*

** чалавека, які перафразуе*

Абавязкова дапамагайце вучням, якія з цяжкасцю прыстасоўваюцца да працы ў невялікай групе, асабліва на першых занятках.

Дапамажыце вучням зразумець, якія навыкі неабходны для працы ў невялікай групе. Не чакайце, што яны змогуць добра працаваць у групе без вашай дапамогі. Адным са спосабаў даць ім магчымасць прааналізаваць індывідуальныя паводзіны ўдзельнікаў групы з'яўляецца прызначэнне «назіральнікаў», якія будуць адзначаць прадвіжэнне групы да



©Грамадскае аб'яднанне «ВІТ»

выканання пастаўленнага задання. Справаздача «назіральнікаў» дае магчымасць ўдзельнікам групы ацаніць, наколькі паспяхова яны справіліся з задачай. «Назіральнікі» павінны адзначаць прызнакі спецыфічных паводзін, загадзя апісаных настаўнікам (напрыклад у падрыхтаванай анкеце для назіральніка), і вызначаць, як удзельнікі групы спраўляюцца з узнікаючымі падчас працы праблемамі. Напрыклад, «назіральнік» можа правяраць групу на прадмет валодання навыкамі размовы. Давая справаздачу перад групай, назіральнікі абавязаны прадстаўляць свае назіранні ў максімальна апісальнай і аб'ектыўнай форме.

3 Перад сканчэннем часу на працу ў групе папрасіце групы вызначыць дакладчыка, які будзе прэзентаваць для ўсіх вынікі працы групы.

4 Пасля сканчэння часу на групавую працу папрасіце групы па чарзе (загадзя вызначанай ці ў адвольным парадку) прадставіць свае напрацоўкі. Папрасіце дакладчыкаў быць сціслымі і дакладнымі. Прапануйце прадстаўнікам іншых груп задаць пытанні дакладчыку.

**Памер групы і характарыстыка ўзаемадзеяння ўнутры невялікай групы**

*Групы з двух чалавек*. У такіх групах адзначаецца высокі ўзровень абмену інфармацыяй і меньш непаразуменняў, але і павялічваецца верагоднасць узнікнення большай напругі, эмацыйнасці і, вельмі часта, патенцыйнага тупіка. У выпадку ўзнікнення непаразуменняў ні адзін з удзельнікаў не мае саюзніка.

*Групы з трох чалавек*. Пры такой арганізацыі дзве больш моцныя індывідуальнасці могуць падавіць больш слабога ўдзельніка групы. Тым ня меньш, групы з трох навучэнцаў з'яўляюцца найбольш стабільнымі групавымі структурамі з перыядычна ўзнікаючымі варыянтнымі кааліцыямі. У гэтым выпадку будзе прасцей вырашыць непаразуменні.

*Групы з няцотнай і цотнай колькасцю ўдзельнікаў*. У групах з цотнай колькасцю ўдзельнікаў непаразуменні вырашыць цяжэй, чым у групах з няцотнай колькасцю ўдзельнікаў. Няцотны склад здольны вывесці групу з тупіка ці саступіць меркаванню большасці.

*Група з пяці чалавек*. Такі памер групы бачыцца найбольш здавальняючым для навучальных мэтаў. Размеркаванне пазіцый у суадносінах 2:3 забяспечвае падтрымку меньшасці. Такая група дастаткова вялікая для мадэлявання сітуацыяў і дастаткова малая для прыцягнення ўсіх удзельнікаў да працы групы і персанальнага заахвочвання.


©Грамадскае аб'яднанне «ВІТ»

**Рэкамендацыі па працы з невялікімі групамі**

1. Упэўніцесь, што вучні валодаюць ведамі і навыкамі, неабходнымі для выканання задання. Недахоп ведаў вельмі хутка дае пра сябе знаць - вучні не стануць прыкладаць высілкаў для выканання задання.
2. Спрабуйце зрабіць свае інструкцыі максімальна дакладнымі. Малаверагодна, што група зможа ўспрыняць больш за адну ці дзве, нават вельмі дакладных, інструкцыі за раз. Пажадана, каб яны былі прапісаныя і знаходзіліся ўвесь час перад вачыма.
3. Прапануйце невялікай групе дастаткова часу на выкананне задання. Прыдумайце, чым заняць групы, якія выканаюць заданне раней за астатніх.
4. Фарміруйце групы ў складзе ад двух да пяці чалавек. Пачніце з групаў, якія складаюцца з двух-трох чалавек. Пяць чалавек - гэта аптымальны верхні рубеж для правядзення абмеркавання ў рамках малой групы.
5. Не перастарайцеся ў пошуках раўнавагі паміж індывідуальным і сумесным навучаннем. Выкарыстоўвайце невялікія групы толькі ў тых выпадках, калі задача патрабуе сумеснай, а не індывідуальнай працы.
6. Праца невялікімі групамі павінна стаць у вашым класе правілам, а не радыкальным, адзіным адступленнем ад практыкі «лекцыі-пераказа».
7. Падумайце пра тое, як Ваша стратэгія заахвочвання/адзнакі ўплывае на выкарыстанне метада працы з невялікімі групамі. Забяспечце групавыя ўзнагароды за групавыя высілкі.
8. Будзьце пільнымі да пытанняў унутрыгрупавога кіравання. Калі адзін з навучэнцаў павінен зрабіць справаздачу перад класам аб групавой працы, забяспечце аб'ектыўны выбар дакладчыка.
9. Будзьце падрыхтаваныя да павышаннага шуму, характэрнага для сумесных навучальных заняткаў.
10. Падчас працэса фарміравання групаў асцерагайцеся «навешвання ярлыкоў» на навучэнцаў. Як правіла, пажаданы разнародныя групы.
11. Пераходзьце ад групы да групы, назіраючы/ацэньваючы сітуацыю. Спыніўшыся каля пэўнай групы, не засяроджвайце ўвагу на сабе.
12. Упэўніцесь у тым, што навучэнцы сядзяць па колу - калена да калена, вочы ў вочы. Кожны ўдзельнік групы павінен лёгка бачыць астатніх.


©Грамадскае аб'яднанне «ВІТ»

## Раунд Робін

**Мэта :**

З дапамогай гэтага метада Вы зможаце прыцягнуць ўсіх вучняў да дыскусіі ў роўнай ступені. Яна добра спрацоўвае, калі праходзіць апытанне ці адбываецца прэзентацыя працы малых групаў.

**Методыка правядзення:**

1. Калі вы выкарыстоўваеце на занятку метад "Праца ў малых групах", і у выніку іх працы павінен атрымаца спіс ідэяў (варыянтаў рашэння), то для прэзентацыі такіх вынікаў можна выкарыстаць метад Раўнд Робін. Калі малыя групы завяршылі выкананне свайго задання і гатовыя прадставіць яе вынікі, папрасіце кожную групу па чарзе прадставіць па аднаму пункту з іх спісаў. Кожную наступную групу прасіце называць той варыянт іх рашэнняў, які не быў яшчэ названы. Апытанне па колу працягваецца, пакуль усе неназваныя ідэі не будуць прадстаўленыя.
2. Метад дазваляе кожнай групе абменяцца з усімі вынікамі сваёй працы, пазбягае сітуацыі, калі першая група, якая выступае, прадстаўляе ўсю інфармацыю. Дазваляе пазбегнуць паўтораў і эканоміць час.

**Варыянт 1.** Раунд Робін таксама добра спрацоўвае для стварэння спісаў ідэяў. Задайце пытанне, ці сфармулюйце праблему, рашэнне якой вы хацелі б пачуць ад вучняў. Папрасіце кожнага падумаць некаторы час і запісаць на картцы ці ў сшытак магчымая адказы. Калі вучні справяцца з гэтым заданнем, прапануйце ім прадстаўляць свае ідэі па парадку адзін за адным без паўтораў таго, што было ўжо названа.

**Варыянт 2**. Калі Вы выконваеце практыкаванні па вырашэнню праблемаў, якія могуць закранаць асабістыя пачуцці, можа быць выкарыстаны варыянт адаптацыі гэтай методыкі: Папрасіце вучняў напісаць сваю думку ці ідэю на картцы без указання імя. Затым збярыце ўсе карткі і складзіце спіс ідэяў на дошцы ці пачніце дыскусію, выкарыстоўваючы інфармацыю на картках, напрыклад, выцягваючы іх са скрынкі ў адвольным парадку і зачытваючы ўслых.


*©Грамадскае аб'яднанне «ВІТ»*

## Аналіз казусаў

**Мэта:**

Метад "Аналіз казусаў" накіраваны на выпрацоўку ў вучняў навыкаў ужывання юрыдычных правілаў паводзінаў у рэальных сітуацыях. Пры гэтым ставіцца задача не толькі навучыць вучняў прымаць да ўвагі заканадаўства пры вырашэнні асобных прыватных праблемаў, але і даць ім магчымасць развіваць уласныя ідэі і рабіць вывады.

*У юрыдычнай тэхніцы **казусам** прынята называць а) выпадак, выпадковае дзеянне, якое мае ўсе знешнія прыкметы злачынства, але якое не ўтрымлівае элемента віны і таму не падлягае пакаранню; б) складаную і заблытаную справу.*

**Методыка правядзення:**

1. Падрыхтуйце казус, які вы збіраецеся прапанаваць вучням для аналізу. Для разбору казусаў можна выкарыстоўваць сітуацыі розных фармаў: юрыдычныя казусы, заснаваныя на рэальных пісьмовых рашэннях судоў; штучна распрацаваныя казусы са змяшэннем некалькіх канфліктаў ці дылемаў; рэальныя жыццёвыя сітуацыі, выбраныя з газетных паведамленняў, часопісаў, кніг, кінафільмаў і іншых крыніцаў. Асноўнае патрабаванне да сітуацый, якую вы плануеце выкарыстаць у якасці казуса – яна не павінна мець адзінага прававога рашэння (нават, калі сітуацыя ўжо вырашана нейкім адным з магчымых спосабаў, прадстаўленае рашэнне не з'яўляецца адзіным) і вынікі яе аналіза могуць быць рознымі ў залежнасці ад аргументаў і падыхода, які вучні будуць выкарыстоўваць для гэтага.
2. Азнаямленне з падрыхтаваным казусам. Гэта можа адбывацца ў пісьмовай, аўдыё- ці візуальнай форме. Можна прапанаваць вучням проста прачытаць выпадак, які напісаны на дошцы ці ў падручніку, можна паказаць ім урывак з фільма, можна прадэманстраваць загадзя падрыхтаваную сцэнку і інш.
3. Пракантралюйце наколькі поўна і аднолькава вучні зразумелі сутнасць прапанаванай сітуацыі да таго як пачнецца абмеркаванне праблемы. Гэта дапаможа высвятліць памылкі і прабелы ў разуменні і падмацуе працу, якая будзе пазней праводзіцца ў групах. Лепш гэта зрабіць пастаноўкай серыі пытанняў:
   - Што здарылася ў дадзеным выпадку?
   - Хто быў задзейнічаны ў падзеі?


©Грамадскае аб'яднанне «ВІТ»

- Якія матывы кіравалі ўдзельнікамі падзеі, чаму яны дзейнічалі менавіта такім чынам?
- Якія з фактаў, прадстаўленых ў сітуацыі, былі важнымі?
- Якія з тых фактаў, пра якія вы б хацелі даведацца, не былі знойдены?

4. Пасля дакладнага разбору сутнасці справы вучні могуць прыступаць да аналізу і абмеркавання тых аргументаў, якія могуць быць паднятыя "за" ці "супраць" кожнага з пунктаў гледжання. Для гэтай працы вучняў лепш падзяліць на невялікія групы (магчымы падзел на групы па стаўленню да прапанаванага у казусе рашэння праблемы. Напрыклад "згодны з рашэннем", "не згодны з рашэннем", "маюць сваё меркаванне"), каб у іх была большая магчымасць выказацца. Прапануйце вучням пачсас абмеркавання закрануць наступныя пытанні:

- Якія аргументы гавораць на карысць, а якія супраць дадзенага пункту гледжання?
- Якія з аргументаў з'яўляюцца найбольш пераконваючымі? Якія найменш упэўніваюць? Чаму?
- Ці ёсць якія-небудзь альтэрнатывы вырашэння дадзенай сітуацыі?

Пры абмеркаванні важна спрыяць стварэнню клімата дабразычлівага стаўлення і талерантнасці, павагі да чужога меркавання. Патлумачце вучням, што важна выслухаць кожны пункт гледжання, абдумаць і ацаніць яго.

5. Пасля сканчэння працы ў групах папрасіце вучняў прадставіць вынікі іх працы. Рашэнне з'яўляецца адказам на падзею, што ляжыць у аснове любога казуса.

- Калі вучні выносяць рашэнне як ў выпадку судовых спраў, папарасіце іх даць ацэнку: згодны яны з рашэннем ці не? Што азначае прынятае рашэнне для ўдзельнікаў выпадка? Для грамадства?
- Калі рашэнне не было прапанавана ў казусе, вы можаце спытаць у вучняў, што яны вырашылі і чаму. Пасля таго, як вучні распавядуць пра свае ўласныя заключэнні, вы можаце расказаць ім сапраўдны вынік ці прысуд, які ўжо быў прыняты па гэтай справе. Тады вучні будуць мець магчымасць параўнаць свае ўласныя рашэнні з сапраўдным рашэннем суда.

**Варыянт:**

Прапануйце для азнаямлення вучням некалькі судовых рашэнняў. Пасля гэтага дайце ім асобна апісаную сітуацыю без рашэння, якое было


©Грамадскае аб'яднанне «ВІТ»

прынята па ёй. Скажыце вучням, што адно з раней прапанаваных рашэнняў тачыцца менавіта гэтай справы. Пасля гэтага прапануйце вучням адабраць тыя прысуды, з якімі яны згодны ў дачынаннеі да дазенага выпадку, і папарасіце патумачыць чаму. Пасля выканання гэтай працы, вучням можна расказать пра сапраўднае рашэнне суда з тлумачэннем прычанаў прыняцця менавіта такога рашэння і папрасіць параўнаць яго з іх уласным рашэннем.



*©Грамадскае аб'яднанне «ВІТ»*

## Мазаіка (Ажурная піла)

**Мэта:**

Метад выкарыстоўваецца для таго, каб утварыць на занятку сітуацыю, якая дазваліць вучням працаваць разам і вывучыць досыць вялікую колькасць інфармацыі за кароткі прамежак часу. Метад з'яўляецца эфектыўным інструментам, які можа замяніць начытванне лекцыяў у тых выпадках, калі пачатковая інфармацыя павінна быць данесена да вучняў перад правядзеннем нейкага віда дзейнасці на занятку. Методыка заахвочвае вучняў дапамагаць адзін аднаму вучыцца, і адначасова ўзмацняе навучальны эффект праз выкладанне інфармацыі адзін для аднаго.

**Методыка правядзення**:

1. Каб падрыхтаваць навучэнцаў да занятка са складаным зместам, выбярыце матэрыял неабходны для занятка і падрыхтуйце індывідуальныя інфармацыйныя пакеты для вучняў (матэрыялы падручніка, дадатковыя матэрыялы – вытрымкі з газет, артыкулы ў часопісах, заканадаўстве і г.д.)
3. Падрыхтуйце бэджы (карткі) з каляровымі налепкамі, каб зрабіць магчымым хуткі **падвоены падзел** на групы.

*<u>Падвоены падзел</u>: кожны вучань будзе ўваходзіць у 2 групы - «хатнюю» групу і «экспертную» групу. Для таго, каб падзел атрымаўся, пажадана мець колькасць вучняў, якая дзеліцца на такую колькасць груп, колькі будзе удзельнікаў у кожнай групе (напрыклад 4 групы па 4 удзельнікі, 5 па 5, 3 па 3 і г.д.). Але не страшна, калі не атрымоўваецца роўная колькасць, проста трэба дакладна прадумаць падзел. Гэта робіцца з дапамогай картак (налепак), якія раздаюцца вучням. Напрыклад, вы хочаце каб у вас атрымалася тры «хатнія» групы, якія потым разыйдуцца ў 3 «экспертныя». Тады падрыхтуйце па 3 карткі з выявамі сонца, зоркі і месяца. Гэта будзе падзел на 3 «хатнія» групы – групу «сонцаў»(1), групу «зорак» (2) і групу «месяцаў» (3). Каб пазней зрабіць другі падзел, у кожнай групе картак зрабіце адну выяву сіняга колеру, другую - чырвонага, і трэцюю - зялёнага. у групе 1 будзе*

**Схема 1**



*такім чынам адно сіняе сонца, адно – зяленае і адно - чырвонае. І так у кожнай групе. Калі вы будзеце дзяліць групы на «экспертныя», вы папросіце сабрацца ў групы вучняў, якія маюць розныя выявы, але аднаго колеру.*

3. Распішыце навучэнцаў па «хатніх» групах ад 3 да 5 чалавек (у залежнасці ад колькасці навучэнцаў і плана па другому падзелу на групы). Кожны вучань павінен ведаць, хто ў яго «хатняй» групе, таму што яны будут збірацца пазней. Яны павінны вызначыцца з месцам сустрэчы пасля таго як, яны стануць «экспертамі».
4. Далей папрасіце вучняў перайсці ў іх «каляровыя» групы, дзе яны стануць экспертамі па асобнай тэме. У кожнай групе павінен быць мінімум адзін прадстаўнік ад кожнай «хатняй» групы.
5. Раздайце пакеты з інфармацыяй кожнай групе. Кожная група павінна атрымаць розны пакет матэрыялаў. Група павінна прачытаць і абмеркаваць свае матэрыялы і стаць экспертам па гэтай інфармацыі. У іх павінна быць дастаткова часу, каб стаць «экспертамі» па матэрыялам. Для гэтага можа спатрэбіцца цэлы занятак, калі матэрыялы складаныя ці вялікія па аб'ёму. Дайце вучням наступныя заданні:

а) прызначце ў групах таго, хто будзе кіраваць абмеркаваннем, хто будзе сачыць за часам і хто будзе задаваць пытанні;

б) прачытайце і абмяркуйце пакет вашых матэрыялаў;

в) спытайце адзін аднаго, каб упэўніцца, што кожны разумее матэрыялы;

г) прыміце рашэнне адносна важных момантаў, якім вы навучыце сваю «хатнюю» групу.

6. Папрасіце навучэнцаў вярнуцца «дахаты». Кожны з іх павінен праінфармаваць іх «хатнія» групы аб тым, які пытанні абмяркоўваліся ў «экспертных» групах. Вучні павінны адказна паставіцца да выкладання вывучаных матэрыялаў для астатняй часткі «хатняй» групы. Гэты працэс магчыма займе яшчэ гадзіну ў залежнасці ад матэрыяла, які патрэбна ахапіць.
7. Калі ўсе навучэнцы вывучылі інфармацыю адзін аднаго, можна праводзіць запланаваны від дзейнасці.



©Грамадскае аб'яднанне «ВІТ»

## Разыгранне роляў і мадэляванне сітуацый

*Разыгранне роляў: вучні адчуваюць, думаюць і/ці дзейнічаюць як іншыя людзі, і «разыгрываюць» пэўную праблему ці сітуацыю.*
*Мадэляванне сітуацыі: вучні рэагуюць на спецыфічную праблему ў зададзеннай сітуацыі - напрыклад, навучальны судовы працэс ці абмеркаванне заканадаўства.*

**Мэта:**
Нягледзячы на тое, што гэтыя два падыходы якасна адрозніваюцца, яны дадаюць адзін аднаго і маюць агульныя мэты, якія заключаюцца ў наступным:
1. Далейшае развіццё фантазіі і навыкаў крытычнага мыслення.
2. Заахвочванне выказвання меркаванняў, адносінаў і ацэнак.
3. Выхаванне здольнасці развіваць і прадумываць альтэрнатыўныя шляхі дзеянняў.
4. Развіццё здольнасці да спачування.

**Методыка правядзення:**
1. Першапачатковыя заняткі павінны быць простымі і паступова ўскладняцца, калі мы жадаем, каб разыгрыванне роляў стала не проста практыкаваннем у драматычным мастацтве, а садзейнічала дасягненню мэтаў занятка.
2. Спачатку не чакайце бездакорнага выканання. Прапануйце навучэнцам некалькі магчымасцей папрактыкавацца ў разыгрыванні роляў і мадэляванні гістарычных і сучасных сітуацый. Спрабуйце увесь час змяняць віды заняткаў.
3. У гэтых двух метадах ёсць чатыры кампаненты:

**а.** Папярэдняе планаванне і падрыхтоўка да занятку настаўніка. Вы павінны прадумаць сітуацыю, якая павінна будзе разыгрывацца на занятку. Лепш, калі ролі кожнага з удзельнікаў будуць прапісаныя асобна. Як варыянт, можна не даваць распісанай па ролях сітуацыі, а даць вучням магчымасць імправізацыі і пасля абмеркаваць, чаму быў выбраны менавіта такі варыянт паводзінаў.

**б.** Падрыхтоўка і навучанне вучняў. Перад правядзеннем практыкавання вучням трэба растлумачыць правілы і даць час на падрыхтоўку і, магчыма, рэпетыцыю, прапанаванай сітуацыі.

**в.** Актыўны ўдзел класа ў занятку. Заахвоцце клас да ўважлівага стаўлення да дэманструемай сцэнкі ці выканання роляў. Гэта можна


©Грамадскае аб'яднанне «ВІТ»

зрабіць з дапамогай пастаноўкі дадатковых заданняў для класа: знайсці памылкі ў тым, якім чынам дзейнічаюць «акторы»; здагадацца, аб чым хочуць распавесці сваім прадстаўленнем выступаючыя вучні і г.д.

**г.** Падрабязнае абмеркаванне і прадумванне занятка. Трэба памятаць аб тым, што на занятку вучні выступаюць у пэўных ролях не для таго, каб пазабавіцца самім, пазабавіць клас і настаўніка. Разыгранне роляў і мадэляванне сітуацыяў – досыць моцная методыка, якая дапамагае на практыца паглядзець, чаму навучыліся вучні, ці атратрымаць эмацыйную падставу для правядзення абмеркавання сур'ёзных прававых і грамадскіх пытанняў. Таксама яна дае магчымасць вучням патрэніравацца ва ўжыванні на практыцы атрыманых ведаў.

4. Паколькі вучні час ад часу адчуваюць сябе нязручна ці саромеюцца, заняткі такога кшалту павінны праводзіцца ў адвольнай, спакойнай абстаноўцы; навучэнцы павінны зразумець, што яны маюць магчымасць па-рознаму рэагаваць. Практыка дапаможа ім адчуваць сябе ўпэўнена. Заняткі з выкарыстаннем гэтых метадаў варта пачынаць праводзіць прыблізна з сярэдзіны курса, калі вучні прызвычаяцца да актыўных метадаў і будуць адчуваць сябе больш упэўнена і свабодна.


*©Грамадскае аб'яднанне «ВІТ»*

## Спрошчанае Судовае разбіральніцтва (Суд pro se)

**Мэта:**

Пад час правядзення такога практыкавання вучні атрымаюць спрошчанае ўяўленне пра тое, як прымаюцца судовыя рашэнні. Пры гэтым увесь клас мае магчымасць актыўна паўдзельнічаць у дзеяннях суда. Да таго ж практыкаванне дазваляе правесці судовае разбіральніцтва нават, калі ў наяўнасці невялікая колькасць вучняў.

**Методыка правядзення:**

1. Падрыхтуйце судовы выпадак, па якому будзе праводзіцца абмеркаванне ў форме судовага разбіральніцтва. Падрыхтуйце вытрымкі з заканадаўства, на падставе якіх вучні змогуць прымаць свае рашэнні. Вы можаце запрасіць на занятак пракурора, адваката ці суддзю для таго, каб яны пракаментавалі, тое, што будзе адбывацца на занятку.
2. Раздайце вучням выпадак для азнаямлення з фактамі. Дайце ім час на чытанне і разуменне сэнсу справы.
3. Падзяліце вучняў на тры прыблізна роўныя групы: судзі, прадстаўнікі пакрыўджанага боку (ісцы) і прадстаўнікоў вінаватага боку (адказчыкі). *Як варыянт падзелу: суддзі, адвакаты, пракуроры. Калі ў занятку ўдзельнічае запрошаны спецыяліст, таксама размяркуйце яго ў адну з групаў згодна з яго спецыялізацыяй.*
4. Дайце заданне для працы ў групах: а) суддзі павінны за адведзены час вывучыць абставіны справы і падрыхтаваць пытанні, якія яны б хацелі задаць "ісцам" і "адказчыкам" для больш дакладнага высвятлення абставінаў справы і вынясення рашэння.

   б) ісцы (пракуроры) павінны, прааналізаваўшы прапанаваную сітуацыю і заканадаўства, знайсці палажэнні, якія б падтрымлівалі іх судовую пазіцыю і патрабаванні.

   в) адказчыкі (адвакаты) на падстве фактаў, выкладзеных і выпадку і заканадаўстве, павінны выпрацаваць аргументы, якія б сведчылі на карысць іх пазіцыі і даказвалі невінаватасць.

   Пастарайцеся так арганізаваць прастору, на якой будуць працаваць вучні так, каб групы не перашкаджалі адна адной пад час групавой працы.
5. Судовае разбіральніцтва па гэтай методыцы праводзіцца наступным чынам:


©Грамадскае аб'яднанне «ВІТ»

- Пасля сканчэння часу на групавую працу, падзяліце вучняў на маленькія групкі каб, у кожную з якіх уваходзілі б адзін суддзя, адзін ісцец (пракурор) і адзін адказчык (адвакат). Аб'яднаць вучняў у групы будзе лягчэй, калі вы выдадзіце ім значкі, па якіх можна вызначыць хто суддзя, хто адказчык, хто ісцец.
- Патлумачце суддзям, што яны могуць адчыняць "паседжанне суда", як толькі з'явяцца ісцец і адказчык.
- Патлумачце правілы правядзення судовых слуханняў: а) паважліва ставіцца да суддзі, б) спачатку выступае ісцец (ці пракурор) і адказвае на пытанні суддзі, потым адказчык (ці адвакат) і таксама адказвае на пытанні суддзі, в) удзельнікі не павінны перабіваць адзін аднаго, г) суддзя можа дазволіць кароткі абмен думкамі паміж бакамі.
- Суддзя на падставе прыведзеных бакамі аргументаў і заканадаўства выносіць і агалошвае рашэнне, аргументуючы яго. Можна папрасіць суддзяў не агалошваць рашэнне ў сваёй групе, а прапанаваць суддзям усіх груп, якія самастойна працавалі на занятку, агалосіць свае рашэнні ў агульнай групе.

6. Падвядзіце вынікі практыкавання. Пачніце з таго, што папрасіце суддзяў расказаць пра прынятыя рашэнні і іх абгрунтаванне. Абмяркуйце з вучнямі факты і аргументы, якія былі прадстаўленыя на судовых разбіральніцтвах. Ацаніце разам з вучнямі моцныя і слабыя бакі ў пазіцыях бакоў. Папрасіце вучняў ацаніць ход разбіральніцтваў з пазіцыі ўдзельнікаў. Спытайце вучняў пра эфектыўнасць іх працы і тое новае, што яны даведаліся. Калі ў занятку браў удзел спецыяліст (суддзя, пракурор, адвакат) папрасіце іх пракаментаваць тое, што адбывалася на занятку.


©Грамадскае аб'яднанне «ВІТ»

## ЗАЎВАГІ

Шаноўныя чытачы! Калектыў аўтараў будзе вельмі Вам удзячны за заўвагі і прапановы па ўдасканаленню гэтага падручніка. Калі ласка, пакіньце свае водгукі па кожнай главе.

**Уводны занятак**

**Правілы**


©Грамадскае аб'яднанне «ВІТ»

**Сацыяльныя нормы**

**Прававыя і неправавыя законы**


©Грамадскае аб'яднанне «ВІТ»

**Як ствараюцца законы**

**Як выконваюцца законы. Абскарджанне незаконных дзеянняў чыноўнікаў**

**Як можна паўплываць на змену закона**


*©Грамадскае аб'яднанне «ВІТ»*

## Зварот да юрыста

## Судовая абарона

## Вырашэнне канфліктаў


©Грамадскае аб'яднанне «ВІТ»

Навучальнае выданне

# ПРАВА НА КОЖНЫ ДЗЕНЬ

МЕТАДЫЧНЫ ДАПАМОЖНІК

**Клімчук Наталля Аляксандраўна, Кузьмініч Ігар Расціслававіч, Пісаркова Юліана Ўладзіміраўна, Салей Сяргей Міхайлавіч, Хацук Павел Аляксандравіч**

Мастацкае аздабленне: **А. Гайса, Н. Клімчук**

Здадзена ў набор Падпісана да друку
Фармат 60x84/8. Папера Xerox.
Афсетны друк. Гарнітура School Book.
Ум. Друк. Арк. 4,8. Ул - выд. Арк. 4,0.
Наклад ас.

Распаўсюджваецца бясплатна


*©Грамадскае аб'яднанне «ВІТ»*